WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

3 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
СУБОТА
№ 187
(26545)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

МАГЧЫМЫ МОКРЫ СНЕГ

Сярэдняя тэмпература паветра ў верасні склала плюс 13—15 градусаў, што на 1—3 градусы вышэй за кліматычную норму. Такі цёплы верасень у Беларусі бывае толькі раз у 10 гадоў, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

Ападкі ў Беларусі ў верасні мелі кароткачасовы характар і размяркоўваліся па тэрыторыі рэспублікі нераўнамерна. У паўночна-заходняй палове Беларусі колькасць ападкаў адпавядала 1—1,5-месячнай норме. У той жа час у паўднёва-ўсходняй палове рэспублікі і на захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей ападкі не перасягнулі 14—39 мм, што адпавядае 25—75 працэнтам месячнай нормы. Вераснёўскі рэкорд належыць Верхнядзвінску, дзе за месяц выпала 156 мм.

Кастрычнік уступіў у свае правы халодным і ветраным надвор'ем, якое захаваецца і ў найбліжэйшыя дні. Першая дэкада будзе характарызавацца няўстойлівым надвор'ем: пройдуць дажджы, у паўночных раёнах рэспублікі ў начны і ранішні час не выключаны мокры снег. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад нуля да плюс 5 градусаў, у многіх раёнах чакаюцца замаразкі да мінус 1—3 градусаў. Пераважная дзённая тэмпература складзе 5—13 градусаў цяпла. Зрэдку ў асноўным па поўдні рэспублікі паветра будзе прагравацца да 14—17 градусаў.

БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «У БЕЛАРУСАЎ У СВЕЦЕ СКЛАЛАСЯ РЭПУТАЦЫЯ НАДЗЕЙНЫХ І АДКАЗНЫХ ПАРТНЁРАЎ»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 2 кастрычніка даў прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў расійскіх рэгіянальных СМІ, якая працягвалася больш за тры з паловай гадзіны.

Расіян цікавіў досвед Беларусі ў сацыяльнай, культурнай, адукацыйнай сферах. Прэс-канферэнцыя стала заключным мерапрыемствам штогадовага прэс-тура вялікіх груп журналістаў СМІ рэгіёнаў Расіі, які стаў ужо традыцыйным. Цяперашні, сёмы, прэс-тур праходзіў з 29 верасня па 2 кастрычніка. У ім узялі ўдзел 76 прадстаўнікоў з 46 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Былі прадстаўлены 70 СМІ, з якіх 17 — федэральныя, 53 — рэгіянальныя. Агульны тыраж друкаваных выданняў складае каля 2,5 млн экзэмпляраў.

Многія з удзельнікаў сёмага прэс-тура ўжо наведвалі Беларусь і бралі ўдзел у прэс-канферэнцыях Кіраўніка беларускай дзяржавы ў мінулыя гады.

Падчас сёлетняй паездкі расійскія журналісты назіралі за актыўнай фазай аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009» у Лідскім раёне, а таксама азнаёміліся з аб'ектамі сацыяльна-культурнай і вытворчай сферы Віцебскай вобласці. У прыватнасці, пабывалі ў аграгарадку Ноўка Віцебскага раёна, наведалі музей-сядзібу Ілы Рэпіна «Здраўнева», Лужаснянскую школу-інтэрнат для адораных дзяцей у Віцебскім раёне, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік (краязнаўчы музей, музей беларускага кнігадрукавання, Сафійскі сабор), Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр, ААТ «Нафтан», зрабілі аглядныя экскурсіі па Віцебску і Мінску.

Фота БЕЛТА.

У беларусаў у свеце склалася рэпутацыя надзейных і адказных партнёраў. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на прэс-канферэнцыі, менавіта таму да нас у апошнія гады сталі праяўляць цікавасць інвестары, у тым ліку і заходнія, не кажучы пра расійскіх. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, маючы адкрытую эканоміку, Беларусь значна залежыць ад сусветных таварных рынкаў. Краіна аб'ектыўна не паспела накапіць вельмі вялікіх золатавалютных рэзерваў: машынабудаванне або сельская гаспадарка, вядома ж, менш прыбытковыя, чым гандаль вуглевадародамі. «Таму нам сёння нялёгка, але мы трымаем удар», — сказаў Прэзідэнт.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, «беларусам і расіянам лягчэй было б выжываць у сённяшніх няпростых умовах, калі б мы дзейнічалі больш зладжана і скаардынавана ў эканоміцы і палітыцы». Беларусь да гэтага гатова не на словах, а на справе. Беларускі лідар выказаў перакананасць, што вынікі яго сустрэч з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым «у жніўні ў Расіі і ў верасні ў Беларусі будуць садзейнічаць сумеснаму пераадоленню крызісных з'яў з большай эфектыўнасцю». Беларусам і расіянам суджана Богам і гісторыяй жыць разам у міры і згодзе, як і належыць брацкім народам, сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У Беларусі паняцці сацыяльнай справядлівасці і адказнасці — краевугольны камень унутранай палітыкі. «Мы ўсё ствараем сваёй працай, сваім розумам і рукамі, — падкрэсліў беларускі лідар. — У нас няма сыравінных скарбніц, спрыяльнага клімату. Наш галоўны рэсурс — людзі. Беларуская эканоміка мае сацыяльна арыентаваны характар. Нават у нялёгкія часы сусветнага крызісу няма большага клопату для беларускай дзяржавы, як клопат аб іх. Мы не выкідваем тысячы людзей на вуліцы, пакідаючы іх без крыніц існавання. Узровень беспрацоўя не перавышае 1 працэнт».

«Мне часта даводзіцца сустракацца з прэсай нашай брацкай Расіі. Але менавіта такія сустрэчы, як гэта, я лічу асабліва значнымі і карыснымі для беларуска-расійскіх адносінаў. Ваша аўдыторыя — мільёны чытачоў, гледачоў, слухачоў ад Балтыкі да Далёкага Усходу, і вельмі важна данесці да іх аб'ектыўную і максімальна поўную інфармацыю аб тым, як жыве беларускі народ, да чаго імкнецца, якім бачыць сваё будучае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы закрануў гэту тэму таму, што вельмі шмат розных домыслаў і адкрытай хлусні аб сітуацыі ў Беларусі выдаецца праз сродкі масавай інфармацыі як на Захадзе, так і ў Расіі. На думку Прэзідэнта, адбываецца гэта па розных прычынах: і па элементарнай неабдуманасці, і па палітычным заказе. «Не падабаюцца многім самастойныя і непрадажныя беларусы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён папрасіў журналістаў расказаць аб той Беларусі, якая ёсць на самай справе: аб поспехах і дасягненнях, аб праблемах і клопатах, — крытыкаваць, але аргументавана.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў Беларусі не будуюць пацёмкінскіх вёсак для прыезджых журналістаў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «як любы добры гаспадар, мы імкнёмся паказаць лепшае, што ў нас ёсць». Ён адзначыў, што за гэтыя гады расійскія журналісты праехалі тысячы кіламетраў беларускіх дарог, пабывалі ва ўсіх кутках краіны, пазнаёміліся з сотнямі населеных пунктаў і прадпрыемстваў, пагаварылі з тысячамі людзей, і фактычна на вачах расійскіх журналістаў мянялася Беларусь. Галоўнае, што ў час сваіх прэс-тураў расійскія журналісты знаходзяць адказ на пытанне: куды і ў якім напрамку рухаецца Беларусь, бачаць рэальную сітуацыю ў краіне — і недахопы, і дасягненні.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што беларускаму кіраўніцтву не трэба даваць справаздачу перад Крамлём, як гэта было ў савецкі час, і журналістам сапраўды паказваюць рэальную сітуацыю, рэальнае жыццё рэгіёнаў.

Правядзенне сумеснага вучэння «Захад-2009» сведчыць аб адзінстве Беларусі і Расіі.

«Хачу на прыкладзе вучэння адказаць на пытанне, што ў галаве кожнага журналіста, нават які вельмі любіць Беларусь: дык з кім жа Беларусь, яны што, сапраўды павярнулі ад Расіі на Захад? Калі мы павярнулі б ад Расіі на Захад, то такія вучэнні з чужымі людзьмі не праводзяцца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта было маштабнае вучэнне, калі Беларусь і Расія разышліся б у гэтай самай адчувальнай сферы, то і не праводзілі б яго. «Значыць, мы не разышліся ў ваенным і ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве і нашы ўзброеныя сілы падобныя, як дзве кроплі вады. Думаеце, гэта так проста на адным полі сабрать розныя арміі і на працягу тыдня пасля перакідкі расійскіх войскаў на незнаёмы ім палігон правесці стрэльбы? Ды перастралялі б адзін аднаго! Гэта і каардынацыя войскаў, адзінае камандаванне і іншае — усё гэта мы з расіянамі захавалі і нават прымножылі, выйшаўшы на больш высокі ўзровень. І вучэнні мы правялі не з амерыканцамі і не блокам НАТА, куды мы, у двухкоссі, так разагналіся апошнім часам, а з нашымі расіянамі», — адзначыў беларускі лідар.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ШКОЛЬНАЯ МАМА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Я імкнуся не толькі даваць веды, але і навучыць дзяцей жыццю, каб маглі самастойна адаптавацца і ў маленькім калектыве, і ў вялікім грамадстве, — падкрэслівае педагог з 27-гадовым стажам, настаўнік першай катэгорыі Вера ДЛЮГАВА (на фота). Яна працуе ў Мсціслаўскай школе № 2, дзе вялікі педагагічны калектыў і больш за 20 настаўнікаў пачатковых класаў. Веры Віктараўне давялося працаваць і ў дзіцячым сацыяльным прытулку, і выхавальніцай груп падоўжанага дня. Цяпер у яе 17 вучняў-трэцякласнікаў самай новай і сучаснай у гэтым горадзе навучальнай установы.

— Працаваць з маленькімі дзецьмі — гэта прызванне Веры Длюгавай, — кажуць пра яе школьныя калегі. А вучні дораць ёй добрыя веды і шчаслівыя ўсмешкі.

З 3 кастрычніка павышаюцца цэны на цукар

Рознічныя цэны на цукар-пясок у Беларусі з 3 кастрычніка павышаюцца на 2,5 працэнта, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства эканомікі. Згодна з пастановай Мінэканомікі № 157 ад 30 верасня гэтага года будуць павышаны фіксаваныя рознічныя цэны на цукар-пясок для рэалізацыі насельніцтву, а таксама мінімальныя адпускныя цэны для продажу на прамысловую перапрацоўку, паведамляе БЕЛТА.

Новыя рознічныя цэны на вагавы цукар-пясок складуць Br2130 за кілаграм, на расфасаваны ў поліэтыленавыя або папяровыя пакеты па 1 кг — Br2330. Рашэнне аб павышэнні цэнаў на цукар прынята па прапанове канцэрна «Белдзяржхарчпрам» для паляпшэння фінансавага стану цукраперапрацоўчых арганізацый з улікам кан'юнктуры рынку.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЯЎ

АХВЯРАЎ ЗЕМЛЯТРУСУ БОЛЬШ ЗА ТЫСЯЧУ

Колькасць ахвяраў серыі разбуральных землятрусаў на востраве Суматра ўзрасла да 1100 чалавек. Пад завалами будынкаў знаходзяцца тысячы мясцовых жыхароў.

Фота Сіньхуа-БЕЛТА.

Шанцаў знайсці жывых з кожнай гадзінай усё менш. У мільённым Падангу ўцалела толькі чвэрць будынкаў. У горадзе пануе хаос — ён цалкам абясточаны, разбураныя дарогі, вада з надтрэснутых трубаў затапіла вуліцы. Да таго ж падземныя штуршкі выклікалі шматлікія пажары. Галоўная бальніца, якая сама часткова пашкоджаная, не спраўляецца з параненымі, якія ўсё прыбываюць. Дзясяткі пацярпелых вымушаныя размяшчаць побач са шпіталем у намётах. Па папярэдніх падліках, бяздомнымі сталі дзясяткі тысяч людзей. Трэць з іх — дзеці.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЕС НАБІРАЕ АБАРОТЫ

У краінах Еўрасаюза працягваецца рост беспрацоўя, а таксама адчуваюцца іншыя наступствы глабальнага фінансавага крызісу. Пры гэтым эканамісты прадракаюць наступнае павелічэнне колькасці беспрацоўных.

У жніўні рост беспрацоўя склаў 9,6 %. А агульная колькасць беспрацоўных грамадзян у краінах еўразоны перавысіла 15,2 мільёна чалавек. Акрамя таго, нягледзячы на адзначаны рост эканомік большасці краін аб'яднання, эканамісты прагназуюць працяг росту беспрацоўя ў хуткім часе. Найбольшая колькасць беспрацоўных адзначана ў Іспаніі, дзе яно дасягнула 18,9 % насельніцтва краіны, і ў Латвіі, дзе колькасць людзей, якія страцілі працу, склала 18,3 %.

УРУЧАНЫЯ АНТЫНОБЕЛЕЎСКІЯ ПРЭМІІ

У Гарвардскім універсітэце ў чацвер, 1 кастрычніка, адбылася 19-я цырымонія ўручэння Антынобелеўскіх прэмій (The Ig Nobel Prize) за вынаходкі, якія «спачатку выклікаюць смех, а потым прымушаюць задумацца».

Прэміі ў галіне аховы здароўя атрымала група навукоўцаў з Ілінойса пад кіраўніцтвам Элены Боднар, якая распрацавала жаночы бюстгальтар, які трансфармуецца пры неабходнасці ў процівагаз. Ірландскія паліцэйскія былі адзначаныя прэміяй у галіне літаратуры за тое, што выпісалі 50 штрафаў парушальніку правіл дарожнага руху з Польшчы. Паталагаанатам Стэфан Балігер з Універсітэта Берна ў Швейцарыі ўзнагароджаны прэміяй за даследаванне, якое выявіла, што пустая піўная бутэлька эфектыўнейшая за поўную пры бойцы ў бары. За значныя дасягненні ў галіне матэматыкі прэмію атрымаў старшыня Цэнтральнага банка Зімбабвэ Гідэон Гона за ўвядзенне ў абарот банкнот вартасцю ад 1 цэнта да 100 трыльёнаў мясцовых долараў, чым даў зімбабвійцам магчымасць рэгулярна практыкавацца ў матэматыцы. Акрамя гэтага, прызы ў адпаведных намінацыях атрымалі фермеры, якія высветлілі, што карова дае больш малака, калі ў яе ёсць уласнае імя, мексіканскія навукоўцы, якія навучыліся здабываць дыяменты з тэкілы і вучоныя, якія патлумачылі, чаму цяжарныя жанчыны не перакульваюцца.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КОПЫЛЬСКИЙ МАСЛОСЫРЗАВОД» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод», расположенного по адресу: г. Столбцы, ул. Свердлова, 3, в составе зданий:

производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, 201,7 кв.м, здание прачечной, об. пл. 109,6 кв.м, автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл. 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, *сооружений:* башня водонапорная, ограждение вокруг завода, *передаточных механизмов:* кабельные сети к силовому оборудованию, трасса газовая производственная 500 АЧ, сети связи воздушные, сети электроосвещения, сети канализационные, сети паропроводные, сети канализационные чугунные, а также *оборудования* и иного имущества согласно списку. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 700 119 485 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **03.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ОРГПИЩЕПРОМ» (ПРОДАВЕЦ) КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже изолированного производственного помещения, об. пл. 1410 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 44, пом. 7.

Начальная цена с НДС – 1 547 839 040 бел. руб. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **03.11.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.11.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

МЫ ПАВІННЫ АПРАЎДАЦЬ ДАВЕР НАРОДА І КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Б.В. БАТУРЫ на адкрыцці трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання (2 кастрычніка 2009 г.)

Фота БЕЛТА.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі! Паважаныя запрошаныя, журналісты!

Сёння пачынаецца асенняя сесія Савета Рэспублікі Беларусь. На яе пасяджэннях нам трэба будзе вырашыць шэраг важных пытанняў. Але перш за ўсё дазвольце сцісла спыніцца на выніках міжсесійнай работы.

У сваім Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Унікальнасць ролі Савета Рэспублікі ў тым, што ён стаіць на вяршыні піраміды органаў прадстаўнічай улады». Цалкам заканамерна, што ў міжсесійны перыяд мы ўдзялілі асаблівую ўвагу рабоце па развіцці інстытута мясцовага самакіравання, якая сапраўды стала «візітнай карткай» нашай палаты.

У справаздачны перыяд адбылося чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Яго ўдзельнікі азнаёміліся з ходам рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва» ў Васілішкаўскім сельскім Савеце дэпутатаў Гродзенскай вобласці.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЗАБЯСПЕЧВАЮЧЫ СТАБІЛЬНАСЦЬ І ЭФЕКТЫЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на адкрыцці трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

Фота БЕЛТА.

Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя члены Урада, запрошаныя і журналісты!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння пачынае работу трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

У міжсесійны перыяд па ўсіх напрамках парламенцкай дзейнасці праводзілася мэтанакіраваная работа, вырашаліся задачы, пастаўленыя Кіраўніком дзяржавы ў Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Яе вынікам у заканадаўчай сферы стаў прапанаваны вам для зацвярджэння праект парадку дня сесіі.

Традыцыйна для асенняй сесіі самым значным з'яўляецца разгляд і прыняцце законапраекта аб рэспубліканскім бюджэце. Плануецца, што праект бюджэту на 2010 год захавае сацыяльную накіраванасць. У цэлым на сацыяльную сферу плануецца выдзеліць да 60 працэнтаў яго расходнай часткі. Будзе забяспечаны рост расходаў на ахову здароўя, адукацыю, культуру, спорт і сацыяльную палітыку. Адначасова праект бюджэту прызначаны вырашыць шэраг іншых важных задач.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.10.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 770,00
▼ 1 еўра	4 023,15
1 латвійскі лат	5 690,81
1 літоўскі літ	1 166,07
1 чэшская крона	158,24
1 польскі злоты	940,99
▲ 1 расійскі рубель	91,95
1 украінская грыўня	327,83

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,1240
UAH	36,0335
1000 BYR	10,8987
EUR	43,8154

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Белавежскай пушчы — 600 гадоў

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

«У БЕЛАРУСАЎ У СВЕЦЕ СКЛАЛАСЯ РЭПУТАЦЫЯ НАДЗЕЙНЫХ І АДКАЗНЫХ ПАРТНЁРАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«І толькі ідыёт пасля гэтага можа сказаць, што Лукашэнка павярнуў на Захад і кінуў Расію. Правядзенне сумеснага вучэння сведчыць аб тым, што мы сапраўды адзіная дзяржава, калі мы ў гэтым пытанні дзейнічаем як адна дзяржава», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь і Расія ўжо каля 5 разоў падыходзілі да правядзення вучэння, падобнага да «Захаду-2009». «Але прэзідэнты Расіі неяк з хваляваннем успрымалі гэтыя пытанні і прапановы. Апошні раз мы дамаўляліся аб правядзенні такога вучэння з Уладзімірам Пуціным, калі ён быў Прэзідэнтам, і запрасілі нашых сяброў з АДКБ. Гэтыя вучэнні ўжо былі падрыхтаваны, і расійскія часці перакінуты на палігоны Беларусі. Але ў апошні момант Прэзідэнт Расіі на гэтыя вучэнні не прыехаў, і мне давялося аднаму праводзіць іх. Дзякуй Богу, што хоць расіяне засталіся і войскі былі задзейнічаны. Але новы Прэзідэнт Расіі сваё слова стрымаў», — расказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«На стварэнне Саюза славянскіх дзяржаў неабходна перш за ўсё воля кіраўнікоў дзяржаў. Будзе такая воля, значыць, такі саюз будзе стварыць нескладана. Я адказна аб гэтым гавару», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Ну хіба была б праблема ў хуткім стварэнні Саюзнай дзяржавы, калі б была на тое воля Пуціна і Лукашэнкі ў свой час? Не было такой волі. Гэты працэс у многім прытармазіўся. Не Лукашэнкі ў гэтым віна», — канстатаваў ён. Таму, на думку Прэзідэнта, трэба пачынаць з рашэння кіраўнікоў дзяржаў. «Што, народы Беларусі, Украіны і Расіі не падтрымаюць? Падтрымаюць. Мы (Прэзідэнты. — *Заўвага БЕЛТА*) разабрацца не можам», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Расіі не трэба чакаць з боку Беларусі ні гандлёвых войнаў, ні ваенных авантур.

«З боку Беларусі не чакайце ніякіх войнаў — ні гандлёвых, ні ваенных авантур. Вы глядзіце на Захад абсалютна спакойна. Не чакайце ад нас ніякіх падвохаў. Ведайце, што тут жывуць вашы людзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Як павядуць сябе ў Расіі, вам, напэўна, там лепш відаць. Але, зыходзячы з тых адносінаў, якія склаліся ў нас з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі, я спадзяюся, што ў нас светлае будучае», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Прэзідэнт канстатаваў адсутнасць праблем ва ўзаемаадносінах з усімі расійскімі рэгіёнамі, адзначыўшы пры гэтым нядаўнія абмежавальныя меры з боку Расіі адносна беларускіх тавараў. «У нас наогул у эканоміцы не было б ніякіх праблем, калі б вы (Расія. — *Заўвага БЕЛТА*) цяпер не забаранялі езуіцкімі метадамі працаваць нам на расійскім рынку. Дапусцім, нехта ў Кастраме хоча купіць трактар МТЗ. Цяпер пад беларускі трактар крэдыт не дадуць. Не толькі пад трактар, пад усю прадукцыю. Ну каму гэта трэба?» — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь завяршыла ўсе працэдуры па падпісанні пагаднення па стварэнні Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання (КСАР) Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Беларусь гатова старшынстваваць у АДКБ і будучы год. «Беларускі бок спаўна кампенсуе сваю запазычанасць перад гэтай арганізацыяй».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь не адмаўляецца ад супрацоўніцтва ў рамках АДКБ. «Мы заўсёды былі за аб'яднальныя працэсы, за інтэграцыю, а АДКБ — гэта цесная інтэграцыя ў ваенная сферы, ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Нам гэта выгадна, мы ў гэтым вельмі зацікаўлены».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што не трэба ўвязваць пытанні супрацоўніцтва ў рамках АДКБ з «малочнымі войнамі». На яго думку, гэта эканамічная праблема была «выключна суб'ектыўнай». «Толькі з суб'ектыўных меркаванняў, каб нас схіліць або правучыць, на граніцы без усялякіх папярэджанняў па надуманых падставах былі спынены паўтары сотні рэфрыжэратараў са скарапсавальнай прадукцыяй, якія ішлі ў Расійскую Федэрацыю. Тысячы назваў малочнай прадукцыі», — нагадаў Прэзідэнт.

«Гэта быў выпад супраць нашай дзяржавы. Што мне заставалася рабіць? У мяне ж няма такіх рычагоў націску, як у Расіі на Беларусь. Таму я вымушаны быў дэманстратыўна адмовіцца ад паездкі ў Маскву. Але да АДКБ гэта не мае ніякіх адносінаў», — падкрэсліў беларускі лідар. «Гэта потым ужо ўвязалі, маўляў, вось, Лукашэнка пайшоў на Захад, таму ён і АДКБ разбурае», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Транзіт энергарэсурсаў праз тэрыторыю Беларусі выгадны для Расіі. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што расійскі бок дарэмна не выкарыстоўвае магчымасці для будаўніцтва другой ніткі газапровада «Ямал — Еўропа» праз Беларусь.

«Сёння трэба толькі класці трубу (другую нітку «Ямал — Еўропа». — *Заўвага БЕЛТА*), усё ёсць. Не, расіянам трэба па Балтыцы. Ну добра, кладзіце па Балтыцы», — сказаў Прэзідэнт. «Сёння яшчэ прыдумалі ў абход Беларусі: з поўдня на поўнач, у Санкт-Пецярбург пагналі трубу. Пралічылі — на кожнай тоне нафты страты $24. Каму гэта патрэбна?» — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы прапанаваў Расіі выкарыстоўваць тыя магчымасці транзіту, якія ёсць у Беларусі. Тарыфы на транзіт газу праз тэрыторыю рэспублікі складаюць $1,59 за тыс. куб.м на 100 км (у Польшчы цана транзіту 2 еўра, у Аўстрыі — 2,5 еўра), на транзіт нафты — $0,81 за тону на 100 км (у Еўропе ў сярэднім — $1,3).

Сёння Беларусь вядзе здабычу нафты ў Венесуэле і ўжо атрымала першыя $100 млн прыбытку, пачынае здабываць нафту ў Іране. У будучым плануе распрацоўваць новыя радовішчы і ў Афрыцы. «На жаль, у нашай роднай Расіі нам не далі ніводнага радовішча. Чаму?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў свой час прапаноўваў Уладзіміру Пуціну ў абмен на радовішча аддаць прадпрыемства «Белтрансгаз», якое знаходзіцца ў выдатным стане, у мадэрнізацыю і падтрыманне якога на добрым узроўні дзяржава ўкладае грошы: «Я гаварыў Пуціну: вы нам даяце радовішча на 10 млрд кубоў, а мы вам аддаём пэўную колькасць «Белтрансгаза». Дабаўляеце яшчэ — мы вам аддаём гэту трубу. Забірайце, і не трэба нічога плаціць». Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, Уладзімір Пуцін палічыў гэту прапанову добрай, аднак да гэтага часу не прынята якое-небудзь рашэнне.

«Усе едуць — амерыканцы, немцы, распрацоўваюць, а беларусам — не. Можа, гэта своеасаблівая спроба трымаць на кароткім павадку дзяржаву? Але гэта няправільна», — лічыць Прэзідэнт Беларусі. «Маглі б вы, вядома, і нам, як амерыканцам і немцам, на агульных умовах ужо, не як брацкаму народу, дазволіць здабываць нафту і газ», — сказаў ён.

Беларусь прадоўжыць рабіць стаўку на мадэрнізацыю ўзбраення і ваеннай тэхнікі. «Перад КДБ была пастаўлена задача, каб ён пераключыўся на адсочванне сітуацыі вакол вучэння «Захад-2009». Мне хацелася ведаць, як расіяне рэагуюць, як яны бачаць нашу краіну, ацэньваюць армію, нашу зброю. Як на Захадзе рэагуюць на вучэнні. І расійскія афіцэры гаварылі: «Малайцы беларусы, у іх, можа, няма суперсучаснага ўзбраення, але яны па-гаспадарску выкарыстоўваюць савецкую зброю: яны яе мадэрнізавалі, давялі да добрага ўзроўню», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, цяпер нават буйныя і багатыя краіны не могуць дазволіць сабе поўнасцю закупляць новую тэхніку. Беларусь ужо даўно займаецца мадэрнізацыяй броне- і авіятэхнікі. Так, напрыклад, мадэрнізацыя дае магчымасць намнога палепшыць характарыстыкі танкаў Т-72. «Мы навучылі танк метка страляць, паставілі самыя сучасныя прыцэлы, засцераглі браню актыўнай аховай», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Беларусь паспяхова асвоіла мадэрнізацыю авіяцыйнай тэхнікі. Напрыклад, знішчальнік Су-27 не мог весці агонь па наземных цэлях, але пасля мадэрнізацыі ў Беларусі гэта стала магчыма. Беларусь і далей гатова займацца мадэрнізацыяй самалётаў. Рэнтабельнасць гэтых работ дасягае 70 працэнтаў.

Фота БЕЛТА.

Каля Br160 млрд накіравана на развіццё раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у выніку ўпарадкавання льготных выплат. «Зняўшы неабгрунтаваныя льготы, сабраўшы грошы «ў кулак», мы рабілі галоўнае для людзей у чарнобыльскіх рэгіёнах». Прэзідэнт падкрэсліў, што з'яўляецца «заўзятым праціўнікам ільгот». «Мы перасталі распыляць сродкі, пакінуўшы выплаты толькі для сапраўды пацярпелых. У выніку атрымалі вялікую эканомію», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, гэтыя сродкі былі накіраваны на развіццё чарнобыльскіх раёнаў: на стварэнне РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека ў Гомелі, на будаўніцтва дарог і газіфікацыю. Больш за тое, амаль Br700 млрд паступілі ў рэгіёны, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, з рэспубліканскага бюджэту. Беларускі лідар дадаў, што ніхто з сапраўды маючых патрэбу ў дапамозе не быў пазбаўлены льгот. У прыватнасці, дзяржава па-ранейшаму аказвае ўсямерную падтрымку ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, чарнобыльцам і ўсім, каму на самай справе патрэбна падтрымка.

Беларусь даўно павінна была прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію. «У нас вельмі добрыя з імі (Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй. — *Заўвага БЕЛТА*) адносіны, асабліва з Абхазіяй. Я шмат разоў ужо аб гэтым гаварыў. З Паўднёвай Асеціяй кантактаў было мала, але калі гэта няшчасце здарылася, то я паслаў туды групу людзей з гуманітарнай дапамогай, туды ездзілі беларускія дэпутаты. Калі паўстала пытанне аб прызнанні, я хацеў вывучыць, якая там сітуацыя, што ж там адбылося. Беларусь адназначна заняла пазіцыю Расіі, падтрымаўшы на ўсіх узроўнях. Але прызнанне ж сур'ёзны акт. Усе рэспублікі СНД катэгарычна адмовіліся прызнаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі з Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй адносіны «складаюцца фактычна як у дзяржавы з дзяржавай». «Падчас візіту ў Літву я сказаў, што, па вялікім рахунку, мы даўно павінны былі прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асецію, падтрымаўшы тым самым нашага саюзніка. Але, на жаль, сам саюзнік вінаваты ў тым, што мы да гэтага часу не вырашылі гэта пытанне», — падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў Беларусі быў пэўны механізм таго, як краіна будзе ісці да прызнання гэтых рэспублік. «Але некаму ў Расіі вельмі хацелася або нас схіліць хутчэй, або, можа, наогул не хацелася, каб мы прызналі гэтыя рэспублікі. Помніце, нас цэнтральныя CMI (расійскія. — *Заўвага БЕЛТА*), відавочна падкантрольныя дзяржаўным чыноўнікам, пачалі проста цкаваць. Не прызнае, таму што $500 млн не далі. Нібыта Беларусь за грошы павінна прызнаць гэтыя рэспублікі! І пайшла хваля ў той момант, калі мы павінны былі іх прызнаць, і пра гэта ведалі расійскія кіраўнікі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. «Гэта вельмі балючая тэма, але як чалавек я шчыра сказаў, што даўно пара было гэта зрабіць, але не мы ў гэтым вінаватыя. Лічу, разбяромся».

Беларусь заклікае Расію будаваць саюз дзвюх дзяржаў на класічных, сумленных прынцыпах. «Нам быў выгадны гэты саюз. Ён нам выгадны і цяпер. Толькі давайце яго будаваць на тых прынцыпах, якія выпрацавала чалавецтва. Калі мы адыдзем ад гэтых прынцыпаў, ён разваліцца, мы пойдзем наперакор народу. Калі вы будзеце паважаць беларусаў, калі вы як гіганцкая краіна, як старэйшы брат не падыдзеце да малодшага і яго не тое што зацікавіце, не прапануеце яму яшчэ больш, чым сабе на гэтым этапе, дык не атрымаецца нічога. І мы не просім у вас даць нам чаго-небудзь, мы падпісалі з вамі пагадненне. Давайце на роўных умовах будзем працаваць і ў Расіі, і ў Беларусі, для суб'ектаў гаспадарання, для людзей». «Мы ж не прасілі якіх-небудзь ільгот. І Расія канстатуе, што мы не нахлебнікі. Дык давайце цяпер, калі вы разумееце, што мы сапраўды не нахлебнікі і што мы не хочам, прысмактаўшыся да вашай трубы нафты, газу, нешта мець, давайце цяпер рухацца, але сумленна. Вы маеце такія ж правы ў нас, як мы ў вас. Гэта ж нармальна. Якую бяду мы прынясём Расіі? Не хлыне беларускі народ на прасторы Расіі. Паверце, не хлыне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама дадаў, што ў гэтым супрацоўніцтве трэба адкінуць усе пытанні суб'ектыўнага плана.

Каб удзельнічаць у прыватызацыі найбуйнейшых прадпрыемстваў Беларусі, у тым ліку ААТ «Нафтан», замежны інвестар павінен кіраваць прадпрыемствам не горш за дзяржаву. ААТ «Нафтан» цяпер паспяхова развіваецца. Штогод у мадэрнізацыю НПЗ укладваецца $150—$200 млн, у гэтым годзе на гэтыя мэты будзе інвеставана $216,7 млн. «Мы не чакаем ніякіх інвестараў, мы ўсё гэта робім самі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паказчык глыбіні перапрацоўкі нафты ў рэспубліцы ўжо складае да 80 працэнтаў, а ў найбліжэйшым будучым гэта будзе 90—95 працэнтаў — узровень еўрапейскіх і сусветных нафтаперапрацоўшчыкаў. Тэхнераўзбраенне будзе прадоўжана, кошт праграмы перспектыўнага развіцця «Нафтана» і «Палімір» складае амаль $5 млрд.

Паводле слоў Прэзідэнта, вядуцца перагаворы з «Лукойлам» і іншымі патэнцыяльнымі інвестарамі. «Прыходзьце, прыносьце грошы, будзем супрацоўнічаць», — запрасіў Аляксандр Лукашэнка, заўважыўшы, што пры гэтым з боку дзяржавы ёсць свае патрабаванні. «Вы мне за тры гады пакажыце, як вы будзеце прагінацца на гэтым прадпрыемстве, людзей не выганіце, будзеце больш ім плаціць, адкрыеце новыя вытворчасці. Так, як працуе дзяржава, клапоцячыся пра кожнага чалавека. Вось тады праз тры гады, без аўкцыёну, без конкурсу мы дамовімся, і я вам прадам гэтыя 50 працэнтаў або кантрольны пакет акцый». Асобныя інвестары ўжо спрабуюць працаваць у Беларусі на такой аснове. Пры гэтым ён дадаў, што прыярытэт у такім супрацоўніцтве будзе аддадзены расіянам.

Нельга блытаць бізнэс і палітыку. «У нас не бывае такога, каб бізнэсмен улез у палітыку і спрабаваў нешта купіць. Гэта небяспечна на выніку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ў Беларусі няма націску на багатых людзей. «Ніхто ім не перашкаджае працаваць, але ёсць палітыка і ёсць бізнэс. Гэта розныя сферы, у іх розныя правілы і паняцці», — сказаў кіраўнік дзяржавы. На яго думку, сваякі людзей, якія знаходзяцца на дзяржаўных пасадах, не могуць займацца бізнэсам. Яны павінны працаваць на дзяржаўнай службе. Пры гэтым Прэзідэнт дадаў, што «ні адзін з яго сваякоў бізнэсам не займаецца».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў Беларусі таксама ёсць карупцыя. Але ў нас немагчыма, каб купілі пасаду дэпутата або каб чалавек быў назначаны на пасаду за нейкі хабар», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пераканаў барацьбу з карупцыяй трэба ў першую чаргу пачынаць з вярхоў улады. «Заўсёды трэба пачынаць з сябе. Не будзеш красці ты — не будуць красці твае падначаленыя, і так па вертыкалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Акрамя таго, трэба з усёй строгасцю ставіцца да тых, хто абвінавачаны ў карупцыі. «Калі з'яўляецца інфармацыя, што хто-небудзь карумпіраваны, нават калі гэта блізкі чалавек, яго трэба неадкладна вывесці ад сябе, ён не можа займаць дзяржаўную пасаду. У мяне так было з многімі». Без волі вышэйшага кіраўніцтва краіны і фактычнай жорсткай барацьбы карупцыя непераможная, лічыць Прэзідэнт. «Калі людзі ўбачаць, што нікому даравання не будзе, гэта важнейшы любых законаў. Хоць, вядома, у нас ёсць вельмі моцная антыкарупцыйная база».

У аснове сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу ляжыць карупцыя і псіхалагічны націск праз СМІ, лічыць Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Сённяшні крызіс — гэта перш за ўсё крызіс даверу. Народ запужалі праз СМІ, напусціўшы на яго гэту лавіну страшных чутак аб крызісе». Менавіта таму, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, на пасяджэнні ўрада ён сказаў, што ў Беларусі крызісу няма, забудзьце: «У тым сэнсе, што балбатаць пра гэта не патрэбна. Трэба працаваць, як бы ні было складана». Народ крызісу асабліва не адчувае. Разам з тым гэта не азначае, што крызісу няма. У Беларусі экспартаарыентаваная эканоміка, таму экспарт упаў, і гэта істотная праблема. І перш за ўсё пацярпелі прадпрыемствы-гіганты: БелАЗ, МАЗ, МТЗ, канстатаваў Прэзідэнт. Ён паведаміў таксама, што за восем месяцаў гэтага года зафіксавана 0,5 працэнта падзення ВУП Беларусі. Але плануецца, што па выніках года рост ВУП складзе 1,5-2 працэнты.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

МЫ ПАВІННЫ АПРАЎДАЦЬ ДАВЕР НАРОДА І КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэты раён па многіх паказчыках з'яўляецца адным з перадавых у вобласці. Тым не менш і ў яго ёсць праблемы, якія патрабуюць вырашэння.

У прыватнасці, недастаткова эфектыўна праводзіцца работа па ўмацаванні даходнай часткі бюджэту, паколькі няпоўнасцю выкарыстоўваецца рэсурс у сферы аказання паслуг насельніцтву, арэнды маёмасці і зямельных участкаў. Не завершана і перадача аб'ектаў водазабеспячэння, дарог і вуліц сельскіх населеных пунктаў на баланс спецыялізаваных арганізацый. Такая сітуацыя характэрна таксама для многіх іншых раёнаў краіны. Па выніках пасяджэння дадзены канкрэтныя даручэнні.

Паважаныя калегі!

Да заканчэння гэтага года, аб'яўленага Прэзідэнтам Годам роднай зямлі, засталося тры месяцы. Мы павінны эфектыўна выкарыстаць гэты час для вырашэння задач, пастаўленых перад намі Кіраўніком дзяржавы. Праведзеныя мясцовымі Саветамі дэпутатаў мерапрыемствы ў гэтай сферы знаходзяцца пад нашай пільнай увагай. Чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў найбліжэйшы час пройдзе ў Жлобінскім раёне. У рамках гэтага пасяджэння мы разгледзім вынікі работы гэтага раёна.

За апошнія два гады ў Савеце Рэспублікі склалася добрая традыцыя правядзення сустрэч са старшынямі мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія павышаюць кваліфікацыю ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Іх удзельнікі могуць узняць любыя пытанні, якія існуюць у штодзённай дзейнасці Саветаў дэпутатаў. Так, у верасні са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў мы абмяркоўвалі праблемы развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці і сферы паслуг у малых, сярэдніх гарадах і сельскіх населеных пунктах.

Цяпер кіраўніцтва краіны прымае меры, накіраваныя на лібералізацыю ўмоў вядзення бізнэсу. Аднак людзі, якія маюць патэнцыяльную магчымасць ім займацца, не праяўляюць належную ініцыятыву. У гэтым у многім ёсць віна мясцовых органаў кіравання і самакіравання. Наша з вамі задача — максімальна стымуляваць дзелавую актыўнасць у рэгіёнах. Аператыўнае прымяненне новых прававых нормаў дасць магчымасць істотна актывізаваць прадпрымальніцкую дзейнасць.

У міжсесійны перыяд члены Савета Рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у пасяджэннях мясцовых Саветаў дэпутатаў, аналізавалі іх работу і выступалі з канкрэтнымі прапановамі па павышэнні яе эфектыўнасці. Да выканання гэтай стратэгічнай задачы прыцягнуты і супрацоўнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі.

Быў арганізаваны іх выезд непасрэдна ў сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў. Вывучалася практыка работы Саветаў дэпутатаў пярвічнага трыпартарыяльнага ўзроўню. Ім прадастаўлялася арганізацыйна-метадычная дапамога, у выніку чаго дзейсна вырашаліся надзённыя праблемы людзей.

Дзейнасць парламентарыяў у рэгіёнах набывае асаблівую значнасць ва ўмовах фінансава-эканамічнага крызісу. Паважаныя калегі, неабходна адсочваць сітуацыю, унікаць ва ўсе дэталі, дапамагаць людзям. Для гэтага ў вас ёсць шырокія паўнамоцтвы, замацаваныя законам. Трэба больш цесна ўзаемадзейнічаць і з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Гэта дасць магчымасць нам мець больш поўную інфармацыю аб стане спраў на месцах і пры неабходнасці ўносіць канкрэтныя прапановы па далейшым удасканаленні дзеючага заканадаўства.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У ходзе асенняй сесіі нам трэба будзе разгледзець шэраг актуальных законапраектаў. Асаблівыя надзеі мы ўскладаем на прыняцце ў рамках маючай адбыцца сесіі праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Адзначу, што ў міжсесійны перыяд ішла актыўная работа над яго палажэннямі з улікам вопыту, накопленага ў рамках Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Асноўная мэта гэтага нарматыўнага прававога акта — аптымізаваць структуру мясцовага самакіравання, пашырыць правы мясцовых Саветаў дэпутатаў і ў той жа час павысіць іх адказнасць. Для каардынацыі дзейнасці Саветаў дэпутатаў прадугледжваецца стварэнне ў гэтай сферы Савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Іх удзельнікі могуць узняць любыя пытанні, якія існуюць у штодзённай дзейнасці Саветаў дэпутатаў. Так, у верасні са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў мы абмяркоўвалі праблемы развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці і сферы паслуг у малых, сярэдніх гарадах і сельскіх населеных пунктах.

Цяпер кіраўніцтва краіны прымае меры, накіраваныя на лібералізацыю ўмоў вядзення бізнэсу. Аднак людзі, якія маюць патэнцыяльную магчымасць ім займацца, не праяўляюць належную ініцыятыву. У гэтым у многім ёсць віна мясцовых органаў кіравання і самакіравання. Наша з вамі задача — максімальна стымуляваць дзелавую актыўнасць у рэгіёнах. Аператыўнае прымяненне новых прававых нормаў дасць магчымасць істотна актывізаваць прадпрымальніцкую дзейнасць.

У міжсесійны перыяд члены Савета Рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у пасяджэннях мясцовых Саветаў дэпутатаў, аналізавалі іх работу і выступалі з канкрэтнымі прапановамі па павышэнні яе эфектыўнасці. Да выканання гэтай стратэгічнай задачы прыцягнуты і супрацоўнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі.

Пры гэтым нагадаю вам аб тым, што ў бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2010 год», які будзе вызначаць сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны на найбліжэйшы час. Члены Савета Рэспублікі сумесна з Урадам і Палатай прадстаўнікоў пачалі працаваць над ім яшчэ ў міжсесійны перыяд. Нягледзячы на пэўныя цяжкасці, плануецца захаваць сацыяльную накіраванасць бюджэту, каб падтрымаць людзей у складаны сітуацыі. Будуць прафінансаваны найважнейшыя напрамкі дзейнасці — стварэнне адпаведнай індустрыяльнай інфраструктуры, распрацоўка і ўкараненне інавацый, забеспячэнне бяспекі, будаўніцтва жылля і г.д.

Пры гэтым нагадаю вам аб тым, што эканомія і беражлівасць — адзін з асноўных прыярытэтаў бюджэтнай палітыкі не толькі на ўзроўні дзяржавы, але і на ўзроўні вобласці, раёна, прадпрыемства і арганізацыі. Тут вы павінны паказаць усім станоўчы прыклад. Я спадзяюся на далейшую канструктыўную работу членаў Савета Рэспублікі ў гэтым напрамку.

Выхаванне моладзі, клопат аб яе маральным і фізічным здароўі — важны напрамак у палітыцы дзяржавы. Мы разумеем, што менавіта моладзь з'яўляецца важным суб'ектам сацыяльных зменаў, вялікай наватарскай сілай. Забеспячэнне адпаведнага ўзроўню адукацыі маладога пакалення — самая надзейная інвестыцыя ў развіццё любой дзяржавы. Такое бачанне характэрна і для іншых краін — удзельніц СНД, што было пацверджана на пленарным пасяджэнні МПА СНД у пачатку гэтага года. Пры гэтым адзначу, што створаная ў Рэспубліцы Беларусь нарматыўная прававая база ў гэтай сферы з'яўляецца адной з найбольш поўных сярод краін Садружнасці.

Аднак змяненне сацыяльна-эканамічных умоў у нашай краіне патрабуе крыху іншага падыходу да выхавання моладзі. У сувязі з гэтым у новай рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» асаблівая ўвага ўдзелена сістэме мераў па падтрымцы таленавітых і адораных маладых людзей і фарміраванні ў іх грамадзянска-патрыятычнай пазіцыі. Акрамя таго, замацаваная ў гэтым законапраекце норма аб абавязковым правядзенні навуковых даследаванняў па праблемах моладзі паслужыць падставай для распрацоўкі адпаведных мерапрыемстваў у гэтай сферы.

Вялікую ўвагу мы надаём таксама разгляду пытанняў у сферы аховы здароўя насельніцтва. Сёння мы заслухаем Міністра аховы здароўя Жарко Васіля Іванавіча аб актуальных праблемах у сістэме аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Далейшае развіццё нашай краіны як дэмакратычнай прававой дзяржавы немагчыма без умацавання судовай сістэмы. У гэту сесію намі будуць унесены і дапаўненні ў некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь, што будзе садзейнічаць павышэнню аператыўнасці судаводства і выканаўчага вядзення па справах, а таксама аптымізацыі працэдуры назначэння суддзяў. Удакладняюцца і палажэнні, што датычацца іх дысцыплінарнай адказнасці.

Удасканаленню заканадаўства ў сферы экалагічнай бяспекі будзе садзейнічаць адабрэнне законапраекта «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе». Рэалізацыя яго палажэнняў дасць магчымасць вырашыць дзве найважнейшыя задачы: з аднаго боку, папярэдзіць магчымае неспрыяльнае ўздзеянне аб'ектаў гаспадарчай і іншай дзейнасці на навакольнае асяроддзе, а з другога — палепшыць інвестыцыйны клімат за кошт спрашчэння адміністрацыйных працэдур і скарачэння тэрмінаў узгадненняў і экспертызы праектнай дакументацыі.

Шырокія магчымасці для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны адкрываюцца з пачаткам дзеяння пагадненняў аб стварэнні Мытнага саюза паміж Рэспублікай Беларусь, Казахстанам і Расіяй. Гэта важны складальнік інтэграцыйных ініцыятыў нашай дзяржавы, што рэалізуецца на практыцы. Нам трэба будзе прадоўжыць работу па заканадаўчым забеспячэнні агульнай мытнай прасторы. Члены Савета Рэспублікі будуць працаваць над стварэннем Мытнага кодэкса трох краін. У час свайго старшынства ў Міжпарламенцкай Асамблеі ЕўрАзЭС мы будзем актыўна заклікаць парламентарыяў краін-удзельніц да больш хуткай ратыфікацыі пакета міжнародных дагавораў аб Мытным саюзе. Бо ў гэтым выпадку ў нас з'явяцца рэальныя магчымасці для росту тавараабароту і, самае галоўнае, будзе замацаваны рэжым свабоднага гандлю з краінамі — членамі Мытнага саюза. Акрамя таго, больш увагі мы будзем удзяляць папярэдняму аналізу заканапраектаў, што разглядаюцца МПА ЕўрАзЭС, а таксама садзейнічаць устанаўленню прававога поля ў сферы міжрэгіянальнага супрацоўніцтва нашых краін і ініцыяваць абмен актыкрызіснымі праектамі.

Адзначу, што нязменнай застаецца і задача парламента па аб'ектыўным інфармаванні сусветнай супольнасці аб сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь, новых магчымасцях і перавагах вядзення бізнэсу ў нашай краіне, асаблівасцях нацыянальнай заканадаўчай базы ў сферы інвестыцый. Парламенцкая дыпламатыя павінна ўнесці свой уклад у пашырэнне інтарэсаў Рэспублікі Беларусь за мяжой. Выкарыстоўвайце гэты патэнцыял у час работы ў Міжпарламенцкім Саюзе, Парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы і іншых арганізацыях, а таксама ў ходзе сустрэч з замежнымі парламентарыямі і замежнымі прадстаўнікамі ў рамках вашай асноўнай прафесійнай дзейнасці.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Кожны з вас абавязаны ўсвядоміць сваю асабістую адказнасць за поспех нашай агульнай справы — стварэнне дасканалай заканадаўчай базы, забеспячэнне стабільнасці ў сацыяльнай сферы і аказанне дзейснай дапамогі грамадзянам. Але аднаго гэтага мала — неабходна прымаць канкрэтныя дзеянні для дасягнення гэтых мэтаў. Мы павінны апраўдаць давер народа і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама надзеі, якія яны на нас ускладаюць.

Жадаю вам плённай працы!

Дзякуй за ўвагу!

ЗАБЯСПЕЧВАЮЧЫ СТАБІЛЬНАСЦЬ І ЭФЕКТЫЎНАЕ РАЗВІЦЦЁ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перш за ўсё, гэта павышэнне эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў. У законапраекце таксама прадугледжаны меры па дзяржаўнай падтрымцы прыярытэтных галін рэальнага сектара эканомікі, павышэнні канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў, развіцці экспарту і прыцягненні інвестыцый.

Прадаўжаецца работа па кадыфікацыі падатковага заканадаўства. Парламентарыі актыўна супрацоўнічаюць з Урадам пры падрыхтоўцы праекта Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь і спецыяльнага закона, які забяспечвае ўвядзенне яе ў дзеянне. Дэпутатамі ўнесены шэраг сацыяльна значных ініцыятыў. У прыватнасці, прапануецца вызваліць арганізацыі аховы здароўя ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць за аказанне медыцынскіх паслуг насельніцтву, спрасціць прымяненне дзеючай ільготы па зямельным падатку для шматдзетных сем'яў, увесці вылікі па падаходным падатку для інвалідаў пры выкананні імі работ не па асноўным месцы работы, а таксама знізіць з 15 да 12 працэнтаў стаўку падаходнага падатку з фізічных асобаў па даходах, атрыманых ад аперацый з каштоўнымі папярамі ў выглядзе дывідэндаў.

Важную ролю ў паляпшэнні бізнэс-клімату ў краіне прызначаны адыграць законапраект «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». Дапрацаваны Урадам з улікам новых эканамічных рэалій, ён прапануе комплекс мераў па падтрымцы гэтага сектара эканомікі. Размова ідзе, перш за ўсё, аб садзейнічанні ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, нарошчванні экспартнага патэнцыялу і пашырэнні доступу да крэдытных рэсурсаў.

На развіццё дзелавой актыўнасці накіраваны змяненні і дапаўненні, якія ўносяцца ў Грамадзянскі кодэкс, Закон «Аб гаспадарчых таварыствах», а таксама ў некаторыя законы па пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі і спынення дзейнасці суб'ектаў гаспадарання. Будуць удасканалены нормы, якія рэгулююць пытанні транспартнай дзейнасці і выкарыстання атамнай энергіі.

Першы этап разгляду пройдзе законапраект, накіраваны на ўдасканаленне сістэмы кіравання і ўпарадкаванне працэдур у галіне архітэктуры і будаўніцтва. У першым чытанні мы таксама разгледзім праект Закона «Аб ветэрынарнай дзейнасці», які істотна абнаўляе заканадаўства ў гэтай галіне і прыводзіць яго ў адпаведнасць з міжнароднымі патрабаваннямі, што, у прыватнасці, дасць магчымасць павысіць канкурэнтаздольнасць айчыннай жывёлагадоўчай прадукцыі.

Сярод прыярытэтаў эканамічнага блока і пытанні зямельнага

ЗАЛАТЫ ЧАС

У Магілёве адкрыўся міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер»

Канцэрт адкрыцця ў Лядовым палацы спорту сабраў «зорак» савецкай эстрады. На галоўную магілёўскую сцэну выйшлі Кацярына Шаўрына, Рэнат Ібрагімаў, Сасо Паўліяшвілі, Ігар Нікалаеў, Анне Вескі і іншыя вядомыя артысты.

— Я аддаю перавагу «Залатому шлягеру» за цудоўныя песні, якія будуць жыць у стагоддзях, — сказаў **начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення культуры Анатоль СІНКАВЕЦ**. — А наш фестываль будзе перадаваць іх з пакалення ў пакаленне. Я сапраўды вельмі люблю наш «Шлягер» і на першым канцэрце адчуў, што яго любяць і ўсе магілёўцы.

Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь публіка прымала ў першы фестывальны вечар проста на ўра. Людзі адгукаліся апладысментамі на ўсмешкі дырыжора Міхаіла Фінберга і спявалі разам з артыстамі аркестра. А песні былі знаёмыя: аркестр даў **канцэрт памяці паэта-песенніка Міхаіла ТАНІЧА «Залатое сэрца»**.

— Я быў знаёмы з Танічам — паэтам, франтавіком, — расказаў журналістам **Міхаіл ФІНБЕРГ**. — І ён вельмі паважаў наш калектыў. Песні, якія напісаў Таніч, спявае ўвесь былы Савецкі Саюз і наша родная Беларусь. Яны сталі класічнымі і будуць гучаць заўсёды.

На ўрачыстым адкрыцці фестывалю магілёўцы ўзгадвалі яшчэ адно імя, знакавае для музычнай культуры рэгіёна і ўсёй краіны. **Народны артыст Беларусі Леанід ІВАНОЎ**, кіраўнік вядомага аркестра народных інструментаў, на «Залатым Шлягеры» быў таксама натхняльнікам і арганізатарам фестывальнай «Рамансіяды».

Леанід Іваноў памёр сёлета ад цяжкай хваробы, а ў сваім завяшчанні назваў імя пераемніка. Ім стаў **Мікалай АЛДАНАЎ**, брэсцкі музыкант і вучань Іванова.

— Гэта круты паварот у маім лёсе, — сказаў Мікалай Міхайлавіч. — Але я ў немаладым ужо ўзросце пакінуў аркестр у Брэсце і пераехаў у Магілёў, таму што такое было жаданне і апошняя воля Леаніда Іванова. Гэты вялікі чалавек быў нібыта факел, які запальваў сваім талентам і энергіяй вучняў і публіку.

«Дзякую табе», песню з рэпертуару Мусліма Магамаева, з вялікім пачуццём выканала магілёўская спявачка Алена Мацярынка — у памяць тых, каго з намі няма.

Сёння, 3 кастрычніка, — самы насычаны фестывальны дзень. У Палацы культуры вобласці праходзіць **конкурс вакальна-інструментальных ансамбляў імя народнага артыста СССР і Беларусі Уладзіміра МУЛЯВІНА**. У ім будзе браць удзел больш за дзесяць музычных калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Малдовы і Грузіі.

Маладыя грузіны з гурта «Вандроўнікі» напярэдадні конкурсу шчыра прызналіся журналістам, што да нядаўняга часу не былі знаёмыя з творчасцю Уладзіміра Мулявіна. Што і казаць: музыкантам ледзь за 20 гадоў. Затое іх бацькі цудоўна ведаюць творы беларускага песняра, а таму радасна падтрымалі ідэю ўдзелу ў конкурсе «Залатога шлягера».

Аднак у мулявінскія песні, папярэдзілі грузіны, яны прыўнеслі свой нацыянальны каларыт.

— Мы марым пачаставаць калдунамі, а беларуская мова для нас — нешта мяккае і вялікае, — парадавалі «Вандроўнікі» беларускіх журналістаў.

Пераможца конкурсу ВІА будзе браць удзел у **юбілейным канцэрце «Беларускіх песняроў»**, які адбудзецца заўтра, 4 кастрычніка. Дарэчы, білеты менавіта на гэты канцэрт карыстаюцца найбольшай папулярнасцю.

Канцэртныя залы «Залатога шлягера» запоўненыя цалкам. Сёлета аргкамітэт фестывалю праводзіць новую **цэнасную палітыку**: самыя танныя білеты па (5—10 тысяч рублёў) мелі магчымасць набыць ветэраны і інваліды, а ВІП-месцы ў партэры за 150—170 тысяч рублёў маюць у дадатак асобны ўваход, гардэроб і аўтастаянку.

Гэтыя дні ў Магілёве сталі святочнымі. Гэта датычыцца не толькі фестывальных канцэртных пляцовак горада, але яго вуліц і плошчаў.

Самыя доўгія гандлёвыя рады народных майстраў адкрыліся ў Магілёве: яны працягнуліся па пешаходнай вуліцы Ленінскай і набярэжнай Дняпра. **«Беларусь майстравая»** прапануе разнастайныя вырабы дэкаратыўна-прыкладной творчасці. І хоць надвор'ем першыя дні кастрычніка магілёўцаў і гасцей горада не вельмі парадавалі, але і настрой не сапсавалі, гандаль ідзе бойка.

Сёння на падмацаванне рамеснікам выйдуць вяскоўцы: у вялікім кірмашы **«Залатая восень»** бяруць удзел прадпрыемствы гандлю, сельскія гаспадаркі і прадпрымальнікі з усімі дарамі ўраджайнай беларускай восені.

Магілёўскія кінатэатры запрашаюць на рэтра-паказы любімых савецкіх стужак. Мастакі дапамагаюць «зоркам» маляваць аўтапартрэты для творчай гасцёўні «Залатога шлягера». Спевакі высаджваюць фестывальную кляновую алею.

Каля гарадской Ратушы — урачысты парад духавых аркестраў і конкурс фанфары «Голас горада». Маладыя таленты Магілёўшчыны спаборнічаюць на моладзевым шоу, і пераможца атрымае ганаровы шанц выйсці на вялікую фестывальную сцэну.

Абсалютны аншлаг чакаецца сёння ўвечары ў Палацы культуры вобласці на канцэрце **сімфанічнага аркестра «Новая Расія»**, якім кіруе народны артыст Расіі **Юрый Башмет**. Гэта музычнае свята падаравала магілёўскаму фестывалю і сваім абанентам кампанія сотавай сувязі «МТС».

У Лядовым палацы сёння ўвечары будзе спяваць старыя і новыя хіты расійская **група «Любэ»**.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Мікалая ЦІТОВА.

«А мы ўсё роўна галаву ўверх трымаем!»

Такі жыццёвы дэвіз Марыі Іванаўны Глушаковай — дырэктара ААТ «Макеевічы», што ў Клімавіцкім раёне. Дэвіз мае звыклы савецкі выгляд, і гэта нездарма: яна калісьці была парторгам гаспадаркі, і яе шчырыя камуністычныя перакананні не залежаць ад павеваў часу.

Глушакова і сама — у нечым увасабленне ленінскай тэорыі: нарадзілася ў простай сялянскай сям'і, прайшла працоўны шлях ад рабочай да аўтарытэтнага кіраўніка. І хоць не ўсё гладка было, але вынік ёсць: «Макеевічы» — адна з лепшых гаспадарак раёна.

Марыя Іванаўна — абаяльная жанчына з разумнымі вачыма, ды за словам у кішэню не лезе: трапныя выказванні цяжка ўціснуць у паліткарэктныя фармулёўкі. На суразмоўніка яна робіць уражанне нечага хуткага і нават вогненнага, хоць застаецца на адным месцы — у крэсле дырэктара, у акружэнні некалькіх дзясяткаў дыпломаў і грамат.

— Гэта ўзнагароды гаспадарцы, — тлумачыць Марыя Іванаўна. — Я тут усё жыццё тапчуся, з 1968 года. Таму гэта і мая гаспадарка.

ПРАЦА

— Як вы сталі дырэктарам «Макеевічаў»?

— Пачынала даяркай. Даіла два дзясяткі кароў, рукамі, таму гэту працу я ведаю не з чужых расповедаў. Гэта цяпер даяркі апарат падключыла і кнопку націснула. За тым часам мае рукі страшна распухалі, пакуль не прызвычаіліся. Пасля заканчэння тэхнікума стала бухгалтарам, пасля сельскагаспадарчай акадэміі — эканамістам. Працавала намеснікам дырэктара, а ўжо дзесяць гадоў — кірую сама.

— Але гэта зусім не жаночая праца, ці не так?

— Я не сказала б. Чаму ж не жаночая? Я з дзяцінства была завадатаркай кампаніі і добрым арганізатарам. Для кіраўніка такія здольнасці вельмі важныя. Можна быць выдатным спецыялістам і знаўцам сваёй справы, але нездольным арганізаваць людзей на працу. Кагосьці — пугай, іншага — пернікам, на каго трэба грозна крыкнуць, у каго ласкава запытацца: «Мілы, чаго стаіш?»

— Калі не сакрэт, як вы вызначаеце: каму — ласку, а каму — строгае слова?

— Адзін вясковец пажартаваў, што я не толькі людзей ведаю, але і мянушкі ўсіх сабак. Таму што тут усё жыццё пражыла. Але і аўтарытэт на мяне працуе: мне не трэба быць на месцы, каб маю каманду ўсе старанна выконвалі.

— Калі прапаноўвалі стаць кіраўніком, вы адразу пагадзіліся?

— Меркавала, што калі адмоўлюся прыняць гаспадарку — скажуць, што спужалася. Я пайшла, таму што для мяне гэта была звыклая праца: мой ранейшы начальнік быў, так бы мовіць, знешнім старшынёй, а я была ўнутраным намеснікам — займалася гаспадаркай.

— А вы цяпер — знешні альбо ўнутраны кіраўнік?

— Два ў адным. Але скажу, што цяпер прыйшлі маладыя і здольныя спецыялісты. Жвавыя, спрытныя. Я такіх работнікаў люблю.

— Няўжо сюды нехта даяджае з маладых спецыялістаў? Тут жа край зямлі, памежжа.

— Так, да Расіі два кіламетры, са Смаленшчынай мяжуем. А што тут такога? Жыві, працуй, вучыся, рабі для сябе і народа.

— А чым вы зацікаўліваеце моладзь?

— Даём жыллё з усімі выгодамі. Толькі што трэба самім ацяпляць дом, але ў першы год мы дапамагаем і з палівам. Дровы набываем за кошт гаспадаркі.

— «Макеевічы» — фінансава моцная гаспадарка?

— Грошы направа і налева не кідаем. Лічым кожную капейку. Заробак у спецыяліста — 750 тысяч рублёў. Лепшыя даяркі атрымліваюць па 800—900 тысяч. Механізатары за жніво і па 3,5 мільёна зарабілі. Сярэдні заробак па гаспадарцы — 538 тысяч. Гэта нармальны заробак, адзін з лепшых паказчыкаў у раёне.

ЭКАНОМІКА

— Што трэба, каб у сельскай гаспадарцы атрымаць добры вынік?

— Напэўна, найперш дысцыпліна. Няма дысцыпліны — няма нічога. Прычым слоўным выхаваннем на нашых мужыкоў не паўплываць. Але нават калі ёсць дысцыпліна, парадак і імкненне ў душы да лепшага, можа нічога не атрымацца без фінансаў. Няма грошай — і табе канцы.

— Але вы працавалі і ў тыя часіны, калі грошай было шмат і іх не лічылі.

— За савецкай уладай салярка лілася, запчасткі і ўгнаенні везліся. Літр саляркі каштаваў 6 капеек, а малака — 24. Цяпер за літр саляркі трэба заплаціць болей за 2 тысячы рублёў, а за літр малака — 660 рублёў даюць.

Сёлета цэны на збожжа не павялічыліся: летась піваварны ячмень здавала па 640 рублёў за кілаграм, сёлета — па 558. А выдаткі на вытворчасць яго былі большыя, таму што ўгнаенні падаражэлі. Летась каля мільярда рублёў выдаткавалі на ўгнаенні.

Нічога, нас душаць, але мы ўсё адно галаву ўверх трымаем! Іншым разам ужо падаецца, што патануў у фінансавай яміне. Але не — выкараскаўся і працуеш далей. Бо без калектыўных гаспадарак народ не выжыве.

— Што для вас значыць крызіс?

— Нас крызіс закрануў: падаражэла дызельнае паліва і запчасткі. Тэхніка ломіцца. Я падлічыла, што з 1 красавіка пра новы трактар мы скінулі 28 заявак пра паломкі. Толькі новы «Дон», набыты ў Расіі, за жніво ні разу не паламаўся, я нават здзівілася. З нашымі, прабачце за праўду, праблемы ўзнікаюць: толькі што — і адразу загрукатала.

— Клімат мяняецца і ўсё больш катаклізмаў, а сельская гаспадарка моцна залежыць ад надвор'я.

— Так, сёлета ўвогуле быў жах. Цэлае лета ішоў дождж. Я ўсё жыццё працую, а такой вільготнасці збожжа не бачыла. Трэба сушыць, а гэта дадатковыя выдаткі.

— Але ўсё ж лепей спрацавалі, чым пяць гадоў таму?

— Лепей, таму што займаемся культурай земляробства. Вось сёлета вырасцілі добры піваварны ячмень: я набывала насенне французскага гатунку, дзе з аднаго зярняткі вырастае 18 сцяблінак. У нас бал пашы 26, а на асобных палях атрымалі 65—68 цэнтнераў з гектара. Уносім угнаенні: 200 калію, 200 фосфару і 200 азоту.

— Так шмат хіміі?!

— А што вы думалі, яно само расце? Калі б нашы продкі, якія гадоў дзвесце таму жылі, пачаставаліся нашай прадукцыяй, памерлі б. Але нам не трэба баяцца, мы прыстасаваліся.

— Упэўнены?

— Пра што гаворыце? Наш арганізм вытрымлівае ўсё! Памятаеце, як у Хазанава пра выезд на прыроду: Маўляў, добра, што сусед быў на «Жыгулях», падцягнулі да выхлапной трубы і апрытомнеў. Мы прызвычаіліся да гэтага паветра і шалёнага рытму жыцця.

ПРАБЛЕМА

— Як змагаецеся з алкаголікамі?

— Караем грашыма. У калектыўнай дамове ўкаранілі каэфіцыент працоўнага ўдзелу. Ён на палову зніжаецца за п'янку, прагул і прагулы. Гэта і стрымлівае: зарабіў мільён, але выпіў на працы — палова прэміі адляцела, а гэта значны кавалак.

Я ўсё жыццё ваюю дзеля таго, каб людзі не співаліся. Цяпер ёсць катэгорыя маламаёмасных, а я лічу, што многія з іх прабачце, проста шмат п'юць. У вёсцы толькі дурань, лайдак і п'яніца можа жыць бедна!

— Вельмі катэгарычнае меркаванне.

— Што сказаць? Гэта ж вёска! Жыві, засявай агарод і трымай жывёлу, ды радуйся сытаму жыццю. Гэта ў вашым горадзе казу на балкон не паставіш.

— Але і ў вёсцы грамадскі статак скарачаецца.

— Можа, асобныя вяскоўцы і маюць рацыю? Заробак ёсць, пайшоў у краму і набыў харчы. Але ўсё ж вялікія сем'і, дзе шмат дзяцей, проста абавязаны трымаць гаспадарку. Не ўсе хочуць працаваць, затое ўсе імкнуцца жыць цывілізавана, з ваннай і цёплай прыбіральняй. Не так, як дзед Шчукар сядзеў у кукурузе.

— Цяпер у новых дамах досыць камфортна. Вяскоўцы так жа цывілізавана працуюць, як і жывуць?

— У нас 106 работнікаў у гаспадарцы. І самая высокая выпрацоўка на чалавека па валавой прадукцыі — каля 50 мільёнаў рублёў. Людзей мала, але ўсе занятыя працай. Касцяк — працэнтаў 70. А астатнія 30 % настаўляем на шлях ісціны. Няма такога, каб два чалавекі прасіліся на адно працоўнае месца, і можна было выбіраць лепшых працаўнікоў.

ПАМЕЖЖА

— Ці падтрымліваеце вы стасункі з суседзямі?

— У адным раёне ўжо няма з кім падтрымліваць — калгас ліквідавалі, людзі жывуць самі па сабе. А вось у Рослаўскім раёне ёсць гаспадарка, з якой мы сябруем: дапамагаем убіраць збожжа сваім камбайнам.

— Як там жывуць людзі?

— Там, дзе ёсць гаспадарка, — нармальна. А дзе няма калгаса, там вяскоўцы на заробкі ў Маскву ездзяць. Сем'і, якія трымаюць па дзве-тры каровы, часта прыязджаюць да нас набываць збожжа.

— Гавораць, цяпер ідзе адток дадому беларусаў, якія працавалі ў Расіі?

— Не, нашы калі ездзяць, дык толькі па суседстве, сэлглу паклясці. Калі да нас прыедуць — я дам людзям працу. У вёсцы яна заўсёды ёсць.

— Калі вы ездзіце на той бок мяжы, што набываеце?

— Толькі ў нашых крамах можна набыць нармальныя харчы. Напрыклад, у Расіі ніколі не набываю мясныя прадукты. Таму што ў Маскве 18 мільёнаў жыхароў паядуць усё, што можна і што нельга. Я не ведаю, чаму ў іх да нашых тавараў такія высокія патрабаванні, але ў іх саміх нічога не кантралюецца. Таму за мяжой можна набыць рыбу і крупы, але толькі не мяса, і асабліва каўбасу, якая вырабляецца там у падворотнях.

Але што Масква? Нашы харчы высока ацэньваюць і еўрапейцы. У нас тут гасцявалі немцы і канадцы: частавалі іх дранікамі са смятанай. Як яны елі! І ўсё здзіўляліся, што ў нас такая можа быць смятана! У іх малочныя прадукты ва ўпакоўцы могуць і год захоўвацца, а нашы — натуральныя.

НАДЗЁННАЕ

— У вас два тэлефоны, сотавы і звычайны, зараз нібыта супернічаюць — хто болей званкоў збярэ. Калі іх адключыць — што можа здарыцца? Гаспадарка разбурыцца?

— Ды нічога не здарыцца! Мы ж без сотавай сувязі жылі неяк: яна з'явілася ў аграгарадку толькі ў 2006 годзе. А цяпер без гэтай штукі я сябе ўвогуле не ўяўляю. Уся пенсія ідзе на аплату: 200 тысяч рублёў у месяц кладу. У работнікаў маіх такіх грошай няма: яны мне СМС-кі дасылаюць з просьбамі тэрмінова пераглефанаваць. У кожнага механізатара тэлефон: каб яго праверыць, раней трэба было ехаць на поле. А цяпер дастаткова набрать нумар: калі ў трубцы гудзе, значыць трактар працуе.

— Што вам найбольш не падабаецца ў працы?

— Вызначаныя зверху тэрміны: да 5-га — убраць салому, да 10-га — пасеяць. Бо не заўсёды ж атрымліваецца па пісаным: стаў сеяцца, а сеялка — бац, і ляснула. Два дні шукаем запчасткі, а да Мінска — 450 кіламетраў.

Ды і нядобра гэта, калі прымушаюць. Я ж як старшыня сама павінна ведаць, што рабіць у першую чаргу: салому пакласці альбо араць. Трэба болей давяраць і болей цаніць кіраўнікоў, у якіх ёсць практыка.

— А вы ніколі не мелі жаданняў стаць фермерам і працаваць на сябе?

— Я лічу, ад дабра не шукаюць дабра: мая гаспадарка працуе, самастойна плаціць людзям нядрэнны заробак, дык што яшчэ трэба? Я — працаголік, і хоць ужо пенсіянерка, але працую, працую і яшчэ раз працую.

АСАБІСТАЕ

— Калі пачынаецца ваш працоўны дзень?

— А 6-й. Лячу на працу і бегаю як завадная. Вячэра з мужам — каля 21-й, калі вяртаюся з працы.

— А ў сям'і вы таксама старшыня?

— Мая маці кажа, што ў мяне выпрацаваўся гарлапанны голас, які не выключаецца і дома.

— А хатняя гаспадарка ў вас ёсць?

— Куры, два каты і два сабакі. Самая вялікая жывёла — стары кот Батон.

— Калі апошнім часам вы былі ў водпуску?

— Неяк апачывала ў санаторыі пад Магілёвам, але начальнік «Волгу» за мной даслаў, каб я тэрмінова з'явілася на працу.

— На іншай працы вы сябе не ўяўляеце?

— Не. Я ўвогуле не ўяўляю, дзе ёсць іншая праца, 8-гадзінны працоўны дзень і выхадныя дні. Я не скарджуся — я проста не разумею. Аднойчы ўзімку вырашыла пабыць дома ў выхадны дзень: усё перарабіла, і стала сумна.

— Вы не ведаеце, што рабіць з вольным часам?

— Калі ёсць настрой, магу ўрыўкамі пачытаць «Паднятую цаліну» Шолахава альбо «Вершніка без галавы». Па тэлевізары пасля жніва стала глядзець расійскі ваенны серыял. А да нядаўняга часу з красавіка дадому вярталася толькі каля апоўначы — часу вольнага не было.

— Дык атрымліваецца, што вяскоўцам адпачываць не трэба?

— Трэба, але мы самі дурні. Ды і прызвычаіліся да сваёй вёскі, жыцці сваё без гэтага ладу не ўяўляем. Мая сястра, якая жыве ў Сыктыўкары, настойліва запрашае правесці ў яе водпуск. Я не еду: тут жа ўсё побач і сваё, а там грамадскі транспарт, трамваі перапоўненыя. Я ўсё хачу пачакаць наступнага, больш свабоднага, а сястра смяецца, што я год стаяць буду. Але я не зношу гарадской таўкатні.

— Што вам дапамагае ў жыцці і працы?

— Гумар. Тут стрэс, там стрэс. Калі б на такой працы не была гумарыстам і аптымістам — не ведаю...

— Што пажадаеце вяскоўцам на заканчэнне нашай гутаркі?

— Аптымізму і веры ў светлую будучыню. Магчыма, яно і прыйдзе.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.
Клімавіцкі раён.

ДАВЕДКА:

ААТ «Макеевічы» Клімавіцкага раёна:

Сёлета самая высокая ўраджайнасць збожжа ў раёне: 50,7 цэнтнера з гектара. Ураджайнасць рапсу — 24 ц/га.

Мяса-малочны кірунак: пагалоўе — 2000. Надой ад каровы за год чакаецца 5600 кілаграмаў. Сярэднясутачныя прывагі па 650—750 грамаў.

Гаспадарка прыбытковая: рэнтабельнасць за першае паўгоддзе — 19,8 %.

Разбураць — не будаваць...

Мой дзед да вайны меў зямельны ўчастак з домам. У 1942 годзе ён загінуў. Баба пасля вайны зноў выйшла замуж, а ў 2002 годзе яна памерла. Пасля яе засталася спадчына ў выглядзе дома з гаспадарчымі пабудовамі. Разам з бабуляй жыла яе дачка, якая па судовым рашэнні была прызнана недзеяздольнай. Дачка фактычна прыняла спадчыну і працягвала жыць у доме да 2006 года, пасля чаго яе аформілі ў псіханеўралагічны дом-інтэрнат, дзе яна жыве і зараз. Афармленне дакументаў на жылы дом дагэтуль не завершана. Я пісьмова звяртаўся да апекуна — дырэктара дома-інтэрната, з прапановай аформіць спадчыну падапечнай. Аднак ніякіх дзеянняў для гэтага не робіцца. Зразумела: з моманту належнага афармлення маёмасці апекуну трэба будзе плаціць зямельны падатак, падатак на нерухомасць, страхоўку. А тым часам дом псуецца, у ім збіраюцца мясцовыя аматары выпіўкі, шыбы ў некаторых вокнах разбітыя. Звярнуўся я ў райвыканкам па месцы знаходжання дома па садзейнічанне. Але з іх адказу зразумеў, што ніхто, акрамя апекуна, не можа распараджацца або карыстацца домам. Здаецца, рашэнне праблемы простае — паклікаць наступнага спадчыньніка. Аднак па законе такога няма. Атрымліваецца, што старэйшае пакаленне стварала маёмасць, а малодшае не можа нават падтрымаць яе ў належным стане.

Д.Э.

Вы памыляецеся, калі думаеце, што дакументальнае афармленне ўласнасці на дом за вашай недзеяздольнай сваячкай пацягне неабходнасць для апекуна выплаты падаткаў на нерухомасць і на зямлю. Цётка, як непрацаздольная, мае льготы і вызваляецца ад выплаты гэтых падаткаў у адпаведнасці з артыкулам 4 Закона «Аб падатку на нерухомасць» і артыкулам 19 Закона «Аб плацяжах за зямлю».

Акрамя таго, пунктам 3 артыкула 1069 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей ГК) вызначана, што прынятая спадчына прызнаецца прыналежнай спадчыньніку з моманту адкрыцця спадчыны (г.зн. смерці спадчынадаўца) незалежна ад моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права спадчыньніка на гэту маёмасць, калі права падлягае рэгістрацыі. Да спосабаў прыняцця спадчыны адносіцца, згодна з артыкулам 1070 ГК, як падача адпаведнай заявы натарыусу, так і фактычнае ўступленне ў валоданне спадчыннай маёмасцю. Паколькі ваша цётка з моманту адкрыцця спадчыны ў 2002 годзе і да 2006 года жыла ў доме, то спадчыну яна прыняла.

Прапанаванае вамі простае рашэнне праблемы — паклікаць наступнага спадчыньніка пасля таго, як спадчына ўжо прынята і прызнаецца прыналежнай таму, хто яе прыняў, не такое і простае, як вам здаецца. Фактычна гэта азначае, што спачатку трэба адабраць у ўласнасць у чалавека, які прыняў гэту спадчыну, па той прычыне, што з-за свайго здароўя ці па іншых абставінах ён не можа належным чынам яе дагледзець. Рэспубліка Беларусь у сваёй Канстытуцыі гарантуе кожнаму грамадзяніну недатыкальнасць уласнасці, права атрымання яе ў спадчыну.

Абарона асабістых і маёмасных правоў і законных інтарэсаў поўнагадовых асобаў, якія прызнаны судом недзеяздольнымі — гэта задача органаў апекі і папячыцельства, якімі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Яны павінны забяспечыць ахову маёмасных і асабістых правоў падапечных. Гэта вызначана Палажэннем аб органах апекі і папячыцельства ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28.10.1999 № 1676.

Згодна з Палажэннем аб парадку кіравання маёмасцю падапечных, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28.10.1999 г. № 1677, пад рэалізацыяй і абаронай маёмасных правоў падапечнага разумеецца выяўленне, улік, захоўванне маёмасці і кіраванне ёю, выпатрабаванне маёмасці падапечнага ад асобаў, якія незаконна валодаюць ёю, спагнанне даўгоў, стратаў і да т.п. Пры выяўленні асобы, што мае патрэбу ў апецы, органы апекі і папячыцельства абавязаны высветліць наяўнасць у яе маёмасці і прыняць меры да аховы маёмасных правоў гэтай асобы і захаванасці яе маёмасці.

Пунктам 10 гэтага Палажэння вызначана, што калі ў падапечнага ёсць маёмасць, што знаходзіцца ў іншай мясцовасці, то ахова гэтай маёмасці ажыццяўляецца органам апекі і папячыцельства па месцы знаходжання маёмасці. У выпадку неабходнасці орган апекі і папячыцельства можа назначыць апекуна над маёмасцю або часова перадаць маёмасць падапечнага на адказнае захаванне. Пры неабходнасці пастаянна кіравання нерухомай і рухомай маёмасцю падапечнага орган апекі і папячыцельства заключае з даверным кіраўніком, вызначаным гэтым органам, дагавор аб даверным кіраванні маёмасцю.

Пункт 15 Палажэння прадугледжвае права апекуна недзеяздольнай асобы са згоды органа апекі і папячыцельства здаваць па дагаворы найму жылыя памяшканні, якія належаць падапечным на праве ўласнасці, у выпадку накіравання іх на дзяржаўнае забеспячэнне ва ўстановы сацыяльнага забеспячэння або перасялення па месцы жыхарства апекуноў.

Распараджэнне жылым памяшканнем падапечнага, заключэнне адносна яго любых здзелак апякун ажыццяўляе не самастойна, а са згоды органаў апекі і папячыцельства.

Апекуны з'яўляюцца законнымі прадстаўнікамі падапечных і здзяйсняюць ад іх імя і ў іх інтарэсах усе неабходныя здзелкі. Яны абавязаны клапаціцца не толькі аб утрыманні падапечных і стварэнні ім неабходных бытавых умоў, забеспячэнні іх доглядам і лячэннем, але і абараняць іх правы і законныя інтарэсы. Належнае афармленне права ўласнасці падапечнага на дом, прыняцце мераў для яго захавання і падтрымання ў належным стане якраз і адносіцца да правоў і законных інтарэсаў падапечнага.

Калі апякун вашай цёткі выступіў супраць заключэння з вамі дагавора аб даверным кіраванні маёмасцю, то, магчыма, ён мае іншыя планы наконт захавання маёмасці падапечнай.

Упраўленні (аддзелы) аховы здароўя мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, на якія ўскладзены функцыі па апецы і папячыцельстве ў дачыненні да поўнагадовых недзеяздольных асобаў, павінны правяраць выкананне апекунамі і папячыцелямі ўскладзеных на іх абавязкаў.

Кіраўніцтва і кантроль за дзейнасцю органаў апекі і папячыцельства і органаў, якія ажыццяўляюць гэтыя функцыі, ускладзены на вышэйшыя органы дзяржаўнага кіравання. Вы маеце права звярнуцца ў аблвыканкам са скаргай на дзеянні (бяздзеянне) апекуна і органа апекі і папячыцельства або з просьбай пракантраляваць належнае забеспячэнне імі маёмасных правоў вашай цёткі ў дачыненні да жылога дома, які яна прыняла ў спадчыну.

Згодна з артыкулам 1057 ГК, спадчыннікамі па законе першай чаргі з'яўляюцца дзеці, муж або жонка памерлага і яго бацькі. Унукі спадчынадаўца і іх прамыя нашчадкі атрымліваюць спадчыну па праве прадстаўлення. Гэта значыць, што ў 2002 годзе вы таксама адносіліся да спадчыннікаў першай, а не наступнай чаргі.

Хтосьці з вашых бацькоў (бацька або маці) з'яўляўся сынам (дачкой) вашай памерлай бабулі. Калі ваш бацька або маці жывыя ці былі жывымі на момант смерці іх маці, то яны мелі поўнае права таксама прыняць спадчыну ў роўных долях з вашай цёткай, якая пражывала ў гэтым доме. Наяўнасць уласнай кватэры або дома ніякім чынам не перашкаджала прыняць спадчыну. Калі ж ваш бацька (або маці) памёр раней за вашу бабулю або адначасова з ёй, прыняць спадчыну мелі права вы па праве прадстаўлення.

Гаворыць і слухае Магілёў!

У межах музычнага фестывалю «Залаты шлягер» у Магілёве адкрылася цікавая выстава — «Музычная **рэтра**-трансляцыя».

У краязнаўчым музеі дэманструецца лямпавая радыётэхніка, якой карысталіся ў XX стагоддзі. Уладальнік радыёлаў, прыёмнікаў і першых тэлевізараў — магілёўскі прадпрымальнік Леанід Казанкоў. Ён займаецца продажам сучаснай бытавой тэхнікі і калекцыянуе рарытэтную тэхніку мінулага.

«Зорка» — буржуазны радыёпрыёмнік 1954 года.
Куток савецкага радыёаматара: выпіць гарбаты, паслухаць Севу Наўгародцава.

— Гадоў дзесяць таму сядзелі з сябрамі і ўзгадвалі, як у дзяцінстве і юнацтве прыпадалі да прыёмнікаў, дзе табло прыёма святлілася зялёным, — тлумачыць Казанкоў. — Цяпер колькасць экспанатаў у маёй калекцыі блізіцца да сотні, а на выставе дэманструюцца адрэстаўраваныя прыёмнікі.

Безумоўна, самы прыгожы экспанат — **«Зорка» 1954 года выпуску.** З чарады сціплых савецкіх прыёмнікаў гэты адрознівае буржуазны дызайн: чырвоная лакіроўка, залатыя лініі, белая акантоўка. Гавораць, што «Зорка» была змаляваная з французскага прыёмніка, але савецкую прыналежнасць падкрэслівала чырвоная зорачка «на фасадзе».

— Былі нават такія чуткі, што ініцыятарам з'яўлення такой шыкоўнай рэчы ў савецкім ужытку быў сам Лаўрэнцій Берыя, які пасля смерці Сталіна дэманстраваў подых дэмакратыі ў грамадстве, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік музея Алена ДАЎЛЯШЭВІЧ**.

Радыёла «Мір» — самая велічная савецкая радыёла. Падобная была ў Сталіна. Карысная рэч з сімвалічнай назвай была таксама дзяжурным падарункам урадам іншых краін — напрыклад, кітайцам.

Найбольш цікавіць магілёўцаў невялікі нямецкі прыёмнік «Шварцбург» 1953 года выпуску: там на табло ў шэрагу савецкіх гарадоў побач з Растовам, Масквой і Львовам неяк нечакана размясціўся і Магілёў...

Трэба адзначыць, што калекцыя Казанкова не мае вялікай матэрыяльнай каштоўнасці: гэта, хутчэй, каштоўнасць культурная, якая дае ўяўленне пра мінулае пакаленню «МРЗ-шнікаў» і вяртае сталых людзей у музычны свет свайго дзяцінства і маладосці.

— Я сам быў прыхільнікам Севы Наўгародцава, — узгадвае Леанід. — А аднойчы здарыўся дзіўны выпадак. Мы рэстаўравалі прыёмнік 1930-х гадоў і ўключылі яго. І там, у поўнай адпаведнасці з той эпохай, нечакана праз эфірны трэск загучала «Тачанка». Нібыта адбыўся правал у часе!

Ілона ІВАНОВА.

Фота слова

Моц, сабраная між каранёў,
вершалінамі запазычана,
Беларускае — гэта маё:
спеў крынічны
і гнеў навальнічны.
Я адтуль усё бяру, дзе спіць
ў вечных травах каменне Крэва,
Дзе паводкі лагойскіх суніц
і валошкі — як кропелькі неба.
Тое неба, што ў хвалях Свіцязі,
я у прыгаршчы браў і піў,
Тое ж неба маліў аб літасці
прашчур мой сярод хлебных ніў.
Гэтаксама кладу на далоні
жалуды — знак багацця пушчы,
Нават снег той жа самы на скронях,
што у вояў сівой мінуўшчыны.
Гэтаксама малю на сон
Маці Божую зноў і зноў,
Беларускае — гэта маё,
і дзядоў маіх,
і сыноў.

Віншаванне міністра адукацыі Аляксандра Радзькова з Днём настаўніка

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

Сардэчна віншую вас з Днём настаўніка — цудоўным святам, якое вызначаецца асаблівай цеплынёй і ўдзячнасцю вам — настаўнікам.

Спакон веку да настаўніка прад'яўляліся самыя высокія патрабаванні. І беларускія педагогі з годнасцю выконвалі высакародную місію. Школы і ўніверсітэты заўсёды былі цэнтрам грамадскага жыцця, з'яўляліся носьбітамі і прапагандыстамі ведаў, культуры і гуманітарных каштоўнасцяў.

Вам выпала жыць і працаваць у выключна адказны час — перыяд стваральнага развіцця і якаснага абнаўлення сістэмы айчыннай адукацыі.

Мэтанакіравана ідзе працэс павышэння сацыяльнага статусу педагагічных работнікаў, які сёння звязаны не проста з павышэннем аплаты працы, але і з пераходам на новыя крытэрыі ацэнкі дзейнасці настаўніка, у залежнасці ад яго асобасных і прафесійных дасягненняў, здольнасці бесперапынна ўдасканальваць свой багаж ведаў і педагагічнае майстэрства. На дзяржаўным узроўні заахвочваецца ініцыятыва, прафесіяналізм, імкненне да інавацыйнага развіцця. Напярэдадні нашага прафесійнага свята прайшоў рэспубліканскі конкурс «Настаўнік года». Пераможцам стаў высокаадукаваны, інтэлігентны, таленавіты педагог з Брэстчыны, сапраўдны майстар сваёй справы — Юрый Мікалаевіч Андрэйчык. На яго будуць раўняцца маладыя і вопытныя настаўнікі, яго дасягненні ўвойдуць у скарбонку педагагічнага майстэрства краіны. Упэўнены, што такіх адданых і захопленых сваёй працай людзей у нас шмат. На іх і трымаецца наша школа, гартуюцца лепшыя педагагічныя сілы.

Ваша актыўная грамадзянская пазіцыя, чулыя, уважлівыя адносіны да сваіх выхаванцаў сапраўды бясцэнныя. Будучыня залежыць ад таго, чаму і як навучыце вы сваіх вучняў, якім будзе выпускнік новага часу. Нізкі паклон вам за падзвіжніцкую працу, аптымізм, энтузіязм і шчырую любоў да дзяцей.

Ад душы жадаю вам здароўя, шчасця, поспехаў у педагагічнай дзейнасці, творчых ідэй і іх ажыццяўлення. Няхай вучні радуюць вас сваімі перамогамі і дасягненнямі! Заставайцеся заўсёды самымі лепшымі для сваіх вучняў!

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПРАФЕСІЯ: ДЗЯЦЕЙ... ЛЮБІЦЬ

Прафесійнае свята педагогі сустракаюць па-рознаму — хто з кветкамі, хто з салодкімі сюрпрызамі, хто з вершаванымі прысвячэннямі. Тэлеканал «ЛАД» і студыя дакументальнага кіно ў падарунак беларускім настаўнікам падрыхтавалі фільм — пра іх саміх.

Фільм Анжэлікі Новікавай і Сяргея Кацьера «Дзень настаўніка» складаецца з трох навел. «Размеркаванне» распавядзе пра няпросты выбар выпускніка гістарычнага факультэта БДУ Васіля Прымакі, які хоць і вырас у сям'і педагогаў, але ва ўласнай настаўніцкай дзейнасці сутыкнуўся з пэўнымі праблемамі. Героямі навелы «Сельскія настаўнікі» сталі Надзея Анатольеўна Марціноўская, педагог з 25-гадовым стажам, і яе муж Іван Уладзіміравіч. Былы дырэктар сярэдняй школы ў аграрадарку Вярхоўе Бешанковіцкага раёна Надзея Марціноўская ўзгадвае: раней прафесія педагога была калі не прэстыжнай, то вельмі паважанай... А як сёння? Пра гэта разважае гераіня навелы «Мая першая настаўніца», мінская настаўніца малодшых класаў Наталля Цімашэнка.

Пра тое, якімі ўбачылі настаўніцкія будні і святы тэлевізійнікі, расказаў «Звяздзе» адзін з аўтараў сцэнарыя і рэжысёр фільма Сяргей Кацьер.

— Знойдзеныя героі-педагогі такія, як вы і ўяўлялі, або чымсьці здзівілі?

— Мяне цяжка здзівіць педагагічнай працай, бо мая маці большую частку жыцця працавала настаўніцай, дый сам я выкладаю і праблемы настаўнікаў ведаю не па чутках. Таму вытворчымі аповедамі героі мяне не здзівілі. А вось што сапраўды ўразіла — гэта тое, наколькі праца сельскага настаўніка непарыўна звязаная з работай на зямлі. Раней мы ўяўлялі сельскага настаўніка як прадстаўніка пэўнай праслойкі інтэлігенцыі, як у старых фільмах і творах класікаў: рафінаваная паненка з Санкт-Пецярбурга прыязджае ў вясковую школку, і ўся вёска ледзьве не моліцца на яе — прыбіраюць, кормяць, мыюць бялізну, каб толькі настаўніца мела час і сілы непасрэдна на падрыхтоўку і правядзенне ўрокаў, чытанне метадычнай літаратуры і г.д. Я ўпэўнены, што нашы цяперашнія вясковыя настаўнікі таксама імкнуцца і да самаадукацыі, і да перадачы ведаў усім без выключэння вучням — але на іх яшчэ вялізная гаспадарка, якую вядуць нават не з-за матэрыяльнай зацікаўленасці, а таму, што такая псіхалогія вяскоўца: на зямлі трэба працаваць. У былога дырэктара школы Надзеі Марціноўскай — два гектары зямлі, карова, конь, авечкі, пчолы; і яна выдатна ўмее працаваць рукамі, і карову падаіць, і градкі прапалоць... Пры тым яшчэ трэба вучыць дзяцей. І я сказаў бы, што гэта настаўнік ад Бога. Бо, здараецца, настаўнікі «выгараюць»: калі чалавек працуе, аддае сілы, а ўзамен нічога не атрымлівае, то праз пэўны час ён пачынае ненавідзець і школу, і дзяцей. А ў нашых герояў, якіх мы знайшлі амаль што выпадкова, нават праз 30 гадоў працы ў школе гараць вочы, калі яны гавораць пра сваіх вучняў. І яны гэтых вучняў памятаюць па імёнах, па характарах, з цікавасцю сочаць за лёсамі кожнага, пра кожны здымак у школьных альбомах могуць расказаць асобную цікавую гісторыю... Вось гэта дзіўная якасць, пэўна, якраз уласцівая сапраўдным настаўнікам, пра якіх усе мы марым, але рэдка сустракаем у жыцці. Я таксама часта скарджуся на школу, што мне не сустрэўся настаўнік, які здолеў бы «заразіць» чымсьці. І таму бязмежна ўдзячны сваёй маці — яна была настаўніцай рускай мовы і літаратуры, — бо менавіта яна прывіла мне цікавасць да літаратуры і жывапісу, растлумачыла, што значыць быць не толькі адукаваным, але і інтэлігентным чалавекам. У школе мы ўсё ж рэдка адчуваем такую ўвагу да сваёй асобы, часцей чуем ходкую формулу «Вас шмат, а я адна». Аднак калі педагог здольны цягам многіх гадоў бачыць у кожным дзіцяці асобу, а не ўспрымаць усіх як масу — гэта па-добраму здзіўляе і выклікае вялізную павагу.

— Вы памятаеце сваю першую настаўніцу?

— Помню чыста на эмацыянальным узроўні. На жаль, не ўзгадаю цяпер ні прозвішча, ні імя, імя па бацьку, але помню прыгожую, высокую (ва ўсякім разе, на той момант мне так здавалася), статную жанчыну ў акулярах, дастаткова строгую, але разам з тым добрую, якая здолела не запалохаць нас, малых, і стаць для нас «школьнай мамай». Так што да першай настаўніцы ў мяне няма ніякіх прэтэнзій. Потым ужо было рознае — я ненавідзеў асобных педагогаў, дагэтуль крыўдую на настаўніцу замежнай мовы за цалкам дабітае жаданне гэту самую мову вучыць... Але першую настаўніцу ўзгадваю дастаткова цёпла і не магу назваць ніякай жорсткасці з яе боку, толькі справядлівасць і давер вучняў.

— А вучняў сваіх помніце?

— Я вельмі рады за поспехі сваіх вучняў, на якіх бы тэлеканалах яны ні рэалізоўваліся, і магу з пэўным гонарам зазначыць, што гэты чалавек у мяне вучыўся. А лічыць ці не мяне сваім настаўнікам у жыцці — гэта ўжо выбар кожнага з іх. Цяпер я таксама вяду свой першы курс рэжысёраў тэлебачання і перажываю за кожнага са сваіх навучэнцаў, кожнага лічу адметнай цікавай асобай. Спадзяюся, што ўсе яны застануцца ў прафесіі, але ці атрымаецца — жыццё пакажа.

— Дарэчы, наконт жадання застацца ў прафесіі. Існуе ўражанне, што выпускнікі педуніверсітэтаў як ніхто іншы спрабуюць ухіліцца, «адкасіць» ад размеркавання...

— Так, з героем нашага фільма таксама здарылася падобная гісторыя: нягледзячы на тое, што ў яго абодва бацькі — настаўнікі, ён не хаваў свайго імкнення як мага хутчэй «адкасіць» ад працы ў школе. Відаць, добра ведае працу настаўніка знутры, ведае выдаткі і аплату гэтай працы. Таму адкрыта гаворыць, што жыць хацеў бы ў вёсцы, бо ён сам вясковы чалавек — але працаваць у горадзе, марыць заняцца міжнародным турызмам. Для маладога чалавека, у рынцыпе, цалкам рэзоннае жаданне — паглядзець свет. Ён так і гаворыць у фільме: «Калі мяне размеркавалі ў школу — быў упэўнены, што адпрацую два гады — і ўсё, буду займацца турызмам, як марыў раней. Але, шчыра кажучы, першыя ж дні ў школе пераканалі, што не ўсё так дрэнна. І я пакуль «на ростанях». Значыць, ёсць і станоўчыя моманты, здольныя захапіць, прывабіць сёлетніх выпускнікоў, каб яны засталіся ў школе. Вельмі верагодна, што хлопец — наш герой — там і застанецца, і гэта будзе выдатна, бо настаўнікаў-мужчын, усе спецыялісты аднагалосна адзначаюць, дагэтуль істотна не хапае... Увогуле, мне здаецца, прэстыж прафесіі настаўніка з кожным годам павінен павышацца, бо менавіта ад настаўніка залежыць, якімі вырастуць нашы дзеці — а значыць, уся наша будучыня.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Пытанне ў тэму

Вы памятаеце сваю першую настаўніцу (настаўніка)?

Леанід КЛІМОВІЧ, гомельскі педагог-пазашкольнік, капітан каманды знаўцаў элітарнага клуба «Што? Дзе? Калі?»:

— Так, памятаю. Пачынаў я вучыцца ў Цалінаградскай школе № 2 (цяпер гэта цудоўны горад Астана), а першую настаўніцу звалі Дзіна Іванаўна. Якой яна была? Як усе першыя настаўніцы — самай лепшай! Увогуле за жыццё я змяніў некалькі школ, і паўсюль былі выдатныя настаўнікі. Але асаблівы паклон і пашану хачу выказаць той настаўніцы, якая накіравала, пацягнула мяне за сабой, дзякуючы якой я і сам стаў педагогам. Я прыйшоў у школу працаваць следам за ёй, а потым, калі служыў у арміі, яна ўзяла мой клас і падмяняла мяне... Гэта Клара Аляксееўна Булкіна — цяпер яна, праўда, ужо на пенсіі, жыве ў Пецярбургу, але ўсё адно я яе вельмі люблю, помню, і дай ёй Бог здароўя і шчасця.

Святлана СТАЦЭНКА, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычных мастацтваў імя Ул. Мулявіна:

— Менавіта першага настаўніка ці настаўніцу назваць не змагу. Прычына ў тым, што пасля дзіцячага садка мяне забралі ў Мінск у школу-інтэрнат для адораных дзяцей — цяпер гэта школа імя Ахрэмчыка. Прадметаў і выкладчыкаў у нас адразу з'явілася вельмі многа — сальфеджыа, скрыпка, потым дадалася арфа... Я добра памятаю выкладчыка па сальфеджыа Іосіфа Барысавіча, нашу выхавацельку Ядзвігу Іванаўну. Але асобна я тады кагосьці не вылучала. Тым больш, як «хатняе» дзіця, усё ніяк не магла прызвычаіцца да рэжыму школы-інтэрната. Агульнаадукацыйныя прадметы даваліся мне даволі дрэнна, да таго ж было слабае здароўе, і ў 5-м класе мама забрала мяне дадому. Вось з таго часу памятаю выкладчыкаў ужо больш выразна. Асаблівую ўдзячнасць адчуваю да нашага класнага кіраўніка, якая выкладала англійскую мову, Раісы Дзмітрыеўны Каркошкі. Яна і цяпер працуе, ужо дырэктарам школы ў Мазыры.

Віктар ІЎЧАНКАЎ, дарадца міністра адукацыі па сувязях са СМІ і грамадскасцю:

— Памятаю, натуральна. Гэта Надзея Пятроўна Бурда. Я вельмі ёй удзячны за ўсе атрыманыя ўрокі. І праз усё жыццё, калі трэба прымаць важныя рашэнні, думаю: як бы мне параіла зрабіць Надзея Пятроўна. Яна цяпер на пенсіі, жыве ў вёсцы Хадынічы Кобрынскага раёна, і на ўсе юбілейныя даты, калі мы сустракаемся ў школе, абавязкова запрашаем яе, сустракаемся з вялікім задавальненнем. Карыстаючыся такім выпадкам, хачу павіншаваць яе з Днём настаўніка, пажадаць моцнага здароўя, дабрабыту, і каб яна заўжды магла ганарыцца сваімі вучнямі!

БАТЭ САСТУПІЎ ЛІВЕРПУЛЬЦАМ

У другім туры групавога турніру Лігі Еўропы барысаўскі БАТЭ саступіў ліверпульскаму «Эвертану» з лікам 1:2. Паядынак наведалі каля 30 тысяч балельшчыкаў, сярод іх каля тысячы англічан. Паводле паведамленняў ГУУС Мінгарвыканкама, заўзятары паводзілі сябе законапаслухмяна, праўда, амаль усе англічане на футбол прыйшлі нападпітку, і іх давялося даглядаць у спецыяльнай палатцы.

Галоўны трэнер барысаўчан Віктар Ганчарэнка назваў гульню з англічанамі самым вялікім сваім расчараваннем у еўракубках. І сапраўды, удар Дзмітрыя Ліхтаровіча па варотах ужо на 16-й хвіліне ў першым тайме быў выніковым, затое ў другой палове гульні, калі БАТЭ цалкам кантраляваў гульню, барысаўчане прапусцілі двойчы. «Нас папросту задушыла імя «Эвертана». Мы баяліся выйграць. Мы цалкам кантралявалі гульню і прапусцілі пасля двух паўмомантаў супернікa», — заявіў Віктар Ганчарэнка.

Капітан беларускага клуба і аўтар гола ў вароты «Эвертана» **Дзмітрый Ліхтаровіч** таксама падзяліўся меркаваннем пасля матчу: «Па гульні мы былі мацнейшымі. З-за чаго прайгралі? Магчыма, з-за страты канцэнтрацыі. У футболе такое бывае — валодаеш перавагай, але прайграеш. Гэта той выпадак. Але лепш было б наадварот. Трыбуны выдатна нас падтрымлівалі».

Пракаментаваў матч і **старшыня праўлення барысаўскага клуба Анатоль КАПСКІ:**

— Я лічу, што ў гэтай гульні мы заслугоўвалі больш, чым ліку 1:2.

— Віктар Міхайлавіч Ганчарэнка назваў гульню самым вялікім расчараваннем. У вас такія ж пачуцці?

— Мы былі вартыя лепшага выніку. За выключэннем нейкага адрэзку ў першым тайме — ён здарыўся, калі забілі гол і страцілі канцэнтрацыю, — мы дамінавалі. Другі тайм увогуле правялі здорава, кантралявалі мяч. Магчыма, не так шмат момантаў стварылі. У асноўным вялі гульню ў зоне «Эвертана», і атрымалася незразумелая атака, хвілінная расслабленне, хуткі адбор, штрафны — і гол. У тым моманце, калі ляціць так доўга перадача, і варатару трэба было выйсці на дапамогу. Многія хлопцы, якія прыходзяць у БАТЭ, не зусім усведамляюць, што ім выпадае такое шчасце гуляць у сур'ёзных турнірах еўрапейскага ўзроўню. Самае цікавае, што часта яны слухаюць не трэнера, а сваіх агентаў. Ім яшчэ трэба вучыцца і вучыцца, і толькі потым яны стануць гульцамі добрага ўзроўню. Я ўжо ведаю, што пачнецца гэтай зімой — зноў аповеды агентаў, якія яны добрыя футбалісты, і размовы пра пераходы ў іншыя каманды. Таму крыўдна і трэнерам, і мне. Яшчэ многаму трэба вучыцца.

— Вам не крыўдна, што сёння на «Дынама» не было аншлагу?

— Напэўна, гэта дзесьці і нашы маркетынгавыя памылкі. Аншлаг быў на тых трыбунах, дзе былі білеты недарагія. І давайце не будзем забываць, што зараз іншы час — даходы насельніцтва крыху ўпалі. З іншага боку, тыя, хто прыйшоў, выдатна падтрымалі каманду. Кошт білетаў на матчы загадзя дэкларуецца УЕФА. На «Эвертан» самыя дарагія білеты былі па 40 тысяч, а на два астатнія матчы яны будуць таннейшымі — па 30 тысяч. Згодны, што дзесьці не ўгадалі з цэнамі.

— Перад гульнёй вас доўга не прапускалі на стадыён. Вы дагэтуль не сталі пазнавальным чалавекам?

— Службы бяспекі працуюць якасна, праўда, згодна з іх разуменнем. З іншага боку, не зусім якасна, мабыць, прайшла нарада праваахоўнікаў, калі людзі, якія адказваюць за пропуск балельшчыкаў і запрошаных, не могуць ідэнтыфікаваць тыя білеты і запрашальныя, якія ім раздаюць. У мяне быў пропуск у цэнтральную ложу, але мне сказалі, што гэта не пропуск — тут павінен быць надпіс «VIP»...

— Яны не зразумелі, што перад імі Капскі?

— Я думаю, што не. Мяне больш у гэтай сітуацыі хвалявала, каб такое не адбылося з балельшчыкамі і іншымі запрошанымі. Не ўсе ў нас умеюць добра працаваць...

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Небяспека

СМЕРЦЬ У КУКУРУЗЕ

Не першае трагічнае здарэнне, калі пад камбайнам для ўборкі кукурузы гіне чалавек, зарэгістраванае ў рэспубліцы: на гэты раз бяда адбылася ў Салігорскім раёне.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, трагедыя здарылася а палове адзінаццатай на полі паблізу вёскі Заўшыцы. Механізатар, кіруючы камбайнам, не заўважыў у зарасніку кукурузы вяскоўца са Шчыткавічаў Старадарожскага раёна. 45-гадовы мужчына, на якога наехаў камбайн, загінуў.

Ігар ГРЫШЫН.

НАЖОМ У СЭРЦА

У Пінскую гарбальніцу быў дастаўлены 25-гадовы хлопец з параненым сэрцам.

Удар нажом нанесла яму 20-гадовая прадаўшчыца, з якой ён знаходзіўся у аўтамашыне.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

НАСТОЯЩИМ ИЗВЕЩАЕМ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ТЕХНОБАНК» В ОЧНОЙ ФОРМЕ

Дата проведения: 08 октября 2009 года.

Место проведения (адрес):
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», II этаж.

Регистрация участников Общества для участия в собрании: с 10.00 до 10.30 по месту проведения собрания.

Время проведения заседания: с 10.30 до 11.00.

Повестка дня Общего собрания акционеров:

1. Об осуществлении выплат.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), документ, подтверждающий полномочия руководителя, и печать (для юридических лиц)!!!

Дополнительно уведомляем о принятии внеочередным Общим собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 29 сентября 2009 года (Протокол № 4), решения о внесении изменений в устав ОАО «Технобанк» и о Вашем праве требовать выкуп акций, если это явилось следствием ограничения прав акционеров.

Подача акционерами ОАО «Технобанк» заявлений с требованиями о выкупе акций осуществляется в ОАО «Технобанк» в течение 20 рабочих дней с даты проведения Общего собрания акционеров (29.09.09). Требования о выкупе акций (либо уведомление об отказе от выкупа) удовлетворяются ОАО «Технобанк» в течение 30 рабочих дней с даты подачи заявления с требованием о выкупе акций.

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г., УНП 100706562.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ РАЗМЕЩЕНИЯ ОБЪЕКТА СТРОИТЕЛЬСТВА

Аукцион состоится 3 ноября 2009 г. в 11.00 в г. Минске по ул. Чкалова, 5, к. 320.
Организатор аукциона: фонд «Минскоблгосимущество», 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. 5004710, 2243976
Арендодатель земельного участка: Борисовский районный исполнительный комитет, 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6

Предмет аукциона, целевое назначение, адрес, кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена продажи права аренды, руб.	Размер задатка, руб.
Земельный участок для строительства транспортно-логистического центра, расположенный по адресу: Минская область, Борисовский район, Неманицкий с/с, д. Ланковщина на 449 км участка автомобильной дороги М-1/Е30 и 60 км участка автомобильной дороги Р-53. Кадастровый номер: 620800000001000698	30,00	51	57 774 717	5 000 000

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт площадью 0,4620 га и охранная зона линии связи и радиофикации площадью 0,1648 га. Подъезд к земельному участку будет осуществляться по существующей дорожной сети. Для инженерного обеспечения возможно использование существующей сети.

Условия для победителя аукциона, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:

внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

возместить расходы, связанные с проведением аукциона (в сумме 835 тыс. рублей) и формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе государственной регистрацией изменения земельного участка республиканского унитарного сельскохозяйственного производственного предприятия «Свинокомплекс Борисовский» и в отношении создания земельного участка (в сумме 1 177 тыс. рублей);

возместить в установленном порядке убытки в сумме 73 659 820 рублей, причиненные республиканскому унитарному сельскохозяйственному производственному предприятию «Свинокомплекс Борисовский» изъятием земельного участка;

возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 1 193 455 200 рублей, вызванное изъятием 30,00 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту регистрации в качестве плательщика;

заключить с Борисовским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в установленном порядке государственную регистрацию права на этот участок;

в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка;

в месячный срок после государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в Борисовском райисполкоме архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства и о разрешении проектирования этого объекта;

разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

приступить к строительству объекта после утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ;

снять перед началом строительства на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Минским облисполкомом.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Если победитель аукциона в день проведения аукциона не подписал протокол, результаты аукциона по решению комиссии или организации в отношении этого победителя аннулируются. При этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона. Борисовский райисполком имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Возможность ознакомления с земельным участком обеспечивает арендодатель земельного участка в срок до 30 октября 2009 г.

Внесение **задатка для участия в аукционе** производится путем перечисления на текущий (расчетный) счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686. Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.**

Последний день внесения задатка и подачи заявок **30 октября 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников 30 октября 2009 г. с 10.00 до 10.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Продавец: Лидский районный исполнительный комитет

Адрес земельного участка, кадастровый номер	г. Лида, ул. Космонавтов, У-684236501000070007 95	г. Лида, ул. Свердлова, У-694236501000050008 44	г. Лида, ул. Строителей, У-704236501000030009 68
Целевое назначение земельного участка	Для строительства торгово-развлекательного центра	Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием	Для строительства магазина продовольственных и промышленных товаров с кафетерием
Срок аренды земельного участка	50 лет	50 лет	50 лет
Площадь, га	0,3037	0,2024	0,2616
Форма участка	Неправильной формы	Четырехугольная	Четырехугольная
Рельеф участка	Равнинный	Равнинный	Равнинный
Расположение участка	Земельный участок расположен в центральной части города	Земельный участок расположен в северо-восточной части города	Земельный участок расположен в северо-западной части города
Расположение участка в массиве застройки	угловой	угловой	угловой
Транспортная доступность	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта (по ул. Космонавтов автобус № 4) приблизительно составляет 300 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта (по ул. Свердлова автобус № 3) приблизительно составляет 100 м	Расстояние до ближайшей остановки городского транспорта (по ул. Строителей автобус № 7) приблизительно составляет 10 м
Инженерная инфраструктура	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество (строительство закрытой трансформаторной подстанции), тепловые сети, водопровод, канализация (в существующую самотечную канализационную сеть) с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод, канализация (существующий самотечный канализационный коллектор) с условиями	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газ, водопровод с условиями
Экологическое состояние	Экологическое состояние данного района благоприятное		
Наименование ограничений в праве	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0059 га в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,0045 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0079 га в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений	Ограничение права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0035 га в охранных зонах линий электропередачи	Ограничений права в пользовании частью земельного участка площадью 0,0250 га в охранных зонах линий электропередачи
Начальная цена предмета аукциона, руб.	40 474 788	9 849 540	10 249 871
Задаток, руб.	4 047 480	984 950	1 024 990
Условия для победителя аукциона	- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; - возместить расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ (по факту); - заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок; - получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 (два) года; - приступить к строительству объекта после разработки и утверждения в установленном порядке строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - приступить к занятию земельного участка после осуществления государственной регистрации права аренды на него; - по истечении срока аренды земельного участка совместно с Лидским районным исполнительным комитетом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования.		
	- возместить потери сельскохозяйственного производства, связанные с изъятием земельного участка площадью 0,1705 га пахотных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, в сумме 5 195 140 руб.; - возместить затраты на проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 899 647 руб.; - возместить затраты за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 112 000 руб.	- возместить потери сельскохозяйственного производства, связанные с изъятием земельного участка площадью 0,2024 га пахотных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, в сумме 6 762 960 руб.; - возместить затраты на проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 724 808 руб.; - возмещение затрат за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 98 000 руб.	- произвести благоустройство прилегающей остановки автобуса № 7 по ул. Строителей или в случае необходимости произвести перенос ее на другое место с проведением работ по благоустройству; - возместить затраты на проектно-изыскательские работы по формированию земельного участка на право заключения договора аренды в сумме 567 682 руб.; - возмещение затрат за государственную регистрацию создания земельного участка и права собственности в сумме 98 000 руб.

Аукцион состоится 10 ноября 2009 года в 12.00 по адресу: г. Лида, ул. Советская, 8.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляют в комиссию по организации и проведению аукционов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на счет 3642261280034 в ф-ле 413 АСБ «Беларусбанк» г. Лида код 696, получатель Лидский райисполком, УНП 500826128.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Условием проведения аукциона является наличие не менее двух участников.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка оплатить стоимость предмета аукциона и дополнительных условий.

Если победитель аукциона в день проведения аукциона не подписал протокол, результаты аукциона по решению комиссии в отношении этого победителя аннулируются. При этом внесенный победителем задаток возврату не подлежит.

Порядок проведения аукционных торгов определяется Положением о порядке организации и проведения аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 462 от 26 марта 2008 г. «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667».

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Лида, ул. Советская, 8, каб. 53 с 9.00 до

Краіна здароўя

Выпуск
№ 40 (154)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прафілактыка

Калі ў доме ёсць астматык...

Доля алергічнай астмы складае прыкладна 1/3 ад агульнай колькасці захворванняў. Як правіла, яна бярэ пачатак у дзіцячым узросце і суправаджаецца алергічнымі рэакцыямі з боку носа, вачэй, скуры.

— Яркай рысай алергічнай астмы з'яўляецца выразная залежнасць абвастрэння і кантакту з алергенам, — кажа доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры паліклінічнай педыятрыі БелМАПА Уладзімір Жарнасек. — Сімптомы хваробы адразу знікаюць пры адсутнасці кантакту з алергенам. Таму найважнейшая прафілактычная мера ў лячэнні алергічнай астмы — стварэнне такіх умоў, якія б звялі кантакты з алергенам да мінімуму. Захаванне пэўных мераў абароны ад алергенаў дапаможа ў некаторых выпадках увогуле пазбавіцца ад праяў астмы, у іншых — знізіць колькасць лекаў і іх дозы.

Каб у астматыка ўласны дом не выклікаў новых прыступаў і яму дыхалася лягчэй, трэба рэгулярна праводзіць генеральную прыборку. Гэта дапаможа знішчыць усемагчымыя прычыны астматычных прыступаў (пыл, плесню, вільгаць, пылавыя кляшчы, пух і поўсць жывёл).

ПАСЦЕЛЬНЫЯ РЭЧЫ

⇦ Замяніце падушкі і матрацы з пуху і пер'я, а таксама коўдры з шэрсці і ваты на сінтэтычныя. Калі няма магчымасці ўсё гэта памяняць адразу, то пачынайце хоць бы з падушак.

⇦ Пасцельную бялізну трэба мяняць раз у тыдзень і мыць пры тэмпературы 60° і вышэй, толькі ў гэтым выпадку яна будзе бяспечнай для астматыка.

⇦ Коўдры, падушкі і пакрывалы мыць трэба раз у месяц.

ЗМЕНШЫЦЕ КОЛЬКАСЦЬ МЕСЦАЎ НАЗАПАШВАННЯ ПЫЛУ

⇦ Прыміце з падлогі і са сцен мехавыя шкуры і дываны і замяніце іх на цыноўкі.

⇦ Здыміце з вокнаў начныя шторы і гардзіны з цяжкіх тканін і па магчымасці замяніце іх на жалюзі ці фіранкі з сінтэтычнай тканіны, якая лёгка мыецца, бо іх трэба здымаць і мыць не радзей як адзін раз у два тыдні ў гарачай вадзе.

⇦ Мэблю з абіўкай з тканіны пажадана паступова замяніць на пластыкавую ці драўляную. Але, калі вы вырашылі пакінуць ранейшую мэблю з абіўкай з тканіны, то чысціце яе вільготнай шчоткай не радзей як два разы на тыдзень.

⇦ Сувеніры, кнігі і часопісы захоўвайце ў зачыненых шафах на зашклёных паліцах.

⇦ Калі ў доме ёсць мяккія цацкі, то абавязкова мыйце іх раз на тыдзень у гарачай вадзе.

⇦ Не пускайце хатніх жывёл у пакой, у якім спіце, нават у тым выпадку, калі ў вас няма на іх алергіі.

⇦ Па магчымасці замяніце тканінныя абажуры на люстрах і таршэрах на вінілавыя. Вінілавыя абажуры мыйце раз у два тыдні, а тканінныя штотыднёва.

⇦ Рабіце прыборку ў цяжкадаступных месцах, да іх можна аднесці люстры, столь, карнізы, батарэі і верхнія паліцы шафаў.

ПРЫБОРКА

⇦ Вільготную прыборку ў доме варта рабіць штодзённа.

⇦ Прыборку з дапамогай пыласоса пажадана рабіць штодзённа, але не радзей як 2—3 разы на тыдзень. Сам астматык пыласосіць дом павінен у рэспіратары ці даверыць гэту працу іншаму члену сям'і, бо пыласос падымае ў паветра вялікую колькасць мікраскапічных часцінак пылу.

⇦ Для выціркання пылу карыстайцеся аднаразовымі анучамі, брудную анучу замяніце на чыстую, так вы сапраўды будзеце выдаляць пыл з дома, а не пераносіць яго з аднаго месца на другое.

⇦ Два разы на год хларазмяшчальнымі сродкамі мыйце плітку і міжплітачныя швы ў ваннай і на кухні.

АЧЫСТКА ПАВЕТРА

⇦ Спальню трэба праветрываць пры любым надвор'і 5—10 хвілін раніцай і перад сном.

⇦ Пасадзіце на падваконнік расліны, якія не цвітуць, і рэгулярна іх палівайце і апырсквайце.

⇦ Завядзіце рыбак у пакоі, бо там, дзе стаіць акварыум, паветра ніколі не будзе сухім, або купіце маленькі дэкаратыўны фантанчык. А калі дазваляюць сродкі, то лепш купіць электрычны ўвільгатняльнік паветра.

Вольга ШАЎКО.

ПЕРШАЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Па чутках і аўтарытэтна

РАНІШНЯЯ ГІМНАСТЫКА І ПЛАВАННЕ — ШКОДНЫЯ?

Прынамсі, так сцвярджаецца ў некаторых СМІ. Маўляў жывёлы ніколі не займаюцца зарадкай, а плаванне — амаль 100-працэнтна дае хранічнае запаленне нырак... Мы вырашылі разабрацца.

Калі з сённяшняга дня вы вырашылі наладзіць актыўнае, фізічна нагружанае, жыццё — заняцца сваім здароўем з дапамогай фізкультуры і спорту, не спяшайцеся нагінацца для нізкага старту. Фізічная актыўнасць патрабуе асаблівага да сябе стаўлення. Не «бярыцеся» за рух без уліку шматлікіх нюансаў, праясніць якія дапаможа кансультацыя спецыяліста, напрыклад, урача-рэабілітолага, які ёсць цяпер у кожнай паліклініцы. А некаторыя агульныя рэкамендацыі дае **інструктар-метадыст фізічнай рэабілітацыі аддзялення лячэбнай фізкультуры Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Людміла ШЧУРКО.**

1. ПАЦЯГВАННІ. Для раніцы ёсць цудоўныя практыкаванні на ўмацаванне і размінанне мышцаў. Яны добра танізуюць, дапамагаюць прачнуцца і ўзняць настрой. Фактычна такая размінка падыходзіць усім і кожнаму, незалежна ад узросту.

2. БЕГ. Што датычыцца больш інтэнсіўнай нагрузкі, напрыклад, ранішняй прабежкі, то тут усё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў бегуна. Важны ўзрост, стан здароўя (наяўнасць пэўных захворванняў) і фізічная падрыхтоўка. Той, хто толькі збіраецца далучыцца да падобнага занятку, павінен гэта ўлічваць. І мець на ўвазе, што з сур'ёзнай прабежкі ніхто не пачынае. Варта трымацца прыблізнай схемы: хада — хуткая хада — бег трушком — хуткі бег. Тое ж і з адлегласцю, якая павінна павялічвацца паступова.

3. ВІСЕННЕ. «Віс» добры пры сідзячай працы. Аднак агульнай рэкамендацыі тут таксама не можа быць. Пры вялікіх грыжах пазваночніка, некаторых скаліёзах, астэахандрозах, пасля аперацый на пазваночніку такія расцягванні могуць быць зусім не карыснымі. Іншая рэч, калі ў вас — здаровы пазваночнік, і вы добра сябе адчуваеце пасля вісення. Тады можна чакаць карысці і для суставаў у цэлым. Хоць яшчэ лепш — спецыяльная гімнастыка на расцягванне, вельмі папулярная, дарэчы, у тым жа Кітаі. Адпаведныя практыкаванні можна выконваць у любым узросце без магчымых непрыемных наступстваў.

4. ПЛАВАННЕ. Басейн рэкамендаваны фактычна ўсім. За рэдкім выключэннем (гэта, напрыклад, асобы са скуранымі захворваннямі, хворыя на эпілепсію). Сярэдняя тэмпература вады ў басейне — 20—25 градусаў, а ў басейне нашай бальніцы — 30, што з'яўляецца аптымальнай тэмпературай для таго, каб атрымаць карысць ад плавання. Замерзнуць і прастудзіцца ці атрымаць абвастрэнне якога-небудзь хранічнага захворвання можна, хіба, у тым выпадку, калі вы будзеце проста стаяць у вадзе. Аднак звычайна людзі ў басейне размінаюцца, плаваюць, займаюцца аэробікай — актыўна рухаюцца, што дазваляе не толькі не захварэць, але і ўмацаваць здароўе.

Здараецца, чалавек захапляецца фізкультурай месяц, два ці нават паўгода, а потым цалкам закідвае гэты занятак. Усё таму, што не быў вытрыманы прынцып паступовасці. Пераходзіць да новага ладу жыцця трэба размерана, нагрузкі павялічваць павольна. Фізкультура павінна ўвайсці ў ваша жыццё натуральным чынам. Інакш надоўга вас не хопіць.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Жаночыя сакрэты

ДЫРЫЖОРЫ ЖЫЦЦЯ

Вы думаеце, што ўсё ў жыцці вырашаеце самі? Памыляецеся! Большая частка нашых учынкаў прадыктаваная... гармонамі!

СЭР ТЭСТАСТЭРОН

Усё, што ўваходзіць у мілае жаночаму сэрцу паняцце «мужнасць», вызначаецца тэстастэронам. Палавую цягу, самаўпэўненасць, агрэсіўнасць і нават уменне арыентавацца ў прасторы дае моцнай палове чалавецтва гэты гармон. Маецца ён і ў жанчын, толькі ў значна меншай колькасці. У норме тэстастэрон (яго называюць гармонам сэксуальнасці) забяспечвае наша нармальнае палавое функцыянаванне. Лішак яго можа выклікаць розныя праблемы: напрыклад, рост валасоў па мужчынскім тыпе: над верхняй губой, па лініі жывата, на сцёгнах і нават на грудзях. Таму лепш тэстастэрон трымаць «у цуглях». Мужчынскі гармон як-ніяк!

ВАШ НАДЗЕЙНЫ ПАМАГАТЫ

У супрацьвагу тэстастэрону эстраген адказвае за ўсё жаночае, што ў нас ёсць. Галоўная яго задача — забяспечыць прадаўжэнне рода, а таму ён даруе нам жаночыя формы, рыхтуе да палавога жыцця і надзяляе мацярынскім інстынктам. Адсюль адвечнае жаночае імкненне навесці парадак і аб кім-небудзь клапаціцца. Эстраген прыносіць мір у жаночую душу, здымаючы напружанне і падаўляючы агрэсію. А яшчэ ён садзейнічае накапленню тлушчу ў пэўных жаночых месцах, гэта значыць у тых самых, дзе яго цяжэй за ўсё вывесці, — у вобласці жывата і сцёгнаў. Па задуме прыроды, у выпадку голаду гэтыя «запасы» павінны дапамагчы нам вынасіць нашчадкаў. Але ўжо лепш так, чым пры дэфіцыце эстрагенаў! Тут вам і вялая скура, і маршчыны, і цьмяныя валасы, і ломкія пазногці. І гэта яшчэ не ўсё: патлівасць, раздражняльнасць, бяссонніца, астэапароз, сардэчныя хваробы — вось ад чаго нас засцерагае жаночы гармон! Але з іншага боку, «перабор» эстрагену вядзе да бясплоднасці, парушэння менструацыі, фарміравання пухлін палавых органаў. Таму стаўцеся да яго з павагай і праварайце, як ідуць справы з вашым памагатым. Тады ваш арганізм прыйдзе ў абсалютную гармонію з самім сабой і з навакольным светам!

«ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ»

У 1990 годзе з лёгкай рукі доктара Дэніэля Рудмана гармон росту пачалі лічыць сапраўдным «эліксірам маладосці». Усе паддоследныя добраахвотнікі, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце, «скінулі» па меншай меры 20 гадоў. Пазбавіліся ад тлушчу, у некаторых нават разгладзіліся маршчыны і аднавіўся колер валасоў. Праўда, пасля спынення прыёму гармону ўсё вярнулася на кругі свае... На жаль, з гадамі мы страчваем гэты каштоўны гармон. Але затармазіць натуральны працэс магчыма. На карысць гармону росту ідуць паўнавартасны сон, фізічныя практыкаванні і рацыянальнае харчаванне. Пратрымацца на гэтым «рэцэпце» можна вельмі доўга, магчыма, да тых самых часоў, пакуль вучоныя не прыйдуць да агульнай думкі наконт дазіроўкі прэпаратаў «росту». Пакуль жа даследаванні паказваюць, што як недабор, так і перабор гармону росту вядзе да аднолькава сумных наступстваў.

Фота Пятра ФАМІНА.

ГАРМОНЫ ШЧАСЦЯ

За тое, што вы любіце больш за ўсё на свеце, адказваюць «гармоны задавальнення». Менавіта яны вызначаюць нашы густы і прыхільнасці. «Веснікаў шчасця» называюць эндарфінамі. Калі ў вас іх у дастатку, можаце лічыць сябе шчаслівай. Павышаны жыццёвы тонус, стабільна добры настрой, уменне радавацца жыццю забяспечаць вам і моцнае здароўе, і добры імунітэт, і важкую стрэсаўстойлівасць. Пры недахопе «гармонаў шчасця» могуць назірацца нуда, апатыя, стойкае жаданне хоць неяк стымуляваць выпрацоўку гармону, якога нестае. Аднак будзьце пільнымі! «Падсесці» на эндарфіны вельмі лёгка. Звычка «заядаць стрэс» — слушнае таму пацвярджэнне. Да хуткіх спосабаў «дагнаць задавальненне» адносяць таксама наркаманію і алкагалізм.

УСЕ НА ПОШУКІ АДРЭНАЛІНУ!

Пэўна вы ведаеце: каб атрымаць адрэналін, за ім трэба актыўна пабегаць у пошуках вострых адчуванняў. Усё правільна — гэты гармон дастаўся нам у спадчыну ад продкаў, якім даводзілася добра папацець, каб сярод брантазаўраў і мамантаў адстаяць сваё права на жыццё. У хвіліны небяспекі адрэналін выходзіць на арэну і «разрульвае» сітуацыю. Пад яго кіраўніцтвам сасуды ўнутраных органаў звужаюцца (не да іх цяпер), а сасуды, якія забяспечваюць крывёю мышцы, наадварот, расшыраюцца (магчыма, давядзецца біцца). Прыгнятаецца дзейнасць страўнікава-кішачнага тракта, затое ўзмацняецца работа мозгу і бронхаў. Увогуле, арганізм настройваецца на выжыванне, стымулюючы адны органы і саджаючы «на галодны паёк» іншыя. Каб прывесці ўсё зноў у норму, трэба апраўдаць чаканні арганізма і парухацца. Калі ж вы лічыце за лепшае стрэс перасядзець, «нявыкарыстаны рэзерв» абернецца супраць вас. Таму калі на гарызонце няма падыходнага «маманта», значыць, яго трэба прыдумаць!

Лечымся без лекаў

СВЯТАЯННІК — АД 99 ХВАРОБАЎ

Як без мукі не спячэш хлеба, так без святаянніку не вылечыш чалавека — сцвярджае народная прымаўка.

Яшчэ святаяннік (зверабой) завуць «Іванавай травой». Паводле легенды, упершыню жоўтыя кветкі выраслі там, дзе ўпалі кроплі крыві з адсечанай галавы Іаана Хрысціцеля. У даўніну святаянніку прыпісвалі чарадзейныя ўласцівасці. Гэту траву маці клалі ў дзіцячыя ложкі — каб малым сніліся толькі салодкія сны і каб яе бальзамічны пах засцерагаў іх ад страхаў. У хатах вешалі пучкі расліны — каб яна адганяла прывідаў і злых духаў.

Трава святаянніку ўтрымлівае дубільныя рэчывы, сапаніны, эфірны алей, вітаміны С, Е, карацін, флаваноіды, макра- і мікраэлементы (калій, магній, жалеза, малібдэн, селен) і іншыя біялагічна актыўныя рэчывы. Такі багаты хімічны склад расліны і абумоўлівае яе шырокае выкарыстанне.

Яшчэ Парацэльс прылічваў святаяннік да сваіх любімых раслін і называў яго «ўніверсальным сродкам». І меў рацыю. Гэту лекавую расліну выкарыстоўваюць пры лячэнні жоўцекамянёвай хваробы, захворванняў страўніка і кішэчніка, мачавога пухіра, лёгкіх, рэўматызму, жаночых хваробаў. Вонкава — пры хворых дзяснах, пролежнях, дэрматыце, гнайніках, апёках. Дзякуючы ўтрыманню рэдкага элемента малібдэну, які здольны затрымліваць у арганізме фтор, святаяннік можа перашкаджаць развіццю карыесу.

Святаяннік паляпшае апетыт, стымулюе сакраторную дзейнасць розных залозаў, у тым ліку стрававальных, добры як жаўцягонны сродак.

А не так даўно вучоныя адкрылі яшчэ адну выява змяненні назапашваюцца настолькі непрыкметна, што агульныя заканамернасці вывесці складана. З сучасных пазіцый герыятрыі, старэнне — гэта паступовае зніжэнне здольнасці арганізма чалавека адаптавацца.

У многім інтэнсіўнасць старэння залежыць ад прыроджаных генетычна дэтэрмінаваных уласцівасцяў тканак. Вядомыя сем'і, члены якіх выпрацоўваюць зайздросным доўгажыхарствам, прычым у іх не назіраюцца праблемы з памяццю, праблемы з псіхікай ці з фізічнай актыўнасцю. Яны жывуць да 90 гадоў і больш. І, наадварот, ёсць сем'і, члены якіх жывуць усяго 35—55 гадоў. Даказана, што працягласць жыцця чалавека напрамую залежыць ад прыроджанай актыўнасці ферменту супераксіддысмутазы (САД). На жаль, але актыўнасць гэтага ферменту не паддаецца рэгуляванню звонку, паколькі запраграмавана генетычна. Аднак на долю САД прыпадае толькі 70 працэнтаў работы па абясшкоджванні небяспечных кіслародных радыкалаў. А астатнія 30 працэнтаў — на так званыя антыаксіданты, узровень утрымання якіх можна рэгуляваць з дапамогай біялагічна актыўных прэпаратаў. Да іх адносяцца вітаміны Е, бэта-карацін, мікраэлементы цынк, селен і іншыя. Дадаючы гэтыя кампаненты ў нашу ежу, мы можам кантраляваць актыўнасць 1/3 свабоднарадыкальных працэсаў, якія лімітуюць хуткасць старэння нашага арганізма. Эксперыментальна даказана таксама сувязь паміж дэфіцытам у арганізме пажылога чалавека вітаміну В 12 і разумовай дэградацыяй.

У першую чаргу працэс старэння адбіваецца на сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэмах. Адкладванне халестэрыну ў сасудах у працэсе старэння прыводзіць да паступовага згасання паўнавартаснага сілкавання клетак розных органаў і тканак пажыўнымі рэчывамі і вывядзенню шлакаў з клетак. Работа органаў парушаецца: печань горш спраўляецца з ачышчэннем крыві ад водараспаральных таксінаў, што прыводзіць да з'яўлення пігментных старэчых плямаў на скуры. Ныркі недастаткова фільтруюць кроў, у выніку чаго ў крыві назапашваюцца мачавая кіслата, астаткавы азот і іншыя прамежкавыя прадукты абмену, павышаная канцэнтрацыя якіх пачынае тармазіць абменныя працэсы і прыгнятаць клетачнае дыханне. Да назапашвання шлакаў у арганізме вельмі адчувальная нервовая сістэма. У старых людзей з-за пагаршэння актыўнасці нервовых працэсаў у той ці іншай ступені зніжаюцца ініцыятыўнасць, працаздольнасць, увага, цяжэй становіцца пераключацца з аднаго віду дзейнасці на іншы, развіваецца эмацыянальная няўстойлівасць, парушаецца сон. Адбываюцца змяненні таксама і ў псіхіцы. Нярэдка ў пажылых людзей назіраецца пагаршэнне характару.

І ўсё ж, хоць старэнне арганізма і нельга адмяніць (хтосьці вельмі трапна сказаў, што старэнне — гэта хвароба са стапрацэнтным лятальным вынікам), аднак **можна паспрабаваць пераўтварыць 20—25-гадовы перыяд у прыгожы адрэзак жыццёвага шляху, поўны жыццёвай мудрасці, прысвечаны ўнукам, сямейным справам і...уласнаму хобі. Чым вы напоўніце гэтыя гады — залежыць ад вас.**

Першая і галоўная ўмова — не здавацца пасля выхаду на пенсію, развіваць свае духоўныя запыты і інтарэсы, мець любімы занятак, прысвяціць сябе таму, што дастаўляе сапраўднае задавальненне. Увогуле, чалавек, які займаўся інтэлектуальнай працай, павінен імкнуцца займацца ёй як мага далей, бо пастаянныя трэніроўкі інтэлектуальных здольнасцяў падтрымліваюць фізіялагічныя рэзервы арганізма. Даказана, што адукаваныя людзі старэюць пазней за людзей з невысокім адукацыйным узроўнем. Заўважана таксама, што тыя людзі, якія вымушаны пайсці з працы, якой яны прысвяцілі ўсё жыццё і не могуць знайсці ёй паўнавартасную замену, старэюць літаральна на вачах. Аптымізм — цудоўная крыніца стымуляцыі арганізма. Вельмі карысна ўплывае на ўсе фізіялагічныя працэсы арганізма смех, таму пажылым людзям асабліва рэкамендуецца прагляд «лёгкіх» і гумарыстычных перадач.

Японцы лічаць, што адданасць інтарэсам сям'і і пражыванне ў поўнай сям'і стрымліваюць старасць. Пры гэтым зусім неабавязкова пражываць з дзецьмі пад адным дахам пастаянна, але важна як мага часцей збірацца разам усёй сям'ёй.

Харчаванне пажылых людзей павінна будавацца з улікам узросту, фізічнай актыўнасці і стану здароўя, але агульныя патрабаванні — аднолькавыя для ўсіх. Яны ўключаюць у сябе ўмеранасць і разнастайнасць рацыёну, ўзбагачэнне харчавання антысклератычнымі прадуктамі (тварагом, морапрадуктамі), захаванне рэжыму харчавання, змяншэнне спажывання лёгка засваяльных вуглеводаў і колькасці жывёльных тлушчаў, абавязковае спажыванне малочных і кісламалочных прадуктаў, стварэнне антыаксідантнай скіраванасці рацыёну і спажыванне багатых на клятчатку прадуктаў. Агульная каларыйнасць харчавання ў пажылым узросце павінна быць невысокай — 2400—2600 калорый у суткі, але зніжаючы каларыйнасць, нельга дапускаць, каб арганізм пацярпеў ад недахопу бялкоў, вітамінаў і мінеральных соляў. Даказаны таксама карысныя ўласцівасці зялёнай гарбаты: у людзей, якія спажывалі яе ў вялікай колькасці, зніжалася заўчасная смяротнасць ад анкалагічных захворванняў.

Ніколі не позна ўзяцца і за сваю фізічную форму. Увогуле без фізічных нагрузак функцыянальныя рэзервы чалавека расходуюцца вельмі імкліва. І калі пры рэгулярных занятках спортам да 45 гадоў функцыянальныя рэзервы можна зноў пашырыць, то пазней у нашых сілах толькі падтрымліваць дасягнутыя раней паказчыкі, не даючы ім зніжацца. Увогуле, чым больш часу чалавек праводзіць у ложку, тым больш хуткімі тэмпамі ён рушыць да апошняй кропкі свайго існавання. Найбольш даступным відам фізічнай нагрузкі з'яўляецца хада: заняткі трэба пачынаць з невялікіх дыстанцый, папярэдне выканаўшы комплекс сагравальных практыкаванняў, тэмп хады павінен быць умераны і пры гэтым важна правільна дыхаць. Дыханне павінна быць спакойнае, раўнамернае, але пры гэтым з як мага больш глыбокім уздыхам, частата сардэчных скарачэнняў не павінна перавышаць 110—130 удараў у хвіліну. Акрамя хады магчымыя і такія віды трэніровак, як пад'ём і спуск па лесвіцы, тэніс, турызм, плаванне, веласіпед, танцы, але перад тым, як распачаць трэніравацца, неабходна пракансультавацца з урачом і атрымаць індывідуальныя рэкамендацыі. Для ўмацавання цела і стройнай постаці можна парэкамендаваць метад, заснаваны на методыцы псіхічнага мадэлявання: выходзячы на вуліцу на прагулку ці па нейкіх іншых справах, вы выпрамляеце спіну, узнімаеце грудзі і злёгку адкідваючы галаву, рушыцеся лёгкімі спакойнымі крокамі і паўтараеце пра сябе ў такт крокам: «Я малады, здаровы і моцны». Такі трэнінг паступова прывядзе арганізм у стан бадзёрасці і пазбавіць ад многіх сумных думак, уласцівых узросту.

Вельмі важная гімнастыка для людзей, якія церпяць ад рэўматызму. Калі суставы маларухомыя, яны падвяргаюцца цяжкай дэфармацыі, што паскарае іх «зношванне». Гэта можна папярэдзіць, калі больш рухацца, мэтанакіравана практыкаваць мышцы і суставы. Апошнім часам герантолагі ўсё часцей падкрэсліваюць, што гімнастыка і танцы больш патрэбныя пажылым людзям, чым маладым. Цудоўным стымулятарам з'яўляюцца масаж, а таксама расціранне жорсткім ручніком. Пачынаць гэтыя працэдуры трэба паступова, напрыклад, рухацца ад кісцяў рук да локцяў, затым да плячэй, але папярэдне трэба абавязкова параіцца з урачом, паколькі пры некаторых захворваннях гэта забаронена.

Крыніцай шчасця ў старасці становіцца сяброўства і чалавечая добразычлівасць. Рэцэпт іх набыць вельмі просты: трэба даваць, а не браць, прапаноўваць, а не патрабаваць. На жаль, але немаладыя людзі часта становяцца эгаістычнымі. Здараецца, што на першы план выходзяць толькі іх хваробы, якія засланяюць усё. Не трэба навязваць маладым свае погляды на жыццё і ўмешвацца пастаянна ў іх справы. Дарэчы, японцы лічаць, што адданасць інтарэсам сям'і і пражыванне ў поўнай сям'і стрымліваюць старасць. Пры гэтым зусім неабавязкова пражываць з дзецьмі пад адным дахам пастаянна, але вельмі важна адчуваць падтрымку сваякоў, важна як мага часцей збірацца разам усёй сям'ёй. А вось адзінота, наадварот, скарачае жыццё чалавека. Стасункі з сябрамі дзяцінства, інстытуцыямі сябрамі дапамагаюць адчуць сябе маладым, так што настальгія — цудоўны сродак псіхалагічнага амаладжэння. Карыстайцеся ім часцей! І напрыканцы парада ад псіхолагаў, якія сцвярджаюць, што панічны страх смерці адчуваюць толькі тыя людзі, якія практычна нічога не дабіліся ў жыцці. Яны запэўніваюць, што калі чалавек можа азірнуцца назад і з гонарам пералічыць некалькі сур'ёзных, на яго погляд, дасягненняў, такі чалавек становіцца да свайго старэння куды больш спакойна...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Заняткі кітайскай гімнастыкай у Доме ветэрэнаў

СТАРАСЦЬ — НЕ РАДАСЦЬ?

Многія з нас, чаго хаваць, вельмі баяцца старасці. Мы баімся адзіноты і змянення свайго сацыяльнага статусу, баімся хваробаў і сваёй бездапаможнасці, баімся страціць знешнюю прывабнасць, стаць нецікавымі ўласным дзецям і ўнукам.

Медыкі сцвярджаюць, што старэнне чалавека — гэта шматгранны, складаны і генетычна абумоўлены працэс. Папярэдзіць яго нельга, а вось затармазіць — цалкам рэальна. Чалавек становіцца старым і вельмі старым толькі ў тым выпадку, калі сам сабе гэта дазваляе: можна быць старым і ў 30—40 гадоў, а ў 90—100 гадоў — толькі пажылым. У кожнага з нас ёсць тры

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
Режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв с 13.00 до 14.00,
тел. 227 52 36, 226 03 01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, ул. Гаруна, д. 20, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район «Масюковщина». Микрорайон «Масюковщина-5» (2-я очередь). Жилой дом № 16А по генплану.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Здание жилого дома запроектировано из двух девятиэтажных секций. Количество жилых помещений жилого дома — 80. Серия дома — М 464-9-У1.

Начало строительства — сентябрь 2009 года.

Окончание строительства — май 2010 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:

- государственную экспертизу от 25.06.2009 № 1093-5/09.

Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 10.08.2009 г. № 500/962-1691.

Земельный участок площадью 0,62 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоявшими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Стоимость строительства 1 кв. метра жилых помещений в текущих ценах составляет 2 417 620 руб. — для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 2 647 865 руб. — для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 07.09.2009 № 10С-09-2009.

Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, 311 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор Е.И. Вовна

Абзац

◢ У вёсцы Аляксандраўка Буда-Кашалёўскага раёна малады мужчына трапіў пад колы аўтамабіля, седзячы на лаўцы. Жыхар Гомеля сядзеў на лаўцы ля свайго дачнага дома, калі пад'ехаў аўтамабіль ВАЗ-2108, якім кіраваў 23-гадовы жыхар Чачэрска. Разварочваючы машыну, гора-кіроўца ўмудрыўся наехаць на гамяльчаніна. Той ад атрыманых траўмаў памёр у бальніцы, узбуджана крымінальная справа.

◢ **У Прыморскім краі жыхар адной з памежных вёсак КНР наўмысна перасёк мяжу, каб папаляваць на мядзведзя. Але паляванне не ўдалося, затое ў лесе каля пасёлка Аўчыннікава кітаец сустрэўся з расійскімі памежнікамі і не прыдумаў нічога лепшага, як шпурнуць у іх самаробным кап'ём і кінуцца бегчы. Праз колькі хвілін яго затрымалі і абязброілі.**

Поўны абзац

◢ Адміністрацыя брытанскага горада Манчэстэр выпусціла ілюстраваны дапаможнік па палавым жыцці для людзей, старэйшых за 50 гадоў. У ім ёсць раздзелы «Пагаворым пра сэкс», «Парады па заляцанні», утрымліваецца інфармацыя пра інфекцыі, што перадаюцца палавым шляхам, і пра ўзроставыя змяненні як палавой сістэмы, так і знешнасці людзей. Ілюстравана выданне фотаздымкамі пажылых жыхароў Манчэстэра. Як паведамляе аўтарытэтнае выданне Telegarph, 47-старонкавая брашура была выдадзена не знянацку, а на падставе апытанняў сярод пажылых людзей, якія выказалі незадаволенасць адсутнасцю інфармацыі па палавым здароўі і інтымных стасунках для іх узроставай групы. Пытанне гэта тым больш актуальнае, што многія брытанцы пасля 50 гадоў становяцца адзінокімі і жадаюць зноў завязаць блізкія адносіны з прадстаўнікамі іншага полу.

◢ **Паміж Італіяй і Эстоніяй ледзьве не разгарэўся скандал з-за пачка пельменяў. Днямі Пасольства Італіі ў Эстоніі звярнулася ў Міністэрства замежных спраў са скаргай на вытворцаў пельменяў з назвай «Мафія». На ўпакоўцы прадукту, акрамя колераў італьянскага сцяга, прысутнічаюць карта Сіцыліі і пісталет, што, на думку дыпламатаў, з'яўляецца здзекам з італьянцаў і з усёй краіны. Прадстаўнікі кампаніі-вытворцы, якая праявіла «мафіёзна-пельменную» фантазію — фірмы Alissa Pluss з эстонскага горада Ida-Virumaa — сцвярджаюць, што гэта назва — проста жарт, і спадзяюцца, што фірме ўдасца дамовіцца з пасольствам. Дэпартамент абароны правоў спажыўцоў Эстоніі парэкамендаваў вытворцам змяніць назву пельменяў.**



Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

УДАР У НАГУ — І ЛЯТАЛЬНЫ ЗЫХОД

У інтэрнэце па вуліцы Леніна ў Баранавічах пасля сумеснай выпіўкі паскандалілі стрыечныя браты. Адзін з іх схапіў нож і ўдарыў другога ў нагу. Нож пашкодзіў артэрыю, і 30-гадовы мужчына памёр.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У Беларусі легальна прадаюць НАРКОТЫКІ?

28-гадовы Максім паспрабаваў курыцельную сумесь спайс, якая шырока прадаецца па ўсёй краіне праз інтэрнэт. І трапіў у псіхіятрычную клініку. Каля месяца ўрачы ўзнаўлялі псіхічнае здароўе Максіма.

Карэспандэнт «Звязды» высвятляў, чаму курыцельныя сумесі легальна прадаюцца ў Беларусі і хто зарабляе крывавыя грошы на здароўі нашай моладзі?

Называць спайс наркотыкам у Беларусі яшчэ не прынята. Сінтэтычнае рэчыва, якое інтэрнэт-гандляры называюць «арамаматычнай сумессю», завезлі да нас прыкладна год таму. У пералік псіхатропных рэчываў спайс не ўнесены. Вось чаму сумесь дагэтуль легальна прадаецца па ўсёй краіне, і сябры мінскага праграміста Максіма Сакалоўскага вырашылі паспрабаваць, што гэта такое. Той вечар ледзь не паламаў Максіму жыццё — у выніку хлопец трапіў у рэспубліканскі цэнтр псіхічнага здароўя. Пасля выпіскі ён пагадзіўся сустрэцца з карэспандэнтам «Звязды».

— З сябрамі паехалі на адну з базаў адпачынку пад Мінскам. Было гэта ў ліпені месяцы, — расцягнута і з тугой у голасе ўзгадвае Максім Сакалоўскі. — Нехта дастаў пакецік з так званым спайсам — давайце пакурым. Тады я ўпершыню даведаўся пра існаванне гэтай сумесі. Хлопцы выйшлі на балкон, зацягнуліся з люлькі. Прапанавалі мне: «Хочаш? Гэта нават не наркотык, легальна прадаецца праз інтэрнэт, як папяросы. Будзе кайфова». Па-праўдзе, не куру нават цыгарэтаў. Але я падумаў, чаму б не паспрабаваць, раз гэта дазволена. І таксама зацягнуўся...

Сумесь пачала «награбаць», спрабаваў трымаць сябе пад кантролем, выклікаў таксоўку і паехаў дадому. Галюцынацый быццам бы не было, але ў машыне пачаў «ганяць» думкі, нібыта маёй сям'і пагражае небяспека — жонцы, бацькам. Прыехаў дадому, лёг спаць. Вечарам наступнага дня пайшлі з жонкай на дзень народзінаў да сябра. І зноўку пачаліся трывогі, тыя ж думкі... Усе здзіўляліся: «Чаму ты такі зашуганы?» А я нічога не мог з сабой зрабіць, баяўся за жонку, за бацькоў. Вярнуліся дадому, выкінуў з кватэры ўсе нажы, зачыніўся ў ваннай...

На наступны дзень жонка не вытрымала і патэлефанавала ў «Хуткую». Мяне завезлі ў «Навінкі» (Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя. — **«Звязда»**), *дзе месяц прыводзілі ў норму, шпігавалі лекамі, а потым выпісалі. Урачы паставілі дыягназ — «псіхоз». Патлумачылі, што нейкіх сур'ёзных псіхічных адхіленняў у мяне няма. Так моцна з каляіны мяне выбіла тая самая курыцельная сумесь. Не разумею, чаму спайс дагэтуль адкрыта прадаецца?!*

НАРКАГАНДЛЯРЫ ВЫДАЮЦЬ СУМЕСЬ ЗА ЛЕГАЛЬНУЮ АРАМАТЫЧНУЮ ТРАЎКУ

Гісторыя Максіма — не адзінкавы выпадак. У Мінску дзейнічае нефармальнае антынаркатычнае аб'яднанне, удзельнікі якога паведамляюць міліцыі кантакты барыг (так на жаргоне называюць гандляроў наркотыкамі), вылічваюць нумары тэлефонаў наркагандляроў, даюць кансультацыі сваякам наркаманаў. **Нефармальны лідар аб'яднання Юрый КАРЭТНІКАЎ** патлумачыў карэспандэнту «Звязды», чаму небяспечныя сумесі маюць у Беларусі шалёную папулярнасць.

— Дакладна ведаю, што сярэдні барыга мае навар у 1500 долараў штодзённа. А ў суме наркагандляры маюць штодзённы прыбытак у 500 тысяч долараў, не менш.

— Праблема ў тым, што гандляры пускаюць людзям пыл у вочы, маўляў, спайс — гэта рамантычная трава, якую спрадвеку курылі індусы, кітайцы і іншыя ўсходнія народы. Насамрэч гэта сінтэтычнае рэчыва, якое ўздзейнічае на арганізм чалавека катастрафічна. Я сустракаўся з дзясяткамі чалавек, якія ўжывалі спайс і паспрабавалі кінуць. Але ў іх не атрымалася, трапілі ў жорсткую фізічную залежнасць. Яны не могуць выйсці з цяжкага дэпрэсіўнага стану, сустракаюць знаёмых, якія пад кайфам, і зноўку тэлефануюць кур'ерам. Бяда ў тым, што спайс па-ранейшаму адкрыта прадаюць дзясяткі інтэрнэт-сайтаў, кур'еры імгненна прывозяць наркотык у любы пункт Мінска. Візітоўкі з прапановай купіць спайс раздаюць на ўваходах у станцыі метро. Днямі такую ж візітоўку ля станцыі Плошча Якуба Коласа ўперлі мне. Спайсам масава гандлююць у клубах і нават у школах. Па нашых падліках гэты наркотык паспрабавала больш за 100 тысяч маладых людзей толькі ў Мінску. І гэта праз год пасля таго, як наркотык з'явіўся ў Беларусі...

Нават сёння, калі пра ўздзеянне спайсу ведаюць у праваахоўных органах, сумесь амаль беспярашкодна прадаецца ў інтэрнэце. Карэспандэнт «Звязды» налічыў каля чатырох дзясяткаў сайтаў, якія прадаюць спайс. «Хутка! Танна! З дастаўкай, — так заманьваюць наркагандляры пакупнікоў, апісваючы сумесі. — Насенне гэтай расліны знаходзілі ў каралеўскіх магілах у Юкатан і Перу пачынаючы з 300 года да нашай эры да 900 года нашай эры». Некаторым гатункам спайсу барыгі прыпісваюць тэрапеўтычныя якасці. Тэлефаную аднаму з наркагандляроў па мабільным тэлефоне:

— Ці прадаецца ў вас спайс?

— Так. Дастаўка па Мінску 15 хвілін. Грам каштуе 35 тысяч рублёў.

— Кажуць, што спайс — гэта наркотык.

— Не, усё легальна, можна прадаваць, паспрабуйце.

Не дзіўна, што многія маладзёны пасля такой «прамыўкі мазгоў» набываюць небяспечную курыцельную сумесь.

— А калі спайс прызнаюць наркотыкам, дзясяткі тысяч маладзёнаў не змогуць ад яго адмовіцца, — падсумоўвае Юрась Карэтнікаў. — Уявіце, колькі будзе паламаных лёсаў. Колькі падманутых барыгамі маладых людзей патрапяць за краты, згубяць здароўе. Бо сёння далёка не ўсе дзеці разумеюць, што купляючы спайс, яны ўжываюць каварны наркотык...

— Праблема ў тым, што гандляры пускаюць людзям пыл у вочы, маўляў, спайс — гэта рамантычная трава, якую спрадвеку курылі індусы, кітайцы і іншыя ўсходнія народы. Насамрэч гэта сінтэтычнае рэчыва, якое ўздзейнічае на арганізм чалавека катастрафічна.

У большасці еўрапейскіх краін спайс лічыцца наркотыкам, а гандлярам пагражае турма.

ЯКІЯ ГРОШЫ ЗАРАБЛЯЮЦЦА НА СПАЙСЕ?

За год, пакуль спайс легальна прадаецца ў Беларусі, барыгі зарабляюць на здароўі моладзі астранамічныя грошы.

— Аднойчы і я з жонкай вырашыў паспрабаваць спайс, дамовіліся сустрэцца з гандляром у сталічным раёне Кунцаўшчына, — распавядае бубнач аднаго з мінскіх рок-гуртоў Іван. — Гандляр, з выгляду 24—25 гадоў, прыехаў на новым «БМВ» сёмай серыі коштам каля 50 тысяч долараў. Па спайс да яго стаяла сапраўдная чарга, як у піўны шапік. Паспрабаваўшы гэтую гідоту адзін раз, мы больш гэтым не займаліся. Пазней я даведаўся, што многія гандляры за год збудавалі на спайсе катэджы ў сталіцы.

Лідар антынаркатычнага аб'яднання Юрый Карэтнікаў, паразмаўляўшы з такімі гандлярамі, таксама падлічыў іх прыкладны прыбытак:

— Дакладна ведаю, што сярэдні барыга мае навар у 1500 долараў штодзённа. А ў суме па сталіцы наркагандляры маюць штодзённы прыбытак у 500 тысяч долараў, не менш.

ЧАМУ СПАЙСАМ ГАНДЛЮЮЦЬ АМАЛЬ БЕСПЕРАШКОДНА?

Накіроўваюся ва **ўпраўленне па наркаканторлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама.** Сустракаюся з **супрацоўнікам Ігарам ЛУНЕВІЧАМ,** які непасрэдна займаецца праблемай распаўсюду спайсу. На стале ў міліцыянера тоўсты стос дакументаў і прышпіленыя да яго рознакаляровыя пакецікі ад спайсу. Ігар Луневіч тлумачыць, чаму міліцыянеры дагэтуль не могуць арыштоўваць гандляроў небяспечнымі курыцельнымі сумесямсі:

— За такое правапарушэнне прадугледжана толькі адміністрацыйнае пакаранне — незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць. Чалавек, які рэалізоўвае спайс, без праблем аплачвае штраф у 350 тысяч рублёў і ідзе гандляваць сумесямі зноў. Асобы, якіх мы затрымлівалі, давалі тлумачэнні: пазычаем у знаёмых тысячу рублёў, а потым аддаем. Ці ведаюць яны, што спайс — гэта наркотык? Ведаюць, але ім усё роўна. Ім галоўнае — заробіць грошы.

— Чаму гандляры пазбягаюць крымінальнай адказнасці?

— Мы ўжо не адзін месяц б'ём трывогу. Формула спайсу ўнесена ў праект рэспубліканскага пераліку псіхатропных рэчываў. Пэўны час мы чакалі, пакуль дакумент пройдзе праз усе інстанцыі. З першага студзеня наступнага года спайс будзе лічыцца наркотыкам, гандляры будуць адказваць па Крымінальным кодэксе. Усе аб'явы з інтэрнэта знікнуць, спайс, хутчэй за ўсё, будзе рэалізоўвацца падпольна, як і іншыя наркотыкі.

СУМЕСІ ПРАДАЮЦЦА Ў МІНСКІХ КРАМАХ?

Калі матэрыял рыхтаваўся да друку, у рэдакцыю «Звязды» патрапіў сігнал — курыцельная сумесь прадаецца у некаторых крамах. Чытачы сцвярджалі, што бачылі пакецікі з сумессю ў мікрараёне Уручча.

Калі я прыехаў у тую самую краму, каб праверыць інфармацыю, пакецікаў з сумессю на прылаўках не знайшоў. Але быў шакіраваны, калі на інтэрнэт-сайце крамы знайшоў тыя самыя курыцельныя сумесі з лінейкі спайс, пра якія паведамлялі чытачы. На сайце прапаноўвалася набыць сумесі з лінейкі спайс, а менавіта Smoke (5 тысяч пакецікаў коштам у 58 520 беларускіх рублёў кожны) і Jan Rush (10 тысяч пакецікаў коштам у 62 600 беларускіх рублёў кожны).

Напрошваецца пытанне, адкуль у краме сумесі, якія ўздзейнічаюць на арганізм чалавека цяжэй за марыхуану?

Імя героя матэрыяла зменена.

Яўген ВАЛОШЫН.

Мінскія гандляры спайсам нават не баяцца пакідаць свае нумары тэлефонаў у інтэрнэце.

ШТО ТАКОЕ КУРЫЦЕЛЬНЫЯ СУМЕСІ СПАЙС?

Курыцельныя сумесі з лінейкі спайс выклікаюць псіхалагічную і фізічную ломку. А па сваім уздзеянні яны ў разы мацнейшыя за марыхуану. Да такіх высноваў прыйшлі ва ўпраўленні па наркаканторлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама.

— Немцы першыя забілі трывогу ў пачатку гэтага года. У Заходняй Еўропе спайс некаторы час распаўсюджваўся як легальны заменнік марыхуаны. Немцы хутка прызналі спайс псіхатропным рэчывам, — распавядае карэспандэнту «Звязды» супрацоўнік упраўлення Ігар Луневіч. — У сумесях знайшлі штучныя хімічныя субстанцыі, уздзеянне якіх вельмі небяспечнае. Наркаманы на інтэрнэт-форумах пішуць, што спайс у дзесяць разоў мацнейшы за марыхуану. Вядомыя выпадкі, калі ў людзей наступала не толькі псіхалагічная залежнасць, але і фізічная.

Спайс — гэта агульная назва для шматлікіх курыцельных сумесяў, што завозяцца ў Беларусь. Назвы могуць быць наступныя: Spice, Smoke, Jan Rush, Pulse, Chillin і многія іншыя.

P.S. *Беларускае заканадаўства не гатовае да з'яўлення ў Беларусі сінтэтычных наркотыкаў кшталту спайс. І нават калі ўзгаданыя ў артыкуле сумесі будуць забароненыя, у наркалабараторыях распрацуюць рэчывы з новымі хімічнымі формуламі. І што, зноўку чакаць год, пакуль чарговыя формулы ўнясуць у пералік псіхатропных рэчываў? Тым часам не пабаюся сказаць, што беларуская моладзь у небяспецы. Неабходны самыя рашучыя меры. Бюракратычная цяганіна з уключэннем сумесяў у пералік псіхатропных рэчываў можа каштаваць тысячаў маладых беларускіх лёсаў.*

...«ЗЕЛЕНЬ» МАЕЦЦА Ў ЖАНЧЫН ДЫ НЕ РОЎНЯ ДОЛАРАМ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што было, — было, хоць і не ўчора, пры камуністах. Даішнікі, значыць, машыну ў Аўцюках спынілі. За рулём — мужык. Мякка кажучы, не цвярозы... Паўшчувалі яго, склалі акт, сказалі, каб на камісію заўтра прыехаў.

Той — само сабою — з'яўляецца. Бачыць — пад дзвярыма цэлы натоўп з такіх жа парушальнікаў; у кабінет іх па адным запускаюць. І выпускаюць праз нейкі час, прычым сумнымі-сумнымі, гаротнымі-гаротнымі, бо ў таго — на 24 месяцы правы забралі, у таго на ўсе 36...

Да аўцюка чарга падышла, і ён заходзіць.

— Ну расказвай, — загадвае міліцэйскі начальнік, — колькі выпіў, якога ражна за руль потым сеў?

А аўцюк — мужык прастадушны: ён нават жонцы ні разу не маніў! Вось і тут стаў праўды трымацца: так і так, маўляў, слесарам на стане працую, і ў нас там цешча ў аднаго памерла — трэба было памянуць. Выпілі ўпяцёх тры бутэлечкі. Праўда, першаку... Падалося, мала. Я ўсіх да крамы давёз — накацілі дзве «сямсоткі» віна. І ўжо спыніліся б... Але да нас ветэрынар далучыўся. Я яго потым дадому адвёз, ён паўлітроўку паставіў... А забралі мяне, калі ўжо дахаты вяртаўся.

— І як жа ты ехаў, як машыну вёў?! — жахнуўся хтосьці з камісіі.

— Як-як? Акуратненька!.. Хай во хлопцы вашыя скажуць.

Тыя — ад нечаканасці — аж знямелі, маўчаць. Падпалкоўнік гаворыць:

— Ну і цёмнік ты, мужык, ну і паганец... Па табе ж турма плача!.. А з другога боку — хвалю... Іншыя за...цы: «Я фужер шампанского выпил, позавчера...», «Я бокальчик пива»... Ты — усю праўду сказаў. Пяцьдзясят рублёў штрафу! І каб я не бачыў цябе!..

Аўцюк — куляю... З кабінета...

Ён, казалі, нават піць кінуў — ад радасці... А вось распавядаць, як выгадна праўду казаць — не: уся Гомельшчына ведае!..

Іншая справа, ці кажа?

Зрэшты, абмяркоўваць гэтую складаную маральна-этычную праблему мы не будзем. Будзем, як заўжды, чытаць подпісы, якія нашы чытачы прыдумалі да здымка. Тым больш што ў іх — таксама праўда.

Праўда (прабачце за паўтор) у кожнага — свая. Ну мяркуйце самі: спадарыня Лабажэвіч з Клецка ўсклікае:

Гараджанкі, бач, на лаве
(Бо ў вёсцы ўсе пры справе).
Хоць панамак не куплялі,
Выглядаюць — нібы кралі!

І далей:

Дзеўкі — проста на падбор!..
Грышка — згледзеў
І папёр
Па бутэльку самагонкі:
Мо якая пойдзе ў жонкі?

Для нейкага Грышкі, трэба разумець, гэтая згода, за шчасце была б? А вось для Віктара Лукшы з вёскі Лынтупы Пастаўскага раёна — ні ў якім разе! Ён, карыстаючыся выпадкам, да ўсіх нашых мужчын звяртаецца:

Каб рост насельніцтва ўзняць,
Заўжды трымайцеся ў «гусце»...
Малых спяшайцеся шукаць,
Але...
Не ў гэтакай капусце.

Не падабаецца яна, значыць? Спадар Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна ведае, чаму:

Пасля хмельнай вечарынкі
З галавою — справы дрэнь...
Вось і лекуюць жанчынкі,
Хто «ўдаўленне», хто мігрэнь.

Не здаровыя, выходзіць, яны... Да таго ж — не вельмі маладыя, бо іх, па меркаванні спадара Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна:

Адправілі на пенсію
З музыкаю, з песняю...
Яшчэ і з падарункамі —
Рознымі ласункамі:
З сушамі, лангустам
І лістом капусным.

Іншыя за апошняе маглі б і пакрыўдзіцца, а гэтыя — не, ім ён, як бачыце, да галавы! А ўсё таму, што

Нашы бабы ў сорак пяць
Могуць дзеўкам фору даць!..
Каб хлопцы гэта ўгледзелі,
«Ярмолкі» ў краме згледзелі.

І купілі. Во якія вынаходлівыя, заўважае спадар Дземчанка з в. Машканы Сенненскага раёна. І пры гэтым, мусіць, ведае, чаму гэтыя галаўныя ўборы менавіта з капусты?

З ёй сябруе наш народзе:
Ужывае — кожны дзень...
Сокам смагу ён «выводзіць»
І вылечвае мігрэнь,
Варыць, квасіць, прыпраўляе...
Само слова вабіць слых!
Ды найлепей паважае
Пашукаць у ёй малых.

Піша так спадар Гаўрыш з Пастаўшчыны. Ды што там — ён гэтаму прадукту цэлую оду пяе! Успамінае, як у дзяцінстве захапляўся казкамі, як рады быў за беднага Янку, якому дзядок з барадой на прозвішчы «Ох» прынёс не нейкія там «сушы з лангустам», а міску капусты і лусту хлеба. Да таго ж менавіта ёй, не чым іншым, дзеўка Геба з «Тараса на Парнасе» частавала тамтэйшых багоў (!). Помніце:

Найперш дала яна капусту,
Тады са шкваркамі кулеш...

Актуальныя — асабліва перад зазімкам — і радкі любімага Караткевіча пра цэлы рытуал, які называецца «ставіць капусту». Ну вось «убачце»:

Жанчыны сечкамі таўкуць бадзёра,
Як быццам спора выбіваюць такт
Для нейкай небывала хуткай полькі.
У распараныя глоткі цёмных бочак
Плыве капуста белаю гарой.
Яе засыплюць соллю
з чорным кменам
І зоркамі чырвонай
смачнай морквы,
Там-сям антонаўку для духу кінуць
І зноўку пачынаюць
дружна стукаць.
Пачатак лістапада.
Ноч глухая
Ляжыць за воknамі самотнай хаты,
І плачацца на горкую нядолю
За мокрым шклом
раздзеты чорны сад...

Во як!

Але ж у нас зусім не ён «на парадку»... Хоць і нешта блізкае. Ну мяркуйце самі (услед за Міколам Старых з Гомеля):

Ні Ганульку, ні Марусю
Не прыносіў белы бусел.
І Таццяначкі з Аўгустай
Не было ў радках з капустай...
Там не будзе й жаніхоў,
То не псуйце качаноў, —

павучае кабет Мікола, відаць, мяркуючы, што яны шукаюць, чакаюць, выглядаюць сабе абраннікаў. А рабіць гэта, на думку спадарыні Лабажэвіч з Клецка, зусім не трэба:

Хто пакліча к сельсавету?..
Вы «не парцеся» пра гэта.
Лепш працуйце ў агародзе, —
Грамадзянскі шлюб у модзе!

На жаль...

Як і тое, што ў пэўным ўзросце асобныя (і мужчыны і жанкі) згаджаюцца на любы (шлюб). Пра гэта радкі Вольгі Сяргееўны Хільман з Мядзельшчыны:

Не магу я памыліцца:
Гэта ж клуб «Каму за трыццаць»?
Надакучыла чакаць —
Як сцямнее будзем браць.
І нікога не адпусцім,
Будзе хлопцам, як капусце!

Што (канкрэтна) было ёй, ведае спадар Гарбачоў з г. Сянно:

Як у Ганны, як у Нюркі
Не лісцё ў капусце, — дзюркі...
Правялі агульны сход —
На «павестцы» — агарод.
І абралі старшыню —
Дасць ён вусеню вайну.

Вось толькі...

На яе бухгалтар Вера
Паглядае з недаверам:
Ведае, не чытае —
Пра рэкорды дутыя, —

заўважае спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны.

Туды ж спадар Гарачоў з Іўеўшчыны:

Ці не праўду я кажу:
Час мяняе густы
Уперад — «вешали лапшу»
Зараз — ліст капусны.

Дарэчы (і па прызнанні абсалютнай большасці чытачоў), гэта вельмі... карысна. Ну па-першае:

Якім чынам нам, жанчынам,
Пазбаўляцца ад маршчынак?
Як параіў дзед Пахом:
Прыкрыць цемечкі лістом
І затым — «балдзець» пад плотам,
Пазакідваўшы работу...

Па меркаванні Раісы Васільевай з Гомеля, жанчыны (са здымка) менавіта гэта і робяць: хоць ад спёкі млеюць, але ж маладзеюць!

Ды каб толькі гэта! Не, як лічыць спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў:

Згаварыліся сяброўкі —
Упрыгожылі галоўкі.
Так і промні не дастануць,
І сурокі не прыстануць.

Вось гэта, апошняе, надзвычай важна, бо Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны пра сябе-не пра сябе, але выдаў:

Калі побач крочылі
Бабы нас сурочылі...
Каб не тыя вочы,
Мы б не спалі ўночы.

А гэта, трэба разумець, не робіць гонару — ні той парачцы, ні «бабам». Ды што там

Гэты здымак і ў мужчын,
Не падыме гонару:
Зелень маецца ў жанчын
Ды не роўня доларам!

А яна каб была (тая «роўня», тая правільная, «зелень» альбо «капуста») то, як лічыць Валерый Гаўрыш, не сядзелі б жонкі ў Лідзе, а гулялі б па Фларыдзе.

Па Фларыдзе, пагуляць, зразумела ж, заманліва! І трэба! Бо, як зазначаюць сужэнцы Астроўскія з Мінска:

Мужыкоў ужо даўно
Ў двор збірае даміно.
У жанчын — другая справа —
Папляткарыць кліча лава.
Бач, расселіся «нявесты»...
Абмяркуюць шоу, фэсты...
Праўда, усё ж на іх плячах
Праца, дзеці, хатні дах...

Значыць, каму-каму, а ім, жанчынам, трэба гуляць, трэба адпачываць. Што, па меркаванні Мікалая Уласавіча Гарбачова з г. Сянно, яны і робяць:

У настрої ўсе геройкі
Сэрцы — поўны песнямі:
Аб пачуццях светлых мроі,
І... прыбаўцы к пенсіі.

Зрэшты, тут, як лічыць спадар Гаўрыш, мроіць, марыць мала, трэба і нешта рабіць, таму на здымку

Не гандляркі-модніцы, —
Бабы-агародніцы:
Берагуць ад сонца твар,
Ды й рэклама... На тавар...

Хто яго купіць?.. Пасля гэткай рэкламы...

Ой, не скажыце — за мяжой пакупнікі спецыяльна сноўдаюць па рынках — шукаюць чарвівыя грушы, яблыкі (экалагічна чыстыя, значыць!). Да таго ж (радкі Віктара Лукшы) —

Мода з Францыі ідзе
І заместа хустак
Прапануе грамадзе
У дзірку ліст капусны.

Вось і атрымліваецца, што змагацца з вусенем трэба, але асцярожна. І крый Бог — не перамагаць.

...Завяршыць жа гэты агляд хочацца задуменнымі радкамі спадара Гарачова:

Гляджу я на здымак
Ізноў і ізноў
Пытанне даймае ўпёртае:
Ёсць Вера, Надзея і нават Любоў
А як жа завецца чацвёртая?

Дык мо яна ўжо пазнала сябе і паведаміць? Добра было б!

А яшчэ лепей, каб напісала, чые вершы-радкі ёй спадабаліся болей. Тады маленькаму рэдакцыйнаму журы было б прасцей вызначыць пераможцу. На гэтым этапе.

А што да папярэдняга (на здымку, калі памятаеце, былі двое: дзяўчына глядзелася ў люстэрачка, папраўляючы макіяж, конь з сумам назіраў), — то найлепшыя радкі пра іх, па меркаванні вялікага чытацкага журы, склалі Ала Тарасік і сужэнцы Астроўскія з Мінска, Уладзімір Сітнік са Старадарожчыны, Валерый Гаўрыш з Пастаўшчыны, Уладзімір Барысёнак з Ушаччыны, Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны і Вольга Лабажэвіч з Клецка. З чым пагадзілася і журы рэдакцыйнае. Так што прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету накіроўваецца ў Клецк. Застаецца толькі павітаць першую падпісчыцу на новы 2010 год і нагадаць іншым, што далучыцца да кола чытачоў «Звязды» варта і ніколі не позна.

Да ўдзельнікаў конкурсу на лепшы подпіс да здымка — таксама. Фота, як заўжды дадаецца. Умовы ранейшыя: коратка (не больш за 8 радкоў) і дасціпна. Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 29 (75)

Шануй сваё

300 СТАРОНАК БЕЛАРУСКІХ СКАРБАЎ

Днямі ў Нацыянальным мастацкім музеі прайшла прэзентацыя новага фотаальбома Алега Лукашэвіча і Аляксандра Аляксеева з серыі «Спадчына Беларусі». Выдадзены ён на заказ і пры фінансаванні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

Гэта серыя выданняў, што заваявала шырокую вядомасць не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі, дэманструе прыгажосць і значнасць разнастайных помнікаў архітэктуры Беларусі. Альбомы ёсць у фондах найбуйнейшых бібліятэк свету, у культурніцкіх і дыпламатычных установах, у прэстыжных універсітэтах, а таксама ў прыватных калекцыях вядомых асобаў — ад Каралевы Вялікабрытаніі да Папы Рымскага.

Праект «Спадчына Беларусі», распачаты ў 2003 годзе, уключае ў сябе не толькі выданне прадстаўніцкіх альбомаў, але таксама правядзенне фотавыстаў і вытворчасць тэлепраграм пра спадчыну Беларусі. У першым, аднайменным альбоме, які выйшаў у свет у 2004 годзе, аўтары занатавалі спадчыну архітэктурную. Альбом «Спадчына Беларусі. Скарбы», выдадзены ў 2008 годзе, знаёміць з найбольш каштоўнымі прадметамі з золата і срэбра, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны і з'яўляюцца яе нацыянальным здабыткам. У чарговым выданні — «Скарбы Беларусі» — на 320 старонках сабрана каля 500 унікальных фотаздымкаў беларускіх гістарычных каштоўнасцяў — нацыянальных скарбаў з дзяржаўных зборaў і зборaў праваслаўных ды каталіцкіх цэркваў. І на гэтым, паводле слоў аўтараў, праект не завершыцца — ужо практычна гатовы да выдання чацвёрты альбом «Спадчына Беларусі. Скарбы Радзівілаў».

Дарэчы, агульны наклад альбомаў праекта «Спадчына Беларусі» склаў 30 тысяч асобнікаў, што для айчыннага кнігавыдання — рэкордная лічба.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

УСПАМІНЫ — ЗБРОЯ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАЎДУ ВАЙНЫ

Ветэраны падзяліліся ўспамінамі пра вайну ў новай кнізе «Беларусь родная, памятай нас!», якая была прэзентавана ўчора ў музеі Вялікай Айчыннай вайны. Кніга складаецца з 50 успамінаў удзельнікаў вайны, а таксама з 10 сачыненняў школьнікаў. Гэта ўжо трэцяя кніга з серыі «Беларусь родная, памятай нас!», дзве першыя кнігі выйшлі ў 2004 і 2006 гадах.

— Мы пачалі працу над кнігай у спробе абараніць нашу Перамогу, — сказала **Валянціна БУЙКЕВІЧ, складальнік, рэдактар кніг успамінаў,** і расказала, адкуль узялася ідэя выдаваць такія кнігі. — Падчас сустрэч у школах з моладдзю ветэранам задаюць шмат пытанняў. Бывае, што гэтыя пытанні чыста дзіцячыя, а бывае, што з глыбокім сэнсам. І вось на адной з сустрэч дзяўчынка, здаецца, 9-га класа спытала: «А праўда, што жанчыны ішлі на фронт для таго, каб паспрабаваць сэкс у экстрэмальных умовах?». Шчыра кажучы, у мяне адняло мову. Адкуль у гэтай дзяўчынкі такое пытанне?.. Як высветлілася, сяброўка ёй расказала пра нейкую кніжку, выдадзеную ў Маскве, дзе напісана пра тое, як паводзілі сябе нашы жанчыны. Я дзяўчынцы расказала, што траплялі на фронт і, прабачце за выраз, ператыканкі, але ў асноўным нашы жанчыны былі героямі, ім было больш цяжка, чым мужчынам, бо ніякіх умоў для ўдзелу ў вайне для жанчын не было, яны ўзялі на сябе мужчынскую працу, будучы да яе непадрыхтаванымі... Я расказала ёй пра каханне, якое было на фронце, расказала пра Зіну Тусналобаву-Марчанку, бо асабіста сустракалася з ёй...

Для выдання трэцяй кнігі «Беларусь родная, памятай нас!» спатрэбілася 12 млн беларускіх рублёў, якія грамадскія арганізацыі ветэранаў збіралі па кропельках: усяго 11 спонсараў ахвяравалі грошы на выданне кнігі — ад 200 тысяч да 4 мільёнаў. Самы вялікі ўнёсак зрабіў Мінскі электратэхнічны завод імя Казлова, за што ім ветэраны і падарылі 4 экзэмпляры кнігі з маленькага накладу ў 410 асобнікаў.

— Калі мы ўжо падумалі, што ўзяліся за непасільную працу вы-дання кнігі, бо сярод нас не было ні журналістаў, ні спецыялістаў, то адзін з ветэранаў сказаў: «А вы ведаеце, гэта залаты ўнёсак у будучыню, працэнты ад яго будуць расці з аддаленнем ваенных падзей», — расказала Вялянціна Буйкевіч. — І насамрэч — ветэраны адыходзяць. Нават гэтую кнігу не дачакаліся чатыры аўтары, але каштоўнасць кнігі будзе ўзрастаць, бо расказаць пра тыя падзеі могуць толькі відавочцы.

Новую кнігу з успамінамі **Анатоль АДОЛЬЕЎ, старшыня Мінскага гарадскога савета ветэранаў,** лічыць важнай перш за ўсё для моладзі:

— Вялікая праца, душэўны боль, успаміны і перажыванні ветэранаў накіраваныя не толькі на тое, каб мы не забываліся на гэтыя падзеі, а каб моладзь пачула, зразумела і дакранулася да тых страшных, грозных, але пераможных часоў.

Ветэранаў хвалюе таксама і сучасная ацэнка падзей ваенных гадоў — так званыя спробы перагледзець гісторыю:

— 65 гадоў таму была зававана Вялікая Перамога. Ці маглі пераможцы тады падумаць, што прыйдзе час, калі іх нашчадкам давядзецца абараняць праўду пра гэтую вайну? — задае рытарычнае пытанне **Мікалай БЯЛЯЕЎ, генерал-маёр у адстаўцы, член Ваенна-навуковага савета Узброеных Сілаў Беларусі.** — Нельга недаацэньваць сённяшнюю ідэалагічную барацьбу, і ў гэтай сувязі ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, іх сведчанні вельмі каштоўныя ў барацьбе за праўду гісторыі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Фестывалі

ПАНАРАМНЫ ВЫХАД

У мінчан будзе магчымасць зразумець, на чым трымаецца сучасны тэатр

Вешалка з тэатральнага гардэроба стала дахам, які трымаецца на чатырох калонах... Нічога дзіўнага ў гэткай выяве: да новай эмблемы міжнароднага тэатральнага фестывалю «Панарама» прыклаў руку мастак Уладзімір Цэслер. Да фарміравання сёлетняй праграмы — мастацкі кіраўнік тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Пінігін. Паводле яе сёлета ў Мінск прыедуць не толькі тэатры з краін Еўропы, але і з Лацінскай Амерыкі, у прыватнасці Венесуэлы, так што будзе магчымасць паразважаць пра тое, што для мастацтва сапраўды няма межаў.

Дарэчы, гэта беларускія аматары тэатра маглі адчуць яшчэ на папярэдніх трох міжнародных фестывалях «Панарама», якія заснаваў Купалаўскі тэатр разам з Міністэрствам культуры і Мінскім гарвыканкамам. Але што асабліва важна для нас — гэта яшчэ адна магчымасць паразважаць пра развіццё беларускага тэатра ў кантэксце сусветнага. Сёлета, напрыклад, распачаць фестываль 7 кастрычніка выпала спектаклю гаспадароў «Пінская шляхта» паводле Дуніна-Марцінкевіча ў пастаноўцы Мікалая Пінігіна.

Тэатр імя Горкага таксама прадэманструе творчасць свайго новага кіраўніка Сяргея Кавальчыка — у праграме яго спектакль «Бег» паводле Булгакава. Натуральна, паказаны ён будзе на роднай сцэне, як амаль усе пастаноўкі іншых беларускіх тэатраў — «Новага драматычнага тэатра», Тэатра лялек, Тэатра юнага гледача, Тэатра беларускай драматургіі. Цікава, што ў фестывальную праграму трапіў нашумелы некалі студэнцкі спектакль студыі імя Еўсцігнея Міровіча «Не танцы» Яўгена Карняга, які іграецца рэдка.

Праграма сведчыць пра тое, што ў Мінск сёлета прыедуць розныя па жанрах, напрамках спектаклі — традыцыйныя і эксперыментальныя. Таму падстаў і магчымасцяў для дыскусій хопіць: спецыяльна будуць арганізаваныя круглыя сталы, лекцыі, майстар-класы, якія павінны стымуляваць імкненне да творчых пошукаў у маладых рэжысёраў і акцёраў. Дзеля гэтага сёлета адбудзецца адмысловы тэатральны праект, які стаў знакавым для «Панарамы» — «Тэатр On-line», у рамках якога маладыя беларускія рэжысёры і драматургі атрымаюць магчымасць стварыць міні-спектаклі. Пары, дарэчы, ужо вызначыліся, і вынікі іх працы разам з артыстамі мы ўбачым падчас фестывалю. Ну, трэба ж зразумець, якая тэатральная будучыня нас чакае, паглядзеўшы спектаклі замежных гасцей.

Адзін з найшаноўнейшых — тэатр «Пікала» з Мілана — прапануе лёгкую класіку «Арлекін — слуга двух гаспадароў» Гальдоні. Спектакль, зроблены ў традыцыях камедыі дэль артэ, заваяваў не адну краіну.

Сярод запрошаных сёлета — Рускі драматычны тэатр Эстоніі са спектаклем «Голая праўда» ў пастаноўцы лаўрэата прэміі «Залатая маска» Уладзіміра Пятрова. Таксама гэтай прэміяй быў адзначаны Драматычны тэатр імя Пушкіна з Магнітагорска, які да нас прыедзе з драмай «Навальніца» паводле Астроўскага. Ужо вядомы беларускім тэатралам Вільнюскі гарадскі тэатр Оскара Коршунаваса сёлета прыедзе з пастаноўкай шэкспіраўскага «Сну ў летнюю ноч» у мінімалісцкім стылі. А Новы рыжскі тэатр збіраецца здзівіць сапраўднымі антыкварнымі рэчамі, якія выкарыстоўваюцца ў афармленні сцэны ў спектаклі «Соня» паводле Таццяны Талстой. Два тэатры прыедуць з Санкт-Пецярбурга: драматычны тэатр «Камедыянты» пакажа інтэрпрэтацыю Тэнэсі Уільямса чэхаўскай «Чайкі», а сваю версію гогалеўскіх «Гульцоў» прадэманструе Дзяржаўны акадэмічны тэатр камедыі імя Акімава.

Наколькі тэатр у свеце існуе сёння без межаў, становіцца зразумела, калі ведаеш, што Башкірскі дзяржаўны акадэмічны тэатр драмы прывозіць у Мінск... псіхалагічны трылер «Пралятаючы над гняздом зязюлі». Чаму так адбываецца? Адказы на розныя пытанні дапамагае знайсці тэатр са швейцарскага Цюрыха — спектаклем «Чаму, чаму». Але тэатральных пытанняў будзе шмат, да канца кастрычніка атрымаем адказы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

БОСКАЕ ЯК НАКАНАВАНАСЦЬ

Які ганарар атрымае прыма-балерына, уладальніца «Залатой маскі» і тытулу «Боская» Ульяна Лапаткіна за выступленне ў Беларусі мы не можам ведаць — у кантракце артыста ёсць пункт аб захаванні сумы ганарару. Затое мы можам ведаць, што асноўнай крыніцай фінансавання фестывалю імя Юрыя Башмета з'яўляюцца спонсарскія ўнёскі. Удзел дзяржаўных сродкаў у гэтым мерапрыемстве — не больш за 25 адсоткаў. Яшчэ каля 10 адсоткаў бюджэту фестывалю складаюць паступленні ад продажу квіткоў. Вядома, падобныя мерапрыемствы — задавальненне не танпае, і наўрад ці магло б акупіцца продажам квіткоў. Вось тут спонсары і ўступаюць у гульню — сярод іх, між іншым, кампанія «Спорт-пары».

Дзякуючы спонсарам стала магчыма на адкрыццё фестывалю запрасіць не толькі першага альтыста свету, народнага артыста СССР Юрыя Башмета з аркестрам «Новая Расія», але і іншых зорак выканаліцкага майстэрства, у тым ліку прыму Марыінкі Ульяну Лапаткіну. Яе з'яўленне на сцэне павінна вянчаць праграму вечара, прысвечанага Кармэн. Лапаткіна будзе танцаваць у славутай «Кармэн-сюіце» створанай Радзівонам Шчадрыным паводле Бізэ. Некалі гэтая пастаноўка ажыццяўлялася спецыяльна для Маі Плісецкай больш за 40 гадоў таму. І хоць у беларускім тэатры балета былі свае Кармэнсіты, выхад у гэтым вобразе зоркі з сусветным імем на сцэне Вялікага тэатра Беларусі — падзея. Тым больш, што Лапаткіна, якой цяпер 35 гадоў, лічыцца самай загадкавай балерынай яшчэ і таму, што працягвае працаваць і нават здзейсніла своеасаблівы ўчынак — нарадзіла дзіця, паспяхова аднавіла форму і вярнулася на сцэну. Ну сапраўды выконвае Боскае наканаванне...

Аднак славутыя артысты, музыканты не абмяжоўцца толькі выхадам на сцэну ў канцэртах, сёлета яны будуць удзельнічаць у сустрэчах і майстар-класах. І нават больш — сёлета ўпершыню пройдзе Моладзевая акадэмія краін СНД. Гэта дасць магчымасць маладым музыкантам з розных куткоў постсавецкай прасторы павучыцца ў вялікіх і магутных. Аднак яны ж потым будуць мець поўнае права сказаць: «Я выступаў у адным канцэрце з першым альтам свету Юрыем Башметам, ці са славутым скрыпачом Віктарам Траццяковым...» Альбо змогуць заявіць, што бралі ўрокі ігры на фартэпіяна ў прафесара Крыстофера Элтана з Вялікабрытаніі...» Гэта бадай галоўная ўнікальнасць фестывалю, што ў маладых музыкантаў ёсць магчымасць гучна заявіць пра сябе. Так, як гэта атрымалася ў піяніста Расціслава Крымера, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком фестывалю Башмета. Так, як гэта зрабіў Арцём Шышкоў, які сёлета таксама будзе выступаць у канцэрце разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Беларусі 6 кастрычніка. Аднак колькі адкрыццяў новых імёнаў у нас яшчэ наперадзе. На закрыцці «Моладзевай акадэміі» 10 кастрычніка мы яшчэ пачуем і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Геаграфія выканаўцаў з Еўропы сёлета пашырылася, прыемна, што ёсць прадстаўнікі Беларусі ў фестывальнай праграме», — адзначыў дырэктар беларускага Тэатра оперы Валерый Гедройц.

Пашырылася і геаграфія канцэртаў — у Мінску яны пройдуць на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета (адкрыццё і закрыццё), у Белдзяржфілармоніі, зале Беларускай акадэміі музыкі. Але Башмет з аркестрам выступіць у Магілёве. Бясплатна...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Бяседныя песні

Песня — гэта свята

МАМАЧКА

Песні гучалі раздольна, выяўляючы шматаспектную бязмежнасць палескай прасторы і жыццярадаснасць натуры беларуса. Вакалісты Уладзімір Салодкі, Якаў Навуменка, Віктар Міклашэўскі спявалі сольна і разам, нібы перагортвалі музычныя старонкі быццёвай кнігі Палескага краю.

Мастацкі савет Белдзяржфілармоніі быў вельмі задаволены. Падрыхтаваная праграма новага ансамбля «Свята» цалкам адпавядала патрабаванням рэспубліканскай эстэтычна-этычнай праграмы — беражлівага стаўлення да духоўнай спадчыны. У аснову рэпертуару былі пакладзены музычны фальклор Гомельскага Палесся — адметнай мясціны нашай краіны. Тут уся прастора перапоўнена высакародным духоўнай энергіяй, якая разнастайна выяўляецца як у маляўнічых краявідах, так і ў напеўнай гаворцы палешукоў, у іх музычнай настраёвасці. Якраз гэта выразна перадала аркестравая група. Музыкі Дзмітрый Кудзін, Вера Чарамісына, Павел Кандрусевіч на чале з кіраўніком ансамбля Васілём Купрыяненкам умела стварылі музычны вобраз Палесся. Арганічна ўпісваліся ў абагульнены святочны малюнак танцы, выкананыя Наталляй Кучынскай, Анатолем Струевым, Людмілай і Валерыем Ларыёнавымі...

Экзаменацыйная дэманстрацыя новай праграмы камісіі адбылася 19 лістапада 1984 года. З гэтага дня пачынаецца адлік творчай дзейнасці дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята».

Мамачка, родна,
любую сваю.
пусці на сяло.
Дзеўкі гуляюць, ім весяло.
Адзін я гуляў па зялёным саду.
Думаў, на вуліцу век не пайду.

Мамачка, чуеш, сэрца пяе,
А там, за гарою, пляска ідзе.
Мамачка, чуеш, салавей пяе,
А там, за гарою, пляска ідзе.

А цяпер бягу, аж пяткі гараць,
Так мне, маладому,
хочацца гуляць.
Пайду я на вуліцу,
дзеўкам падпяю
Ды пагляджу на Манечку

Песні галасныя весела пяюць,
Мне, маладому, спаць не даюць.
Мамачка, родна, пусці пагуляць,
Мне ж, маладому,
не хочацца спаць.

Песня запісана ў Калінкавіцкім раёне. Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.



Італьянскае адраджэнне ў Беларусі

БОНА СФОРЦА ЗНОЎ ЗВЯЗАЛА БЕЛАРУСЬ І ІТАЛІЮ

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі ўчора адкрылася выстава адной карціны. Выстаўлены шэдэўр XVI стагоддзя — твор жывапісца Парыса Барданэ «Мадонна з дзіцем, святым Энрыка з Упсалы і святым Антоніа» з калекцыі Музея правінцыі Бары «К. Джаквінта» (Італія).

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Спадарыня Клара Джэлаа каля карціны «Мадонна з дзіцём паміж Энрыка з Упсалы і Святым Антоніа».

На гэту жамчужыну эпохі Рэнесанса варта паглядзець, каб адчуць, па-першае, час, у які жыла каралева Бона, уладальніца зямель Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Памяць пра гэту надзвычай энергічную і амбіцыйную каралеву дагэтуль жывая ў беларускіх гарадах і вёсках. Карціна была замоўлена якраз тады, калі каралева Бона вярталася на сваю радзіму ў Бары пасля амаль 40-гадовага праўлення на землях Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Палатно першапачаткова знаходзілася ў капліцы Божага цела кафедральнага сабора Бары. Пасля 1929 года — у Музеі гэтага вядомага ўсім праваслаўным людзям італьянскага горада. Дарэчы, жыхары Бары вельмі любілі Бону Сфорцу, сведчаннем чаго стала пабудаваная гараджанамі ўсыпальня для каралевы ў саборы Святога Мікалая за галоўным алтаром.

Другая, не менш важная, прычына прыйсці ў гэтыя дні ў Нацыянальны музей (карціна будзе дэманстравацца да 30 кастрычніка) — гэта ўнікальная магчымасць на свае вочы ўбачыць шэдэўр аднаго з самых вытанчаных прадстаўнікоў венецыянскага жывапісу XVI стагоддзя Парыса Барданэ.

Пра трэцюю прычыну сказаў на адкрыцці выставы **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА:**

— Гэта выстава вяртае нас да разумення таго, чым было Вялікае Княства Літоўскае на Беларусі. Сведчыць аб тым, што беларуская культура з'яўляецца арганічнай часткай сусветнай культуры.

Прыезд «Мадонны» з Бары ў Беларусь стаў магчымым дзякуючы намаганням Пасольства Італіі ў нашай краіне, асабіста Пасла Джуліа Прыджані, які яшчэ да таго, як быў прызначаны ў Беларусь, захапіўся вывучэннем і даследаваннем гісторыі праўлення каралевы Боны Сфорцы. Безумоўна, праект быў бы немагчымым без актыўнай падтрымкі двух музеяў — Мастацкага правінцыі Бары і Нацыянальнага мастацкага Беларусі.

— Падчас даследавання жыцця Боны Сфорцы я сутыкнуўся з некалькімі сюрпрызамі, — расказаў **пасол Італіі Джуліа ПРЫДЖАНІ.**— Першае. Яна жыла ў адзін час з Елізаветай I, англійскай каралевай. Другое, Бона Сфорца стала вельмі маладой каралевай на гэтых землях. І гэта была жанчына з вялікім жаданнем нешта рабіць менавіта на гэтых тэрыторыях. Да нядаўняга часу да яе ставіліся вельмі несправядліва. Насамрэч каралева Бона праводзіла значныя рэформы на карысць народа, які тут жыў. Падчас даследавання ў мяне ўзнікла жаданне нешта прывезці з Бары, дзе Бона нарадзілася і памерла, на землі, якія належалі Вялікаму Княству Літоўскаму і якім яна аддала большую частку свайго жыцця.

— Гэта вельмі рэдкая карціна, — патлумачыла журналістам выбар твора **дырэктар Мастацкага музея правінцыі Бары Клара ДЖЭЛАА.** — Яна — адзіная ў Апуліі і прыбыла ў Бары пры вельмі цікавых абставінах. Ізабэла Арагонская, маці Боны Сфорцы, прывезла з Мілана ў Бары свой двор, у складзе якога знаходзіўся Энрыка Танцы, які стаў консулам міланскай абшчыны ў Бары. Праз два гады пасля смерці гэтага чалавека яго ўнукі — браты Габрыэль і Галеца Танцы, выкупілі капліцу ў кафедральным саборы, якую перайменавалі ў гонар святых апекуноў сям'і Энрыка і Антоніа, а праз некалькі гадоў замовілі ў памяць аб дзедзе алтарную карціну. Замову выконваў вучань Тыцыяна італьянскі мастак Парыс Барданэ, які ў той час знаходзіўся ў Мілане.

Парыс Барданэ — мастак венецыянскай школы і прадстаўнік маньерызму. З 1516 па 1518 год працаваў у майстэрні Тыцыяна, у 1538 годзе паступіў на службу да французскага караля Францыска I у Фантэбла, дзе пісаў партрэты караля і прыдворных. У 1540 годзе мастак пераехаў у Аўгсбург, дзе працаваў над роспісам палаца Фугераў.

Барданэ працаваў таксама ў Трэвізе, Вічэнцы, Крэме, Генуі і Турыне. Яго шматлікія партрэты, сярод якіх асабліва ўдалымі лічацца жаночыя, адрозніваюцца пышнасцю і багаццем каларыту. Барданэ быў аўтарам і твораў на гістарычныя і рэлігійныя сюжэты. Мастак выконваў шэраг важных фрэскавых цыклаў у Венецыі, Трэвізе і Вічэнцы, якія не дайшлі да нашых дзён.

Сюжэт карціны, якая цяпер выстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, папулярны і характэрны для жывапісцаў, ён атрымаў назву «Святая гутарка». Як правіла, на ім адлюстравана Мадонна з Дзіцем і некалькі святых. Выбар святых можа быць прадыктаваны рознымі прычынамі. Часта гэта патроны сям'і заказчыка, царквы, для якой замоўлена палатно, альбо роднага горада данатара.

На палатне Парыса Барданэ адлюстравана Мадонна з Дзіцем, якая сядзіць на мармуровым ступеністым троне (падобным на стыбулат храма). Справа стаіць у біскупскім адзенні святы Энрыка Упсальскі, злева — у адзенні Францысканскага ордэна — святы Антоній Падуанскі.

Святы Энрыка Упсальскі — епіскап, пакутнік, адзін з дзеячаў хрысціянізацыі Фінляндыі. Паводле легенды, ён быў родам з Англіі, прыбыў у Швецыю разам з будучым папам Адрыянам IV. У Швецыі яму быў нададзены сан біскупа, ён атрымаў упсальскую кафедру. У XII стагоддзі Энрыка Упсальскі прыняў удзел у шведскім крыжовым паходзе, які быў арганізаваны з мэтай хрысціянізацыі Фінляндыі. Пасля адбыцця караля і шведскага войска Энрыка Упсальскі застаўся ў Фінляндыі будаваць цэрквы, хрысціць і вучыць народ. Прыкладна праз 10 гадоў быў забіты язычнікамі.

Другі святы, адлюстраваны ў кампазіцыі Парыса Барданэ, — Антоній Падуанскі — хрысціянскі святы і доктар Царквы. Уступіўшы ў Францысканскі ордэн, ён стаў вучнем і сябрам Францыска. Антоній валодаў велізарнай біблейскай вучонасцю і прапаведніцкімі здольнасцямі, шмат падарожнічаў.

Карціна «Мадонна з Дзіцем, святым Энрыка з Упсалы і святым Антоніа» з'яўляецца абсалютным шэдэўрам сталага Барданэ, як падкрэсліваюць мастацтвазнаўцы.

Выстава арганізавана Пасольствам Італіі ў рамках праграмы «Італьянскае Адраджэнне ў Беларусі». Цырымонія адкрыцця, якое адбылося 1 кастрычніка, стала адначасова і прэзентацыяй праграмы. Асаблівую атмасферу ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея стварыў канцэрт музыкі эпохі Адраджэння ў выкананні Моладзевага камернага хору «Salutaris» Беларускага саюза музычных дзеячаў.

У той жа вечар усе госці музея мелі магчымасць убачыць мастацка-кулінарную кампазіцыю Рэната Кучыноты ў супрацоўніцтве з Беларускім акадэмічным драматычным тэатрам, Нацыянальным мастацкім музеем і кампаніяй «Technology Food Ingredients». Італьянскі маэстра-кандытар Серджа Крысціяні выставіў салодкія творы, якія можна было падэгуставаць разам з італьянскімі вінамі.

Праграма «Італьянскае Адраджэнне ў Беларусі» працягнецца ў гэтыя выхадныя ў Нясвіжы (а 12 гадзіне ў суботу), у Міры (а палове пятай у суботу) і ў Мінску (а палове дванаццатай на веладроме комплексу «Арэна» і а палове чацвёртай у Парку імя Горкага ў нядзелю), дзе адбудуцца выступленні сцяганосцаў з Кавы. Гэта будуць яскравыя і ўражальныя касцюміраваныя відовішчы, якія, як запэўніў італьянскі пасол, можна параўнаць з салютам.

19 кастрычніка Італьянскі рэнесанс працягнецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе распачнецца выстава кніг часоў Боны Сфорцы, а праз два дні пачнецца Міжнародная канферэнцыя, прысвечаная італьяністыцы. 31 кастрычніка ў Беларускім нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы міланскія акцёры пакажуць п'есу Карла Гальдані «Арлекін — слуга двух гаспадароў».

У рамках праграмы прадугледжаны таксама Кангрэс італьянка-беларускіх дабрачынных асацыяцый (2-9 лістапада), бізнэс-форум (5-6 лістапада) і шэраг іншых мерапрыемстваў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

З нагоды

ЗОРКА ЎКРАІНСКАЙ ПАЭЗІІ

Памятаеце словы М. Багдановіча пра знічку-зорку, якая «ў цемні ляціць, усіх чаруючы святлом сваім»? І хоць яна «стухае ў небе глухім... але ўспомніць яшчэ зорку свет, бо ў сэрцах гарыць яе след» (верш «С.Е. Палуяну»). Гэтыя словы з поўным правам можна адрасаваць і класіку ўкраінскай паэзіі XX ст. Багдану-Ігару Антонычу (5.9.1909—6.7.1937), стагадовы юбілей якога шырока, на самым высокім дзяржаўным узроўні, адзначаецца ў гэтыя дні ва Украіне.

Нарадзіўся і пражыў сваё кароткае жыццё пісьменнік у колішняй Заходняй Украіне, пад «небам глухім» сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту ўкраінцаў у міжваеннай Польшчы. Але зрабіў, што мог і паспеў зрабіць: сваім шматколерным, адметна-зыркім паэтычным словам, што сягала ў прасторы Космасу і пранікала ў сутнасць жывой і нежывой матэрыі, здолеў «усё кругом на мамент асвяціць». У тым ліку — саму ўкраінскую паэзію як мастацтва слова, значна пашырыўшы яе сэнсавыя і выяўленчыя мажлівасці, паглыбіўшы яе філасофскі і агульначалавечы змест, параўнаўшыся з вяршыннымі дасягненнямі еўрапейскага прыгожага пісьменства. І за гэта яму шчыра дзякуюць землякі. За паэтычную вывучку дзякуем яму і мы.

На жаль, да апошняга часу імя Антоныча ў нас было амаль невядомае. Ды і ў самой Украіне пісьменніка па розных прычынах у савецкі час цераліся не заўважаць. Сёлета намаганнямі некалькіх перакладчыкаў, сярод якіх Э. Акулін, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, С. Законнікаў, В. Зуёнак і аўтар гэтых радкоў, падрыхтаваны і чакае свайго прыхільнага выдаўца зборнік беларускамоўных узнаўленняў выбраных твораў Антоныча «Зялёнае Евангелле». Прапаную чытачам газеты некалькі вершаў з гэтага зборніка ў сваім перакладзе.

Вячаслаў РАГОЙША.

ПЕСНЯ ПРА НЕЗНІШЧАЛЬНАСЦЬ МАТЭРЫІ

У нетры векавой,
захутаны у вецер,
увесь накрыты пяснямі,
нібы вянкамі,
ляжу, як мудры ліс,
пад папараці веццем,
і стыну, й халадзею,
й ледзянею ў камень.

Раслінных рэк зялёная паводка
смела
у наступ рушыць
і аглушыць лісцяў лопат.
Залье мяне патоп,
раздушыць сонцам белым
і з цела стане вугаль,
з песень будзе попел.

Пральюцца, нібы лава,
сотні зім і летаў,
дзе мы жылі,
зараскашуюць пальмы,
і вугаль нашых цел
займецца чорным кветам,
зазвоняць ў маё сэрца
молаты ў капальні.

ЛЬВОЎСКАЯ ЭЛЕГІЯ

Зноў запаліліся срэбрам каштаны
на Стрыйскай алеі,
сэрца дыктуе ізноў
сваю жарсць галаве.
Хочацца выгукнуць:
толькі вясна так умее —
шыраказвонна і сямімільна
па Львову плыве.
Сонца ў гародах запаліць
свяцільнікі ружаў,
кветкамі пырснуць сады,
полымем іскраў жывых.
Зноўку мяне зачаруе
і зноў галаву мне закружыць
подых вясны малады —
лекам найлепшым для ўсіх.
Дзень крышталёва-празрысты,
а ранак пакуль заімглёны.
Каб і хацеў бы,
не можаш жыццю сляць праклёны.

ФРАНКО

Нялёгка гэты свет пакінуць,
хоць зямных пакут
спазнаў дасхочу
на даросце дзён вірлівай.
На сто вузлоў з зямлёй
спляліся думкі, і вось тут
з далоні раптам выпала
жыццё разбітай лірай.

Паэт, настаўнік, выхавацель,
дойлід і прараб,
што слова ў справу апранаў
упэўнена і тонка,
не музам дань складаў
і не сабе спяваў, а каб
пракладваць светлы шлях
у прышласць для патомкаў.

Узняўся і, адклаўшы песню,
як вясляр вясло,
да гнеўных зор вайны
ён скіраваў маленне,
і з ложа смерці думкі
слаў на шлях, якім ішло
з яго натхненнем веснім
дзён тых пакаленне.

ШЧАСЦЕ

З усіх людзей найболей
я шчаслівы,
калінавы будую белы мост.
Мой дом са шкла сапраўдны
і зычлівы.
Маёй вялікай філасофіі
такі бязглузды змест.

Не заплачу́ пакуце
й гору мыта я
за небяспекі, рызыкі быцця.
Я — стрэльба, радасцю набітая,
якою выстралю дзеля жыцця.
Я п'ю яго да дна, без суму,
без журбы і бед,
нішто людское не бывае
мне чужым,
а што сягоння я не маю грошай
на абед, —
дык ліха з ім.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (29 верасня). Па гарызанталі: Арол. Гематолаг. Карэта. Фаэтон. Тупік. Ён. Тапаз. Егер. Макрамэ. Куб. Кірза. Акра. Апал. Пазыка. Бакс. Нос. Пасат. Кілім. Кедр. Цір. Крах. Старана. Арба. Халіф. Мана. Воз. «Ява». Апенька. **Па вертыкалі:** Апартаменты. Драбіны. Пікша. Бак. Прасека. Клара. Кадр. Лук. Люстра. «Артэк». Храм. Гардэ. Лава. Тапор. Віно. Метро. Фаза. Нізка. Кіт. Сані. Неба. Крыніца. Фетр. Комін. «Атас». Ракетка.

Сканворд (1 кастрычніка). Па гарызанталі: Заваратнюк. Арда. Якар. Сож. Юрта. Таксі. Лупа. Урду. Ава. Сарыч. Насарог. Акр. Аск. Парк. Магніт. Краса. Самасад. Стог. Рэктар. Карэ. Гама. Накат. Кафэ. Ізатоп. Гора. Смолкін. Жыгуноў. **Па вертыкалі:** Гаркалін. Факт. Спуск. Грог. Нага. Арахіс. Мюзікл. Рывок. Тара. Знак. Агра. Крагі. Раса. Вакса. Тон. Вядро. Фтор. Жор. Сашэ. Паж. Цар. Тустэп. Атака. Карсар. Сак. Скнара. Палішчук. Дэтэктыў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Дзевам забяспечана перамога над шкоднымі звычкамі, а Вадалеям давядзецца цалкам акунуцца ў працу

АВЕН. Пастарайцеся рацыянальна размеркаваць сілы з панядзелка да нядзелі. Будзе спадарожнічаць поспех у пошуках працы і афармленні дакументаў. Творчасць у адсасабленні дазволіць павысіць самаацэнку. Тыдзень можа стаць трывалым падмуркам для кар'ернага ўзлёту. Каб паспяхова ажыццявіць задумы і планы, давядзецца быць больш падатлівымі і дыпламатычнымі.

ЦЯЛЕЦ. Першая палова тыдня будзе бедная на падзеі, таму яна вельмі падыходзіць для адпачынку. Самы час чымсьці сябе пацешыць. У аўторак лепш не выказваць услых сваіх думак пра тых, хто старэйшы за вас ці вышэйшы па становішчы. У другой палове тыдня лепш не правакаваць канфлікты. Любімы занятак дапаможа не расходаваць, а назапасіць сілы.

БЛІЗНЯТЫ. Калі не будзеце растрачваць свае разумовыя здольнасці на дробязі, то зможаце справіцца з многімі важнымі задачамі. Пажадана не перанапружвацца. Дайце падзеям магчымасць ісці сваім парадкам. У панядзелак не варта пачынаць штосьці новае і планаваць сур'ёзных сустрэч. У чацвер рэальна ажыццявіць шматабяцальныя планы — не прапусціце гэты залаты час.

РАК. Прыліў энергіі ў панядзелак проста акрыліць. У гэты дзень многае атрымаецца, калі правільна размеркаваць сілы з самай раніцы. Чацвер можа стаць даволі неадназначным днём: верагодныя інтрыгі, плёткі. Інфармацыю, якая паступае, неабходна перапраўляць. А вось пятніца спрыяльная для пачатку спраў — як вялікіх і важных, так і нязначных.

ЛЕЎ. Тыдзень можа стаць спрыяльным часам для перагляду сістэмы каштоўнасцяў, а таксама для пераўтварэння тэорыі ў практыку. Старайцеся ацэньваць справы з пункту гледжання далёкай перспектывы. Падзеі тыдня адгукнуцца ў аддаленай будучыні. Магчымыя пралікі на працы, якія звязаны не з вашай некампетэнтнасцю, а са стомленасцю.

ДЗЕВА. Жыццё, падобна, становіцца вясёлкавым. Варта лавіць момант і радавацца. Цяжкасці ўсё ж могуць з'явіцца на шляху, але не варта іх баяцца. Можаце адначасова праявіць ветлівасць і настойлівасць, а менавіта гэта — каштоўны ключ да поспеху. Паспяховай будзе барацьба са шкоднымі звычкамі: вы не толькі справіцеся з імі, але і дапаможаце іншым людзям.

ШАЛІ. Тыдзень абяцае быць насычаным, прычым самымі рознымі падзеямі. Можа прапасці на час інтарэс да пытанняў кар'еры — замест яе на першы план можа выйсці імкненне да асабістай свабоды ці хоць бы ілюзорнага адчування яе. Магчыма, захочацца прымераць на сябе ролю вольнага мастака. Пастарайцеся не ўпадаць у крайнасці і не адыходзіць ад спраў далёка і надоўга.

СКАРПІЁН. Вам могуць зрабіць перспектыўную дзелавую прапанову, якая адкрые новыя магчымасці. Пастарайцеся не ігнараваць заўвагі начальства, нават калі вы не з усім згодныя. У іншым выпадку рызыкуеце згубіць надзею на прыбаўку да зарплаты. Калі будзеце ўважліва слухаць і чуць, то зможаце дасягнуць узаемаразумення нават з самымі незгаворлівымі людзьмі.

СТРАЛЕЦ. Варта пазбягаць людзей са злым характарам і негатыўным стаўленнем да жыцця. У другой палове тыдня будзеце разрывацца на часткі, каб паспець адначасова на некалькі важных сустрэч. Можа падвярнуцца выгадная праца ці дадатковы кароткачасовы заробак — давядзецца арыентавацца па сітуацыі.

КАЗЯРОГ. Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звяртаюцца. Вы здольныя прыцягнуць увагу навакольных, спалучаючы аптымізм і гнуткасць у паводзінах, — і такая стратэгія дасць свой вынік. Здзяйсняючы чарговы подзвіг, не забудзьцеся хоць зрэдку паціхавіцца навакольным светам. У стасунках з дзелавымі партнёрамі спатрэбяцца такія якасці, як цярпенне, падатлівасць, уменне рэальна ацаніць сітуацыю.

ВАДАЛЕЙ. Акуніцеся ў працу — разбярыцеся з назапашанымі праблемамі. Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі незадаволенасць навакольных. Давядзецца адказваць за свае старыя ўчынкі. Рабіце для іншых толькі тое, што зрабілі б для сябе, і не займайцеся самападманам: прыхарошваць рэчаіснасць цяпер не варта.

РЫБЫ. Можа з'явіцца магчымасць набыць знаёмствы ў раней недаступных для вас галінах. Аднак будзьце асцярожнымі, бо ваш націск можа выклікаць супрацьдзеянне з боку магчымых партнёраў. Перад тым, як завязаць кантакты, патлумачце свае мэты блізкім людзям, інакш можаце атрымаць у якасці рэакцыі ўспышку рэўнасці. У другой палове тыдня вас могуць узнікнуць цудоўныя ідэі, а валоданне важнай інфармацыяй прыцягне шмат прыхільнікаў — нават з апазіцыйнага лагера.

Яшчэ адзін рэцэпт з серыі «Ёсць рэцэпцік!..»

альбо На пампушкі да Алены

Сёння, дарагія мае кулінары, мы з вамі пагаворым пра прадукты, якія павышаюць сэксуальную актыўнасць. Не будзем хіхікаць, а прама скажам, што інтымны бок нашага жыцця — важны складнік як фізічнага, так і псіхічнага здароўя кожнага. Сучасная медыцына сцвярджае, што асноўным пачаткам любой сэксуальнай ежы з'яўляецца наяўнасць у ёй вітамінаў А, Е, В і С. Вітамін Е — лічыцца вітамінам размнажэння. Яго шмат у ягадах абляпіхі, яйках, пячонцы рыбаў (асабліва траскі). Вітаміну А шмат у жывёльных тлушчах, малацэ, сыры, а таксама ў моркве, шпінаце, ліставой салаце, сельдэрэі. На вітамін В багатая бульба, бабовыя культуры, малочныя, мясныя, рыбныя прадукты, а таксама зерне, квацістая капуста, памідоры. Вітамін С садзейнічае паляпшэнню кровазвароту ў вобласці малога таза. Самы смачны рэцэпт, які прапаноўваецца ў многіх народных лячэбніках, — гэта сумесь мёду з грэцкімі арэхамі. Прыгатуйце сумесь з роўных частак мёду і здробненых ядраў грэцкіх арэхаў, прымайце праз 30 хвілін пасля яды 2—3 разы на дзень па 2 чайныя лыжкі на працягу 3-4 тыдняў. А вось яшчэ рэцэпт з рускага народнага лячэбніка. Ядзеркі кедравых арэхаў расціраюць, дадаюць ваду, і гэту белую вадкасць прымаюць у дзень па паўшклянкі.

ЗАПЕЧАНЫЯ КАБАЧКІ З СЫРНАЙ СКАРЫНАЧКАЙ

Вільготныя мяккія кабачкі добра спалучаюцца з саланаватым расплаўленым сырам, які цягнецца. Хлебныя крошкі парушаюць аднароднасць сыру, а часнок надае лёгкі водар.

Нам спатрэбіцца: *1 малады кабачок (300—400 г), 0,5 чайнай лыжкі яблычнага воцату, 1 чайная лыжка расліннага алею, 5 г сыру, 1 скрылёк батона або белага хлеба, 1 маленькі зубок часнаку, соль, перац.*

Кабачок вымыць і разрэзаць уздоўж на пласціны таўшчынёй прыкладна 1,5 см. Калі кабачок маленькі і тонкі, то дастаткова разрэзаць яго папалам. Палажыць пласціны на бляху, засланую фольгай або паперай для выпечкі. Змазаць кабачкі спачатку воцатам, а пасля раслінным алеем. Пры жаданні замест воцату можна выкарыстаць вострыя таматны соус. Злёгку пасаліць і паперчыць. Паставіць ў духоўку на 20 хвілін пры тэмпературы 220°С. У гэты час натаркаваць сыр, ачысціць часнок і праціснуць яго праз прэс. Са скрылька батона зрэзаць скарынку і добра расцерці яе. Цяпер змешваем сыр, часнок і хлеб. Усю гэту сумесь выкладваем на кабачковыя пласціны і паставім у духоўку яшчэ на 3—5 хвілін.

Падаваць цёплымі.

РЫБА, ЗАПЕЧАНАЯ ПАД АМЛЕТАМ З АРЭХАМІ

Гэта цудоўная лёгкая і смачная ежа. Рыбка атрымліваецца вельмі далікатная. Амлет прыгожы — не размазня. А арэхі... Ну — арэхі як арэхі, надаюць невялікую арыгінальнасць. Але іх можна і зусім не класці.

Вазьміце: *500 г філе рыбы, 4—6 яек, 1/4 шклянкі грэцкіх арэхаў, 3 чайныя лыжкі лімоннага соку, няпоўную чайную лыжку солі, перац, пры жаданні — зяленіва.*

Рыбу спырснуць сокам лімона, пасаліць (выкарыстаць 1/3 чайнай лыжкі солі) і паперчыць. Пакінуць памарынавацца хвілін на дзесяць. Дно формы з высокімі борцікамі злёгку змазаць маслам. Вылажыць рыбу і паставіць у гарачую духоўку на 5—10 хвілін. Яйкі добра ўзбіць з соллю і перцам. Палажыць здробленыя да памеру гарошыны арэхі. Пры жаданні можна дадаць дробна парэзанае зяленіва. Яечную масу выліць на рыбу. Паставіць бляху назад у духоўку прыкладна на 15 хвілін. Паверхня амлета павінна стаць ярка румянай. Калі амлет падымецца гарой, то гэту гару трэба пракалоць відэльцам і яна спадзе.

ДЭСЕРТ З ЧАРНАСЛІВУ З АРЭХАМІ

Гэты дэсерт сапраўды цудоўны. Вы можаце не рабіць яго так шмат, а прапарцыянальна зменшыць колькасць усіх інгрэдыентаў.

Нам спатрэбіцца: *1 кг чарнасліву з костачкамі або 500 г без костачак, 200 г ачышчаных грэцкіх арэхаў, 2/3 шклянкі цукровай пудры, 0,75 літра вяршкоў або смятаны (я выкарыстоўвала смятану 20 % тлустасці), 2 сталовыя лыжкі з горкай жэлаціну.*

Чарнасліў прамыць і заліць кіпенем. Калі вада астыне, дастаць з чарнасліву костачкі. Бывае, што костачкі вымаюцца з цяжкасцю, але калі чарнасліў крыху пракіпяціць, то костачкі дастануцца добра, але чарнасліў набярэ лішняй вады і аддасць шмат водару. Я перад заліўкай кіпенем кожную чарнаслівіну праразаю з аднаго боку да костачкі. Пасля чарнасліў дробна парэзаць, але не пракручваць праз мясарубку. Арэхі патаўчы або парэзаць, але не вельмі дробна. Жэлацін заліць халоднай гатаванай вадой на 15 хвілін. Залішнюю ваду зліць, паставіць кубак з жэлацінам у міску з кіпенем і памешваць да поўнага рассмоктвання жэлаціну. Жэлацінавы раствор астудзіць. Вяршкі (ці смятану) узбіць з цукровай пудрай. Можна выкарыстаць вяршкі і смятану любой тлустасці. Але трэба ўлічваць, што калі вяршкі (смятана) будуць вадкія, то яны амаль не падымуцца. Калі жэлацін пачне крыху застываць, пачынаем змешваць яго з вяршкамі. Затым чарнасліў перамешваем з арэхамі, а пасля гэту сумесь з чарнаслівам — ужо з узбітымі вяршкамі. Выкладваем у форму і паставіць у халадзільнік да поўнага застывання. Перад падачай форму апускаем у гарачую ваду на некалькі секундаў і перавярнуць на вялікую талерку, акуратна здымаем. Зверху можна ўпрыгожыць тоўчанымі арэхамі, натаркаваным шакаладам.

Пакаштуйце — гэта вельмі смачна!

АРЫГІНАЛЬНЫЯ МАРЫНАВАНЫЯ СЛІВЫ

Вазьміце: *650 г сліў, 1 галоўку часнаку, 250 г вады, 150 г цукру, 30 мл воцату, крыху гваздзікі і 2 гарошыны духмянага перцу.*

Слівы вымыць, надрэзаць і дастаць костачкі. Часнок разабраць на зубкі і ачысціць. Укласці ў кожную сліву зубок часнаку. Палажыць слівы ў слоікі. Закіпяціць ваду з цукрам, воцатам і прыправамі. Заліць гарачым сіропам слівы і пакінуць на ноч. На наступны дзень сіроп зліць, яшчэ раз закіпяціць і заліць слівы. Закрыць слоікі і паставіць на захоўванне.

4-гадовая браслаўчанка Аліна СЕЛЯХ на хатніх арэлях.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

Якія тлушчы нам патрэбны

Апошнім часам усе пішуць пра карысць раслінных тлушчаў. Складваецца ўражанне, што жывёльныя тлушчы ўвогуле лепш не ўжываць. Напрыклад, зразумела, што ад сметанковага масла можна моцна папраўвіцца, аднак адмаўляцца ад яго зусім не варта.

Сметанковае масла, без сумнення, вельмі каларыйны прадукт. Пры гэтым натуральнае масла вельмі багатае па сваім складзе. Яно змяшчае 150 розных тлушчавых кіслот, у тым ліку 20 незаменных -- наўрад ці які-небудзь іншы тлушч параўнаецца з ім. Тлустыя кіслоты сметанковага масла карысныя для здароўя. У прыватнасці, малочны тлушч садзейнічае засваенню кальцыю. А, як вядома, пры недахопе кальцыю павышаецца халестэрын і трыгліцэрыды крыві. Акрамя таго, у сметанковым масле, вяршках, смятане ёсць вельмі важныя вітаміны А і Д, Е і К, якія цяжка атрымаць у дастатковай колькасці, калі адмовіцца ад малочнага тлушчу.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

У меню сасіскі

Маючы ў халадзільніку кілаграм сасісак, можна закаціць сапраўдны пір. Атрымаецца смачна, незвычайна і, што немалаважна, эканомна.

ГУСТЫ СУП

3 сасіскі, 1/3 шк. рысу, 2—3 морквіны, 1 цыбуліна, пятрушка, зялёная цыбуля, чорны молаты перац, соль.

Парэжце сасіскі, заліце 1,5 л вады. Калі вада закіпіць, дадайце рыс, гатуйце 10 хвілін. Пасаліце. Здрабніце цыбуліну, а моркву і зялёную цыбулю буйна парэжце, пакладзіце ў суп, паварыце яшчэ 10—15 хвілін. Калі суп зварыцца, зніміце яго з агню, дадайце пасечаную пятрушку, паперчыце, дайце настояцца.



РАГАЛІКІ З САСІСКАМІ

450 г слоенага цеста, 20 шт. сасісак, 1 яйка, 30 г цвёрдага сыру, алей.

Тонка раскачайце цеста. Улічыце, што слоенае цеста трэба раскачваць толькі ў адным кірунку, інакш у духоўцы яно не падымецца. Разрэжце пласт на кавалачкі ў форме наканечнікаў стралы. У цэнтр кожнага пакладзіце сасіску, шчыльна закруціце яе ў цеста. Узбіце відэльцам яйка і буйна натаркуйце сыр. Рагалікі вылажыце на прамасленую бляху на адлегласці 1,5—2 см адзін ад аднаго. Змажце іх узбітым яйкам і пастаўце ў духоўку на 20 хвілін. За 5—7 хвілін да гатоўнасці пасыпце сырам.

ІДЭЯ ГАСПАДЫНІ

Каб адысці ад банальнасцяў і здзівіць сям'ю, звычайную макарону з сасіскамі можна падаць зусім не стандартна. Адварыце макарону, парэжце маленькімі кубікамі сасіскі ці любыя каўбаскі, абсмажце іх да залацістага колеру. Дробна натаркуйце сыр. Змяшайце макарону з абсмажанымі сасіскамі і сырам. Пакладзіце ў крыху прамасленыя формачкі ці проста на патэльню, запячыце ў духоўцы. Для вастрыні можна дадаць часнок.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Правярайце пазваночнік

Часта чалавек можа пакутаваць ад задышкі, галавакружэння, паколванняў у вобласці грудзей, павышанага ціску і іншых сімптомаў захворвання сардэчна-сасудзістай сістэмы, тады як насамрэч прычына гэтых немачаў хаваецца ў... пазваночніку. Дакладней, у зашчамленні сегментаў груднога аддзела. З-за пашкоджання косна-мышачнай структуры пазваночніка змяняецца схема і рытмічнасць цыркуляцыі крыві, а гэта негатыўна адбіваецца на рабоце сэрца і сасудаў.

-2605-

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

З каменем на шыі

Літатэрапеўты (літатэрапія — лячэнне камянямі) упэўненыя, што вібрацыі каменя амаль ідэнтычныя вібрацыям чалавека і могуць аптымізаваць энергетычныя патокі ў арганізме. Вось як дзейнічаюць некаторыя камяні з тых, што мы носім на шыі ў выглядзе пацерак і кулонаў.

Аквамарын. Знімае метэазалежнасць, дапамагае пры захворваннях дыхальных шляхоў, праясняе ўсведамленне.

Ізумруд. Вельмі карысны для вачэй, паляпшае зрок. Дапамагае пры бяссонніцы, ліхаманкавых станах, эпілепсіі.

Лазурыт. Паніжае тэмпературу цела, абараняе сэрца і ныркі, заспакойвае.

Малахіт. Дапамагае пры прастудах і алергіі, дабратворна ўплывае на скуру, дзейнічае як агульнаўмацавальны сродак.

Ружовы кварц. Дапамагае пры галаўным болі і псіхасаматычных захворваннях, павышае эмацыянальнасць.

Рубін. Рэкамендуецца пры галаўных болях, ачышчае кроў і ўмацоўвае сэрца, дабратворна ўплывае на псіхіку.

Тапаз. Абараняе імунную сістэму, умацоўвае нервы, садзейнічае эмацыянальнай ураўнаважанасці.

Бурштын. Стымулюе абменныя працэсы. Прыносіць карысць пры хваробах горла, шчытападобнай залозы, печані, нырак, суставаў, дапамагае пры інфекцыях.

ВЯСКОВАМУ ГАСПАДАРУ

Здрабняльнік кармоў

Змайстраваць просты здрабняльнік кармоў можна са старой пральнай машыны.

Спачатку трэба разабраць актыватарны вузел. Карбалітавы актыватар разбіце малатком, а на яго стальную аснову прыварыце нож-здрабняльнік з нержавеючай сталі, выраблены з пласціны 25х2 мм. Канцы яе крыху загніце (мал. 1). Па цэнтры днішча машыны прасвідруйце новую адтуліну дыяметрам 24 мм пад актыватарны вузел, а старую заглушыце драўляным коркам. Вал нажа-здрабняльніка і вал электрарухавіка злучыце муфтай з кавалка кісланіроднага шланга (мал. 2) і прымацуйце з дапамогай двух вінтоў М4 праз адтуліны на валах.

Установіце электрарухавік рэгулюецца падкладваннем шайбаў на шпількі мацавання матора (мал. 3). Абароты рухавіка можна павялічыць да 2000 у хвіліну. Такому здрабняльніку пад сілу любая трава, караняплоды, гарбузы, капуста, хваёвыя галінкі.

Аднак трэба памятаць, што агрэгат патрабуе старанна выконвання тэхнікі бяспекі. У час работы машыны нельга знімаць накрыўку. Сачыце і за спраўнасцю электрапроводу.

Мал. 1 Мал. 2 Мал. 3

-2606-

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.15	18.41	11.26
Віцебск —	7.05	18.30	11.25
Магілёў —	7.05	18.31	11.26
Гомель —	7.01	18.29	11.28
Брэст —	7.30	18.56	11.26
Гродна —	7.29	18.58	11.29

Месяц

Поўня 4 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Алега, Аляксандра, Міхаіла, Фёдара.*

К. *Тэрэзы, Герарда, Юзафа, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



...у суседзяў

ВАРШАВА	+13..+15°С	КІЕЎ	+15..+17°С	РЫГА	+18..+12°С
ВІЛЬНЮС	+18..+12°С	МАСКВА	+9..+11°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+5..+7°С

3 кастрычніка

Дзве даты

1523 год — у Кракаве ў друкарні Вієтора на лацінскай мове выйшаў зборнік беларускага паэта-гуманіста і асветніка эпохі Адраджэння Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Зборнік складаўся з празаічнага прысвячэння каралеве Боне Сфорца, аднайменнай паэмы і 11 вершаў.

1990 год — завяршыўся працэс аб'яднання Усходняй і Заходняй Германіі.

Цытата дня:

«Дружба — самае неабходнае для жыцця, бо ніхто не пажадае сабе жыцця без сяброў, нават калі б ён меў усе астатнія даброты і багацце».

Арыстоцель (384—322 да н.э.), старажытнагрэчаскі філосаф.

«ДЗЕЎКА БЕЗ КАСЫ НЕ МАЕ КРАСЫ»

Такое рытуальнае дзеянне, як распусканне касы перад вяселлем, або «завіванне нявесты», уяўляла сабой пачатковую ступень яе змены: валасы прыбіралі ў новую прычоску, ужо не па-дзявочаму, а па-жаночаму (на галаве рабілі роўны прабор, каб адну касу падзяліць на дзве). І толькі вянок сімвалізаваў яе дзявоцкасць. На вяселлі вянок зменіцца жаночым галаўным уборам. Паглядзець, як «завівалі нявесту» прыходзілі ўсе жыхары вёскі, асабліва жаночая яе палавіна.

● Усе абрадавыя дзеянні заканчваліся апоўначы, нявеста і сяброўкі клаліся спаць у адным пакоі, каб раніцай, калі ўстане сонейка, працягнуць вясельныя прыгатаванні. Да тае пары, пакуль нявесту не возьме пад руку жаніх, яе нельга было пакідаць адну.

● На Беларусі абрад развітання з дзявочым жыццём асабліва яскрава прадстаўлены на поўначы. На Магілёўшчыне такі абрад практычна адсутнічаў. На Палессі нявеста развіталася з сяброўкамі так: рыхтавала напярэдадні вяселля рытуальнае частаванне, а раніцай, перад тым, як ехаць да жаніха, танчыла з кожнай сяброўкай. У некаторых рэгіёнах развітанне нявесты з дзявочым жыццём адбывалася на самім вяселлі — перад ад'ездам нявесты з бацькоўскай хаты.

● Такое развітанне дасягала сваёй кульмінацыі ў той момант, калі нявеста з жаніхом ехалі пад вянец. У гэты час спявалі песні аб развітанні з родным домам.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дарагіх маладых Алену КУПРЫК і Дзмітрыя ПЯТРОВА з Мінска сардэчна віншуем са шлюбам! Ад усёй душы зычым сямейнага дабрабыту, моцнага здароўя, згоды і дзетак!

Жадаем на жыццёвым шляху
Бяды не мець і слёз не ведаць,
Жыццё любіць, у мары верыць.

Вашы родныя і сябры.

Усміхнемся!

— Вой, Марыначка, вы такая загарэлая! У печцы заснулі?

☺

Калі мы на паляванні згубілі штопар, то некалькі дзён жылі толькі на вадзе і ежы.

☺

— Дарагая, хацеў табе да свята купіць патэльню, але ўспомніў — халодную зброю не дораць!

☺

У краму па продажы сотавых тэлефонаў заходзіць мужчына. Яму пачынаюць прапаноўваць розныя варыянты:

— А вось у гэтай мадэлі можна наладзіць званок у залежнасці ад таго, дзе вы знаходзіцеся: «без гуку», «на сходзе», «у пакоі», «на вуліцы»...

— А «ў цэху Мінскага трактарнага» часам няма?

Кожны мужчына хоча ведаць, дзе ляжыць другая шкарпэтка.

☺

Дзве сяброўкі.

— Ты навошта мужа дома аднаго пакінула? Ён жа будзе піва піць цэлымі днямі, сяброў вадзіць!

— Ды я хачу халадзільнік размарозіць, трэба ж, каб хто-небудзь усё пад'еў...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5429. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12